Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 12 (2903)
24 сакавіка 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

ПЕСНІ РОДНАГА КРАЮ

Шчодрая наша зямля на таленты. Паўсюдна, у кожным калгасе і саўгасе, у кожнай вёсцы ёсць самабытныя народныя майстры, адмысловыя музыкі, галасістыя спевакі і спрытныя танцоры. Народная творчасць, развіццё якой падтрымліваецца і заахвочваецца дзяржавай, дасягнула ў нашы дні высокага росквіту.

Ужо некалькі гадоў выступае на Брэстчыне самадзейны калектыў з вёскі Дзмітравічы (саўгас імя Дзімітрава) Камянецкага раёна. Асаблівым поспехам карыстаецца саўгасны фальклорна-этнаграфічны ансамбль. На конкурсе фальклорна-этнаграфічных ансамбляў раёна «Песні роднага краю», які праходзіў нядаўна ў Камянцы, дзмітраўскія самадзейныя артысты былі прызнаны лепшымі. Зараз калектыў рыхтуецца да зональнага конкурсу, які адбудзецца ў Кобрыне.

Умела вядзе рэй вечарніц «гаспадыня» Аляксандра Грачанік, вясёлага старога выконвае кінамеханік Міхаіл Мушыц. Узначальвае сельскую самадзейнасць дырэктар СДК Ларыса Мардас, мастацкі кіраўнік — Ганна Кныш.

Фота А. ГЛІНСКАГА.

ПОСТУП ТЫДНЯ

ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

За шматгадовую плённую дзейнасць, вялікі ўклад у развіццё сроднаў масавай інфармацыі і прапаганды Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў ганаровае званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР журналістам рэспублікі:

АБАДОУСКАМУ Паўлу Сцяпанавічу — загадчыку аддзела пісем і масавай работы «Настаўніцкай газеты».

АГАФОНАВУ Фёдару Іванавічу — уласнаму карэспандэнту газеты «Советская Белоруссия» па Віцебскай вобласці.

ДУБІНСКАМУ Давіду Аркадзьевічу — галоўнаму рэдактару галоўнай рэдакцыі эканомікі прамысловасці Беларускага тэлебачання.

КУКАРЭКУ Аркадзю Фёдаравічу — загадчыку аддзела эканомікі сельскай гаспадаркі газеты «Звязда».

САСНОУСКАМУ Браніславу Уладзіміравічу—рэдактару лагойскай раённай газеты «Ленінскі сцяг».

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

АДЗІНСТВА САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ

У калектывах працоўных працягваецца гарачае зацікаўленае абмеркаванне праекта Канстытуцыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Карэспандэнт штотыднёвіка звярнуўся да сакратара партыйнай арганізацыі СП БССР пісьменніка Мікалая Кругавых і папрасіў яго падзяліцца сваімі думкамі наконт гэтай падзеі.

— Ва ўступе да праекта Канстытуцыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі запісана: «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — раўнапраўная рэспубліка ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які ўвасабляе дзяржаўнае адзінства савецкага народа, згуртоўвае ўсе нацыі і народнасці для сумеснага будаўніцтва камунізму».

Дзяржаўнае адзінства савецкага народа!.. Як гэта верна і справядліва!

Здаўна вялося на Ціхім Доне: ідучы на вайну, браў казак вашытую ў скураны мяшэчак жменю роднай зямлі, і калі суджана было памерці яму на чужыне, таварышы, хаваючы яго, клалі яму на грудзі гэты мяшэчак — як апошняе вітанне ад родных палёў, як апошняе вітанне ад Айчыны.

У 1943-м і мне давялося ісці на вайну разам з тысячамі маіх таварышаў. Многія з іх загінулі смерцю герояў пад Чавусамі і Слаўгарадам, пад Крычавам і Гомелем, і нам і ў галаву не прыходзіла класці ім на грудзі тыя мяшэчкі: зямля Беларусі ўзяла маіх таварышаў у сваё лона, як родных сыноў.

Яна, зямля Беларусі, была роднай зямлёй для ўсіх, хто прыйшоў вызваліць яе ад гітлераўскіх захопнікаў, таму што ўсе мы жылі па адзіных законах Канстытуцыі Савецкай дзяржавы.

Далёка пайшла наша краіна за гады Савецкай улады, увайшоўшы ў эпоху развітога сацыялізму. Дасягнутыя поспехі і задачы на будучыню абумовілі стварэнне новай Канстытуцыі, новага Асноўнага Закона, прытрымліваючыся якога савецкі народ, у тым ліку і народ Беларусі, дасягне небывалых вяршынь у матэрыяльным і культурным развіцці.

Усім сэрцам прымаю праект новай Канстытуцыі Беларусі — адной з пятнаццаці сясцёр савецкіх рэспублік, якія ідуць да пабудовы самага справядлівага грамадства на зямлі — камунізму.

ПІСЬМЕННІЦКІЯ СУСТРЭЧЫ

Студэнты Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Горкага запрасілі да сябе на сустрэчу Паўла Місько. Адбылася ажыўленая і добразычлівая гаворка пра творчасць празаіка, асабліва пра яго раман «Мора Герадота». На сустрэчы, акрамя студэнтаў, выступілі Антон Семяновіч, Фёдар Янкоўскі і Алег Лойка. Вёў сустрэчу кандыдат філалагічных навук Мікола Мішчанчук. Кароткія апавяданні і ўрыўкі з твораў П. Місько прачыталі артысты-аматары з літаратурнага тэатра «Жывое слова».

●

У чытальнай зале Дома настаўніка адбылася чытацкая канферэнцыя па аповесцях «Першае каханне», «Сцюжа» і «Травінка і камень» Аркадзя Марціновіча. Уступным словам адкрыў канферэнцыю Генрых Далідовіч. Цёпла і шчыра аб творчасці А. Марціновіча гаварылі выкладчыца беларускай мовы і літаратуры СШ № 123 Г. Курачкіна, настаўніца-пенсіянерка З. Пуздырава, супрацоўнікі Дома настаўніка А. Раманоўская і В. Застроўская, пісьменнік Алесь Савіцкі. Вынікі канферэнцыі падвёў крытык Міхась Мушынскі. Вяла канферэнцыю супрацоўніца Рэспубліканскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў Л. Лабус. Урыўкі з твораў А. Марціновіча прачыталі народная артыстка БССР М. Захарэвіч і дыктар Беларускага радыё М. Чырык. На канферэнцыі выступіў аўтар.

ПРЭМ'ЕРЫ

Калектыў Гомельскага абласнога драматычнага тэатра паказаў гледачам новую работу: спектакль «Вясновы дзень, трыццатага красавіка» па п'есе А. Зака і І. Кузняцова.

Цікавыя вобразы стварылі ў спектаклі артысты Т. Скарута, У. Карака, А. Каменскі, У. Драбышэўскі, С. Каменскі, А. Бычкоў, Г. Анчышкіна, Я. Натапаў, В. Азярцоў і інш. Ажыццявіў пастаноўку галоўны рэжысёр тэатра В. Кручкоў, мастацкае і музычнае афармленне выканана пад кіраўніцтвам А. Кляўзера і Г. Гофмана.

Фота У. ТКАЧЭНКІ.

МАЦАВАЦЬ ТВОРЧЫЯ СУВЯЗІ

У Доме літаратара 21 сакавіка адбыўся адкрыты партыйны сход СП БССР, на якім з дакладам выступіў міністр унутраных спраў Беларусі генерал-лейтэнант А. А. Клімаўской. Ён пазнаёміў прысутных з работай органаў міліцыі, расказаў аб тых задачах і праблемах, якія стаяць перад імі, падзяліўся думкамі аб ролі літаратуры ў выхаваўчых працэсах.

— Есць у беларускай літаратуры добрыя творы пра вайну, пра сённяшні дзень. А вось пра самаадданую і сапраўды гераічную службу нашай міліцыі — амаль што няма, няма глыбокага высокамастацкага беларускага дэтэктыва, — сказаў у сваім выступленні першы сакратар праўлення СП БССР Іван Шамякін.

Гэтую думку падтрымалі Аляксандр Міронаў, Мікола Гамолка, Васіль Хомчанка, Уладзімір Шыцік, Анатоль Шаўня, Іван Грамовіч, Мікалай Вінагораў.

Пісьменнікі выказаліся за больш частыя і цесныя кантакты з органамі МУС, за больш глыбокае вывучэнне жыцця і спецыфікі работы міліцыі, каб з веданнем справы пісаць аб людзях гэтай адказнай і мужнай прафесіі.

СЦЭНА МІЛЬЁНАЎ

У нашай рэспубліцы звыш паўмільёна рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі аддаюць вольны час аматарскай сцэне. Яны аб'яднаны ў 36 тысяч самадзейных калектываў, 253 з якіх носяць ганаровае званне народных.

Вялікае месца займае драматычнае самадзейнае мастацтва. Па добрай традыцыі ў яго развіцці і ўдасканаленні актыўна ўдзельнічаюць майстры прафесійнай сцэны.

Добры прыклад у гэтым паказвае Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа. На яго базе рэгулярна праходзяць шматдзённыя семінары рэжысёраў народных тэатраў і вядучых сельскіх драмкалектываў Віцебшчыны. За кожным з іх замацаваны спрактыкаваны, вопытны шэф — вядучы акцёр, рэжысёр, мастак. Устаноўлены адзіны кансультацыйны дзень — панядзелак. Акрамя таго, тэатр адкрывае ў сябе творчую лабараторыю для рэжысёраў самадзейных калектываў.

Гэтыя прыклады былі прыведзены на IV пленуме Беларускага тэатральнага аб'яднання, які абмеркаваў праблемы далейшага развіцця народнай мастацкай творчасці. Яго ўдзельнікі гаварылі аб велізарнай ролі мастацтва, у тым ліку і самадзейнага, у ідэйна-палітычным, маральным і эстэтычным выхаванні працоўных, аб неабходнасці пашыраць і ўдасканальваць формы ўзаемадзеяння прафесійных і самадзейных калектываў. Падкрэслівалася асаблівая важнасць шэфства дзеячаў мастацтва над аматарскімі калектывамі ў сувязі з падрыхтоўкай да 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

(Справаздача з пленума будзе апублікавана).

СВЯТА КНІГІ

Свята кнігі, якое нядаўна было праведзена таварыствам кнігалюбаў г. п. Крупкі, прыцягнула ўвагу многіх жыхароў раёна. З цікавасцю праслухалі крупчане расказ адказнага сакратара па лекцыйнай прапагандзе абласнога таварыства кнігалюбаў М. Розума аб паэзіі ваенных гадоў, аб творчасці Вольгі Бергольц, Веры Інбер, Аляксея Суркова, Канстанціна Сіманава, Юліі Друнінай, якія ў суровыя гады вайны сваімі палымяннымі радкамі заклікалі савецкіх людзей змагацца з фашызмам.

Цёпла прынялі ўдзельнікі свята выступленні Яўгеніі Янішчыц, Івана Шуцько, членаў літаб'яднання пры рэдакцыі райгазеты «Ленінскім курсам».

У заключэнне перад крупчанамі выступілі ўдзельнікі літаратурна - музычнай брыгады «Ліра» Мінскага абвыканкома.

М. КРЭМЕНЬ.

Як паведамлялася ўжо, разгледжаны вынікі творчай дзейнасці і выканання планаў і названы пераможцы Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва тэатральна-відовішчных устаноў краіны. Пераходны Чырвоны сцяг і першую прэмію Міністэрства культуры СССР і ЦК прафсаюза работнікаў культуры сярод іншых калектываў прысуджаны Вялікаму тэатру оперы і балета БССР.

На здымку: намеснік міністра культуры СССР К. В. ВАРАНЦОЎ уручае пераходны Чырвоны сцяг прадстаўнікам калектыву Вялікага тэатра оперы і балета.

Фота У. КРУКА.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За плённую літаратурную дзейнасць і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння пісьменнік ПРАНУЗА Павел Кузьміч узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

СУСТРЭЧА З АЎТАРАМІ КНІГІ-ПОМНІКА

У Беларускім навукова-даследчым інстытуце земляробства адбылася канферэнцыя чытачоў, на якую былі запрошаны пісьменні—аўтары кнігі «Я з вогненнай вёскі...»—Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік, а таксама кінарэжысёр-дакументаліст, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Віктар Дашук і старэйшы беларускі журналіст Якаў Міско.

Спачатку ў перапоўненай канферэнц-зале былі паказаны дакументальныя фільмы ў пастаноўцы В. Дашука — «Жанчына з забітай вёскі», «Жменя пяску», «Немы крык» і «Суд памяці».

Потым цёпла і сардэчна гасцей вітаў дырэктар інстытута земляробства В. Самсонаў.

Пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў расказаў Я. Міско.

З вялікай увагай слухалі прысутныя лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР і літаратурнай прэміі Якуба Коласа Янку Брыля, які расказаў пра тое, як стваралася кніга «Я з вогненнай вёскі...». Пра сакружнасць пісьменнікаў у галіне дакументальнай літаратуры гаварыў Уладзімір Калеснік. Кінарэжысёр Віктар Дашук расказаў аб здымках фільма па гэтай кнізе, пра свае творчыя задумы. Алесь Адамовіч падзяліўся сваімі творчымі планамі, гаварыў аб праблемах дакументальнай прозы і шляхах развіцця дакументальнага жанру ў літаратуры.

Актыўны ўдзел у абмеркаванні кнігі-помніка прынялі супрацоўнікі інстытута.

А. КОРЗУН.

ДАЛУЧЭННЕ ДА ПРЫГОЖАГА

Тым днём глядзельную залу рэспубліканскага Дома кіно запоўнілі выкладчыкі Беларускага політэхнічнага інстытута. Яны прыйшлі на творчую сустрэчу з заслужаным дзеячам мастацтваў БССР кінарэжысёрам Віктарам Туравым.

Аб творчасці гэтага майстра кіно расказаў кандыдат мастацтвазнаўства Анатоль Красінскі. Потым выступіў В. Тураў. У заключэнне быў паказаны пастаўлены ім фільм «Я родам з дзяцінства».

ПЕРШЫЯ Ў ЖЫЦЦІ ВОПЛЕСКІ

Для юных музыкантаў выступленне са сцэны—як свята. І нічога, што ў зале ўсе «свае»: бацькі, сябры па школе, педагогі. Выступленне вельмі адказнае і апладысменты самыя сапраўдныя.

Такі ўсхвалявана-радасны настрой панаваў і на канцэрце, які адбыўся ў зале Мінскай дзіцячай музычнай школы № 2 імя Аладава. Маленькія піяністы пазнаёмілі слухачоў з творамі сучасных ленінградскіх кампазітараў.

Чароўны ансамбль Ж. Металідзі «Чамучка» выканалі ў 4 рукі вучні 2-га класа Сяргея Бялоў і Вера Аляксеева. Цікава прагучалі п'есы з больш сур'ёзным зместам. «Расказ партызана» Я. Вальфензона ў выкананні трэцякласніцы Анжэлы Несцяровіч нагадаў аб суровых днях вайны. П'есу Ю. Карнакова «Роздум» з вялікім характарам сыграла Віта Фядотава (4 клас).

Асаблівае задавальненне атрымалі слухачы ад «назачнай» часткі канцэрта. Было разыграна цэлае музычнае прадстаўленне. Шкада, што падобных твораў вельмі мала ў дзіцячай музыцы!

Удала падабраныя вершы і празаічныя эпіграфы да п'ес дапамаглі як выканаўцам, так і слухачам у разуменні вобразнага зместу твораў. Ажывілі канцэрт расказ вядучага пра Ленінград і ленінградскіх кампазітараў, дэманстрацыя каляровых дыяпазітываў з відамі горада.

В. НЯДЗЕЛЬКА.

Фота А. ДЗІНІНА.

ПОСТУП ТЫДНЯ

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

КАМУ ЎДЗЯЧНА ЗАЛА

27 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА

Ёсць штосьці сімвалічнае ў тым, што Дзень тэатра адзначаецца вясной. Савецкія дзеячы сцэны звычайна ў гэты час падводзяць пэўныя вынікі і ўпаўнена гавораць пра творчыя перспектывы. Карэспандэнт штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» папрасіў расказаць аб тым, як адзначаць сёлетні дзень тэатры рэспублікі, намеснік старшыні прэзідыума праўлення БТА І. Чаркаса.

— На што запрашаюць тэатры рэспублікі сёння? На афішы пазначаны інсцэніроўкі рамана «Подых навальніцы» І. Мележа (Гомель) і аповесці «Міколка-паравоз» М. Лынькова (Рэспубліканскі тэатр юнага гледача), «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага і «Дзядзечкаў сон» паводле Ф. Дастаеўскага (Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), «І змоўклі птушкі» І. Шамякіна (Брэст і Бабруйск), «Укралі кодэкс» А. Петрашкевіча і «Летась у Чулімску» А. Вампілава (Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа), «Вяртанне ў Хатынь» паводле А. Адамовіча і «Лазня» У. Маякоўскага (Рускі тэатр БССР імя М. Горкага)... Нават гэты — далёка не поўны — пералік рэпертуарных спектакляў сведчыць пра многае. Класіка і сучаснасць, арыгінальная драматургія і інсцэніраваныя эпічныя творы, высокая трагедыя і сатыра — якая тэматычная і жанравая шырыня!

Спектаклі іграюцца ўвечары. А што робіцца ў тэатрах у дзённыя гадзіны?

Купалаўцы рэпеціруюць п'есу «Чалавек з легенды» І. Ражкова і Я. Шабана. Правафлангавы беларускага савецкага сцэнічнага мастацтва, тэатр, які носіць імя народнага песняра Беларусі, у другі раз робіць спробу паказаць непаўторны характар змагара за камуністычныя ідэалы, мужнага воіна і няўрымслівага арганізатара — Кірылы Арлоўскага. Упершыню гэта было, калі купалаўцы ставілі драму «Каб людзі не журыліся» А. Макаёнка, прататыпам галоўнага героя якой быў славуты старшыня калгаса «Рассвет».

«Блакітны экспрэс» — спектакль Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, прысвечаны камсамольскаму юнацтву 70-х гадоў. Юныя героі—нашы сучаснікі — выходзяць на сцэну са сваёй працоўнай справаздачай блізкаму юбілею Ленінскага камсамола, 60-годдзю Камуністычнага Саюза Моладзі Краіны Саветаў.

Паэтычны расказ пра пакаленне маладых будаўнікоў сацыялізму «Добраахвотнікі» паводле вядомага твора Я. Далматоўскага рыхтуе Рускі тэатр БССР імя М. Горкага. Калектыў не ўпершыню робіць сцэнічны «пераклад» твора, які меў поспех у іншым відзе мастацтва, і спадзяецца, што яго спектакль па-свойму раскрые характары, знаёмыя гледачам па аднайменнаму фільму.

Маладыя прадстаўнікі сённяшняга рабочага класа—героі п'есы «Пераправа» Л. Караічава, якую ставіць Гомельскі абласны драматычны тэатр.

З глыбінь вякоў, з гераічнага мінулага вяртаюць у наш час герояў п'ес «Напісанае застаецца» А. Петрашкевіча і «Кастусь Каліноўскі» У. Караткевіча. Першая з іх прысвечана Георгію (Францыску) Скарыне і прызначана для пастаноўкі на купалаўскай сцэне, другую ставіць Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа.

Зноў звяртае на сябе ўвагу тэматычная разнастайнасць і жанравае багацце навінак бучага сезона, які прысвячаецца 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Арыентуючыся на гэтую знамянальную ў гісторыі народа дату, святкуюць сёлета Міжнародны дзень тэатра работнікі мастацтваў нашай рэспублікі. На прадпрыемствах і ў сельскіх клубах, у інстытутах і ўстановах адбываюцца лекцыі і гутаркі пра дасягненні савецкай тэатральнай культуры. Тэатры запрашаюць да сябе рабочыя калектывы, з якімі падтрымліваюць творчыя сувязі, каб пазнаёміць іх з новымі спектаклямі, разам абмеркаваць прэм'еры. У такіх кантактах рэжысура і акцёры назапашваюць каштоўны вопыт, які часта бывае неабходны пры стварэнні вобразаў сучаснікаў. Гродзенцы цяпер паказваюць спектакль «Мае Надзеі», героямі якога з'яўляюцца работніцы тэкстыльнай прамысловасці, і шмат якія персанажы і сцэнічныя адкрыцці знойдзены выканаўцамі дзякуючы сталай дружбе тэатра з калектывам Гродзенскага тонкасуконнага камбіната. Адзначаны на Усесаюзным конкурсе «Карчагінцы-77» спектакль «Наследнік» у Брэсцкім абласным тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі ствараўся пад наглядам шэфаў — перадавікоў сельскай гаспадаркі вобласці. Артысты Рэспубліканскага тэатра юнага гледача традыцыйна ў летні час едуць па маршрутах, якія супадаюць з маршрутамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў, і ў «Блакітным экспрэсе» знойдуць адбітак іх непасрэдныя жыццёвыя назіранні.

Галоўны момант у святкаванні Міжнароднага дня тэатра сёлета — цікавасць работнікаў сцэны і гледачоў да надзённай тэматыкі, да чалавечай асобы нашага часу. Ёй вызначаюцца планы далейшай работы, ёй дыктуюцца і творчыя справаздачы перад грамадскасцю, якія даюць у канцы першага вясновага месяца дзеячы тэатраў рэспублікі.

На здымку: сцэна з новага спектакля коласаўцаў «Летась у Чулімску» па п'есе А. Вампілава, перакладзенай на беларускую мову Г. Бураўкіным, у пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра В. Мазынскага. Народны артыст СССР Ф. Шманаў і актрыса Л. Ліхачова ў ролях Фёдара Памігалава і Валянціны.

Фота С. КОХАНА.

ДОЎГАЕ ЖЫЦЦЁ СПЕКТАКЛЯ

Моладзь горада Брэста, воіны гарнізона сардэчна павіншавалі калектыў абласнога тэатра з памятным юбілеем: споўнілася чвэрць стагоддзя спектаклю «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча. Гэты твор стаў яркай старонкай у творчай біяграфіі калектыву. Такое доўгае сцэнічнае жыццё яму забяспечылі ўвасобленыя ў ім высокія ідэі патрыятызму, самаадданага служэння чалавека сваёй Сацыялістычнай Айчыне.

Днямі гледачы ўбачылі трэці сцэнічны варыянт п'есы. Па меры таго, як станавіліся вядомымі новыя факты гераічнага подзвігу неўміручага гарнізона, адкрываліся новыя старонкі эпапеі, аўтар сумесна з работнікамі тэатра ўдасканальваў спектакль, імкнучыся найбольш поўна і гістарычна дакладна паказаць вытокі масавага подзвігу байцоў, жонак камандзіраў, юных абаронцаў цытадэлі. Палымяны гераізм, якім напоўнены спектакль, вызначыў яго жыццёвасць, тую цікавасць, што не праходзіць з гадамі.

ЗАВОДСКІ ЛЕКТАР

Працоўнае жыццё Ганны Бортнік пачалося ў васемнаццаць гадоў, калі яна ўпершыню пераступіла парог аўтаматнага цэха Мінскага мотавелазавода. Сціплую, спагадлівую дзяўчыну палюбілі ў калектыве. У вольны ад работы час яна расказвала таварышам аб прачытаных творах беларускіх пісьменнікаў, арганізоўвала ў цэху сустрэчы з літаратарамі. Часта з сябрамі наведвала літаратурныя музеі Янкі Купалы і Якуба Коласа, беларускія тэатры.

Неяк Ганну Сяргееўну запрасілі на пасяджэнне пярвічнай заводскай арганізацыі таварыства «Веды» і даручылі выступіць з лекцыяй.

Нялёгкая гэта справа — несці ў масы жывое слова. Патрэбна ўмець зацікавіць слухачоў, звязаўшы тэму выступленняў з сённяшнім днём, з тым, што блізка і зразумела кожнаму чалавеку. А Ганне Сяргееўне ёсць што сказаць. Вось ужо дваццаць пяць гадоў працуе яна на заводзе. За самаадданую працу і актыўны ўдзел у грамадскай рабоце ўдастоена высокіх урадавых узнагарод — ордэна Леніна і ордэна Працоўнай Славы III ступені. Узнагароджана Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, граматамі гарадскіх арганізацый. Г. С. Бортнік — член Рэвізійнай камісіі ЦК КП Беларусі.

Ёсць што сказаць лектару. І ўсё роўна кожны раз, рыхтуючыся да выступлення, Ганна Сяргееўна гадзінамі праседжвае ў бібліятэцы, перачытвае і праглядае матэрыялы.

Так было і на гэты раз, калі яе папрасілі прынядь удзел у арганізаваным пры кінатэатры «Ракета» лекторыі «Ідзём дарогай Леніна, дарогай Кастрычніка». Спасылаючыся на прыклады з жыцця калектыву прадпрыемства, лектар расказала прысутным, як ажыццяўляюцца гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС, дэлегатам якога яна была, ідэі Леніна, палажэнні новай Канстытуцыі СССР, як шматтысячны калектыў завода паспяхова спраўляецца з выкананнем трэцяга года дзесятай пяцігодкі.

Актыўны ўдзел Г. С. Бортнік прымае ў рабоце лекторыя «Выбар прафесіі — справа сур'ёзная», арганізаванага пры кінатэатры «Ракета» для старшакласнікаў Ленінскага раёна. Бортнік не абмяжоўваецца толькі вуснымі выступленнямі, яна арганізавала экскурсіі дзяцей у цэх завода, дзе яны сустрэліся з майстрамі, спецыялістамі завода.

Больш чым 100 работнікаў мотавелазавода вядуць лекцыйную работу, імкнуцца данесці жывое слова партыі да кожнага слухача. Сярод іх і ветэран завода, наватар вытворчасці камуніст Ганна Сяргееўна Бортнік.

Л. ФРЫД.

ГУЧАЦЬ РАДКІ КУПАЛЫ

Калектыў супрацоўнікаў Літаратурнага музея Я. Купалы, рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага песняра, правёў у фінансава-эканамічным тэхнікуме вечар паэзіі Я. Купалы.

Слова пра паэта сказалі беларускія літаратары П. Макаль, М. Аўрамчык, А. Кучар, А. Кулакоўскі, загадчыца масавага аддзела музея М. Чабатарэвіч.

Вечар выклікаў вялікую цікавасць у навучэнцаў тэхнікума.

А. АЛЕШКА.

ЖУРНАЛІСТЫ Ў ГАСЦЯХ У АРТЫСТАЎ

Паказам урыўкаў са спектакляў «Вяртанне ў Хатынь», «Трохграшовая опера», «Час пік», «Энергічныя людзі», «Макбет» пачалася гэта творчая сустрэча журналістаў Мінска з вядучымі майстрамі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, якая адбылася днямі ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў.

Аб рабоце тэатра на сучасным этапе, пошуках новых тэм, новых прыёмаў больш глыбокага раскрыцця сцэнічных вобразаў, аб раскрыцці праблем сучаснасці на падмостках сцэны, планах на будучае расказаў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР галоўны рэжысёр тэатра Барыс Луцэнка.

У сустрэчы прынялі ўдзел народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі, народны артыст БССР Юрый Сідараў, заслужаная артыстка БССР Валянціна Краўчанка, артысты Наталля Чамадурава, Вольга Клебановіч, Леанід Крук, Аляксандр Ткачонак, Андрэй Кармунін, Барыс Падва.

Вяла вечар мастацтвазнаўца Ефрасіння Бондарава.

У ГОМЕЛЬСКІМ АДДЗЯЛЕННІ СП БССР

Адбыўся справаздачна-выбарчы сход Гомельскага аддзялення СП БССР. З дакладам аб рабоце аддзялення выступіў Іван Сяркоў. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: Мікола Грынчык, Сяргей Масіяш, Мікола Луфераў, Віктар Ярац.

Сакратаром аддзялення выбраны І. Сяркоў.

У рабоце сходу прынялі ўдзел сакратар праўлення СП БССР В. Сачанка, інструктар ЦК КПБ А. Майсеенка.

СЛОВА ПРА БРАНІСЛАВА ТАРАШКЕВІЧА

Польская пісьменніца Аляксандра Вергман не раз змяшчала ў польскіх часопісах, а таксама ў беларускіх Беластоцкіх выданнях — газеце «Ніва» і «Беларускім календары» — нарысы пра беларускага грамадскага і палітычнага дзеяча, філолага, акадэміка АН БССР Браніслава Тарашкевіча.

І вось у канцы леташняга года ў варшаўскім выдавецтве «Кніга і веды» выйшаў ёмісты зборнік А. Вергман «Слова пра Браніслава Тарашкевіча». Кніга багата ілюстравана мала вядомымі і зусім невядомымі ў друку фотаздымкамі.

«БЕЛАРУСКІ КАЛЯНДАР», 1978

Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку выдала беларускі каляндар на 1978 год. У ім адзначаюцца даты гістарычных падзей, юбілейныя дні вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў, вучоных, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў і г. д.

Каляндар мае раздзелы «Народная Польшча і Савецкая Беларусь», «На ніве БГКТ», «Люблю наш край», «З мінулага», «На літаратурным палетку» (мастацкія творы мясцовых пісьменнікаў і пераклады з польскай мовы), «Нашым спевакам» (песні Ю. Семяякі, Р. Буцвілоўскага, Ю. Талесніка на вершы П. Броўкі, Э. Валасевіча, Л. Дайнекі, У. Карызны), «Наша здароўе» і «Ці заўтра будзе дождж?».

У 300-ы РАЗ...

Ёсць сярод п'ес, якія вызначаюць аблічча беларускага тэатра, цудоўныя здабыткі нацыянальнай камедыі. Сапраўды славутыя і неўміручы лёс набылі купалаўская «Паўлінка», «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы, «Несцерка» Віталя Вольскага. Сёння ўпоравень з імі становіцца і зусім маладая з'ява нашай драматургіі—трагікамедыя народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка «Трыбунал». На мінулым тыдні калектыў Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы паказаў па гэтай п'есе трохсоты спектакль.

Васіль ЖУКОВІЧ



ТАМ, НА РАДЗІМЕ

Папараць-кветкі агеньчык гарыць
ноччу на Йвана Купалу,
граюць на скрыпках вятры,
граюць дажджы на цымбалах —
там, на радзіме!

Пройдзешся лесам — не ўсё
і пазнаеш:
хвоі старыя знікаюць, дубы;
маладняку галавой паківаеш
і пашкадуеш: як доўга не быў
ты на радзіме!

Лічыць і лічыць зязюля гады.
Лёс твой тут сонечны, зорны.
Дужым, прыгожым і маладым
бачышся ў люстры азёрным
тут, на радзіме.

БАЛАДА ПРА ХЛЕБАРОБА

І там, дзе жнуць, і там, дзе сеюць,
і дзе збіраюць сена ў стог,
страчаў я дзеда Аляксея —
без працы ён і жыць не мог.

Ён усміхаўся:
— Бог дасць ночку —
і адпачнём мы ўсе як след...
Ды настаяў калгас аднойчы,
каб на курорт паехаў дзед.

Бясконца раіўся ён дома;
казала жонка:
— Едзь, вядома.

Уяўляю будучыню светлай

Казалі ўнукі:
— Дзеду, едзь.
Угаварылі ледзьве-ледзь.

...Дзед Аляксей жыве ля мора,
жыве ля сонейка, лічы,
ад ветру затуляюць горы,
ў сталоўцы добрыя харчы.

Ды штось паціху прападае
і апетыт тут і настрой:
то дзед унукаў прыгадае,
то засумуе па старой.

Так было ўчора, так і сёння —
яму спакою не знайсці:
заныла сэрца у бяссонні,
аж крывяны падскочыў ціск.

Не мора, а лясныя шаты
яму пад ветрыкам шумяць,
і просіць дзед:
— Хачу дахаты,
пусціце, доктар, паміраць...

Яго лячылі дбайна вельмі —
не вылечылі дактары.
І не дабыўшы поўны тэрмін,
вярнуўся ў вёсачку стары.

А дома паляжаў нямнога,
прайшоўся ля высокіх ніў,
паветра удыхнуў ляснога,
з людзьмі крыху пагаманіў —

і палягчэла хлебаробу,
калі на сене дзед паспаў,
і як рукой зняло хваробу,
што ў адпачынку ён прыдбаў.

З ВЫШЫНІ

М. ХАМЯНКОВУ

Матор, драмаць не падахвочвай.
Не спі, мой дружа, ты зірні —
якая чыстая, святочная
зямліца наша — з вышыні.

Хаціны — мілыя малюткі —
стаяць як цацкі,
а ля іх
дарогі — як шнуркі: ні грудкі,
ані разбітай каляі.

І пожняў чыстыя квадраты,
нібы з-пад праса палатно.
Калоссяў, з поля не паднятых,
адгэтуль, дружа, не відно.

Святкуе там бяроза белая,
і свеціць бронзаю сасна.
Тут нават рэчкі памутнелыя
здаюцца светлымі да дна.

І, зачараваны палётам,
ужо гатоў паверыць ты,
што на зямлі прайшлі згрызоты,
пайшлі на пенсію суды;

не існуе агню прыцэльнага,
крыві, і здрады, і хлусні...
Зямля — гармонія суцэльная,
калі паглянуць з вышыні.

БЕЛЫ БАНТ

У Асвенціме,
ў горах валос чалавечых,
банцік белы ляжыць пад шклом.
Ах, нядоўга, відаць,
на дзіцячыя плечкі
апускаўся ён матыльком!

...Едзем з Асвенціма.
Травы ў расе.
Ціха ў машыне, маўчым усе.
Раптам навіны шафёр уключыў;
у космасе — вопыт смелы.
А мне з цішыні музейнай
крычыць,
крычыць з крэматорыя банцік
белы.

Прагноз надвор'я (касі ды сей!):
сонцам сезон багаты.
А мне ўсё бачыцца ў чорнай касе
банцік белы, вайной распяты.

УЯЎЛЯЮ БУДУЧЫНЮ СВЕТЛАЙ

Век змагання, рэвалюцый
быстрых,
ты даеш адвагу мне дзярзнуць.
Я хачу — гадоў хаця б на
трыста —
ў будучыню нашу зазірнуць.

Уяўляю, дальнія планеты
пасябруюць, пацяплее свет.
Аб'яўляцьме конкурсы паэтам
Міжпланетны Зорны Камітэт.

Інстытуты гумару, кахання
будуць светлай явай на зямлі.
Злоснае пагіне ўсё дазвання,
хворае адыдзе, адбаліць.

Чалавек, магутны, мудры, чысты,
утаймуе войны — не хлушу.
І падлікам зоймуцца статысты:
колькі песень легла на душу.

●

Не папракайце, крытыкі, паэтаў,
якія услаўляюць салаўёў.
Не на халтуру выменена лета
і не разлік ў гай начны прывёў.

У голасе, знаёмым дапатопна —
пачуццяў непадробленых зліццё.
Паэт і сам на птахаў тых падобны:
жыццё — як песня,
песня — як жыццё.

●

Я не гарэў трызненнем пра
бяссмерце,
я не хварэў хваробаю такой.
Гляджу на прагу славы, як на
смецце,—
падпальваю бязлітаснай рукой.

Адно калі лістота ападае,
калі з сабою ў думках гавару,
душа міжвольна возьме й
прыгадае:
«Нет, весь я не умру...»

АДКАЗ НА НЕЗВЫЧАЙНАЕ ПЫТАННЕ

Пракурор праз кодэкса артыкул
углядаўся ў кожны мой радок,
нават пальцам асцярожна тыкаў
і ацэньваў: за радок — гадок.

Валянцін ТАЎЛАЙ.

— А колькі плацяць за радок?
Баюся вас не задаволіць:
камусьці — «за радок—гадок»,
плацілі часам і паболей...

Прайшоў суровы час такі,
мой лёс пад яснаю зарою...
Сам у даўгу за ўсе радкі
я перад роднаю зямлёю.

За сцежкі, пройдзеныя мной,
што ўдачы неслі мне, няўдачы.
За росы, фарбы, гукі ёй
навекі буду я ўдзячны.

А чым жа людзям адплаціць?
Жыву з пытаннем, вінаваты:
ці за ўсё добрае ў жыцці
даю высокую я плату.

Алег САЛТУК

●

Я маю права пачынаць
І адкрываць, што не адкрыта,
І словы светлыя шаптаць
Каханай у духмяным жыце,
І ведаць, што яна жыве
І жыць яшчэ бясконца будзе,
Спаць на прывяленай траве,
Пакуль світанак не пабудзіць.
А потым крочыць да сяла
У туманé, нібыта ў дыме,
Туды, дзе рос, яна расла,
І быць шчасліва-маладымі.
Ніколі толькі, ні на міг,
Я забываць не маю права
Пра іх, равеснікаў маіх,
Якія бралі пераправы.
Грудзямі бралі і крывёй —
Не ўсе азораны магілы.
Ім жыць у памяці маёй,
Пакуль стае яе і сілы.
Мне трэба чэсна сёння жыць —
Няхай пачатак уваскрэсне,
А вось забыць усё, закрэсліць —
Пад нож лепш рукі палажыць!

●

Гул будаўнічы не змаўкае —
Расце райцэнтр у вышыню.
Радня ўжо ў гарадку блукае —
Шукаю назіркам радню.
Яна прыехала ад поля,
Ад ціхіх хат, ад русых ніў,
Ёй цяжка выбрацца, ды толькі
Унучак шчыра запрасіў.
Шукаем з сынам. Максі. Міні,
Стракатых колераў разліў.
Насустрач бацька — дзядзька
ў Вільні.
— Здароў так, родныя, былі!
І ручку беленькую ўнучак
У чорную ўтапіў руку.
І стала ў горле так пякуча,
Нібы ад чаркі першаку.

●

Хай паспіць. Не трывожце
дуброву —
Яна сніць салаўіныя сны.
Закаханых пяшчотныя словы
Адгучалі да новай вясны.
Хай паспіць. Яна так парадзела,
Так бярозавым сокам сцякла,
Што з зялёнай зрабілася белай
Ад галінкі малой да ствала.

РЫГОР РАМАНАВІЧ ШЫРМА



Савецкае мастацтва панесла цяжкую страту. 23 сакавіка 1978 года на 87-м годзе жыцця пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр выдатны дзеяч музычнага мастацтва, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР, старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР Рыгор Раманавіч **Шырма.**

Не стала вернага сына Камуністычнай партыі і савецкага народа, які аддаў усе свае сілы нашай вялікай Радзіме. Яркі, самабытны талент, невычарпальная энергія, паслядоўнасць ва ўсталяванні камуністычных ідэалаў вызначалі Рыгора Раманавіча ва ўсіх сферах шматграннай дзейнасці. Ён вядомы як глыбокі і страсны збіральнік і даследчык музычна-паэтычнай народнай творчасці, перакананы прапагандыст беларускай народнай песні, пісьменнік-публіцыст, які ўзнімаў у сваіх выступленнях важнейшыя праблемы развіцця культуры, музычнай творчасці, выдатны выканаўца-інтэрпрэтатар сусветнай класікі.

Рыгор Раманавіч быў таленавітым выхавацелем творчай моладзі. Пад яго кіраўніцтвам вырасла цэлае пакаленне майстроў беларускай музыкі.

Нарадзіўся Рыгор Раманавіч Шырма 20 студзеня 1892 года ў вёсцы Шакуны Пружанскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння вучобы працаваў настаўнікам, кіраваў самадзейнымі харавымі калектывамі. Прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху ў Заходняй Беларусі. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР Р. Р. Шырма стварыў беларускі ансамбль песні і танца, рэарганізаваны пазней у Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу БССР.

У пасляваенныя гады Рыгор Раманавіч Шырма актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці рэспублікі, плённа спалучаючы грамадска-прапагандысцкую дзейнасць з выканаўчай у якасці дырыжора і мастацкага кіраўніка Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы. Пад кіраўніцтвам Р. Р. Шырмы гэты мастацкі калектыў стаў адным з лепшых у краіне. Тонкі музычны густ, багаты вопыт і дырыжорскае майстэрства паставілі Р. Р. Шырму ў рад выдатных савецкіх выканаўцаў. Асабліва ярка і поўна раскрыўся яго бліскучы талент у інтэрпрэтацыі народных песень і твораў беларускіх кампазітараў.

Усё жыццё Р. Р. Шырма збіраў і даследаваў фальклор. Ім запісана звыш дзвюх тысяч народных песень, якія ўвайшлі ў чатырохтомнае выданне «Беларускія народныя песні». Запісаныя Р. Р. Шырмам мелодыі выкарыстаны ў творах многіх савецкіх кампазітараў. Падзеяй у беларускай музычнай культуры стаў выхад у свет яго двухтомнага збору апрацовак беларускіх народных песень. За гэту працу, а таксама канцэртна-выканаўчую дзейнасць Р. Р. Шырме двойчы прысуджалася Дзяржаўная прэмія БССР.

Вялікі ўклад унёс Рыгор Раманавіч у развіццё і расшырэнне культурных сувязей з брацкімі народамі, быў актыўным прапагандыстам савецкага мастацтва за рубяжом.

Р. Р. Шырма праводзіў вялікую грамадскую работу. Ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 5—9 скліканняў, быў членам Рэспубліканскага Камітэта абароны міру, старшынёй Беларускага таварыства «Радзіма», членам рэдкалегій раду рэспубліканскіх часопісаў і газет.

Выдатныя заслугі Р. Р. Шырмы ў развіцці савецкага музычнага мастацтва высока ацэнены Савецкім Урадам. Яму прысвоена ганаровае званне народнага артыста СССР, ён удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі.

Нястомная і шматгранная дзейнасць Рыгора Раманавіча Шырмы з'яўляецца яркім узорам беззапаветнага служэння савецкай Радзіме, нашаму народу, Камуністычнай партыі. Яго імя назаўсёды ўвойдзе ў гісторыю савецкай культуры і захаваецца ў памяці народнай.

Ад ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і Савет Міністраў БССР з глыбокім жалем паведамляюць, што 23 сакавіка 1978 года на 87-м годзе жыцця пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр Рыгор Раманавіч **Шырма**—народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР.

П. М. Машэраў, П. Н. Дземічаў, І. Я. Палякоў, Ц. Я. Кісялёў, В. Ф. Шаура, А. Н. Аксёнаў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, У. Ф. Міцкевіч, У. А. Мікуліч, Я. П. Нікулкін, М. Н. Полазаў, А. А. Смірноў, В. С. Шавялуха, І. Ф. Якушаў, М. М. Зайцаў, У. Е. Лабанок, К. М. Платонаў, Н. Л. Сняжкова, Ц. Я. Хрэннікаў, А. І. Хачатуран, Д. Б. Кабалеўскі, В. Ф. Кухарскі, М. А. Барысевіч, А. Л. Петрашкевіч, Ю. М. Міхневіч, С. М. Пуцылеў, У. В. Мацвееў, Р. П. Платонаў, Г. Г. Барташэвіч, С. М. Лукашэвіч, П. У. Броўка, К. К. Атраховіч [Кандрат Крапіва], Я. І. Скурко [Максім Танк], Ю. У. Семяняка, І. М. Лучанок, Я. А. Глебаў, А. В. Багатыроў, У. У. Алоўнікаў, І. П. Шамякін, Г. І. Цітовіч, Л. П. Александроўская, Т. М. Ніжнікава, С. Ф. Данілюк, Д. Б. Смольскі, Г. М. Вагнер, В. А. Войцік, Б. С. Смольскі, С. А. Картэс, В. А. Грамыка, В. Ц. Тураў, М. М. Яроменка, У. І. Раговіч, Я. А. Вошчак, М. П. Дрынеўскі, В. Ф. Сербін.

Ад камісіі па арганізацыі пахавання Р. Р. ШЫРМЫ

Камісія паведамляе, што труна з целам Рыгора Раманавіча Шырмы будзе ўстаноўлена ў Доме літаратара (вул. Фрунзе, 5).

Доступ для развітання з памёршым будзе адкрыты 25 сакавіка з 10 гадзін раніцы.

Грамадзянская паніхіда адбудзецца ў 14 гадзін.

БЫВАЙ, ДРУЖА!

Наша мастацтва панесла вялікую страту. Памёр дарагі Рыгор Раманавіч.

Больш мы ніколі не пачуем яго пранікнёныя словы, не ўбачым добры прыжмураны позірк яго вачэй, не адчуем сяброўскай падтрымкі. Ён любіў жыццё, радаваўся яму. Быццам волатаўскае дрэва ён стаяў на роднай зямлі, беручы з яе жыватворныя сокі. Гэтыя сокі—народная беларуская песня, вечна жывая народная мелодыя.

На працягу многіх гадоў Рыгор Раманавіч любоўна збіраў і прапагандаваў невычэрпныя скарбы нацыянальнага фальклору, нёс у шырокія масы святло культуры.

З імем Шырмы звязана нараджэнне і творчае станаўленне аднаго з самых славутых калектываў рэспублікі — Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР. Гэта — яго дзецішча, якое ён гадаваў і песціў. Патрабавальны знаўца музыкі, Рыгор Раманавіч дамагаўся ад спевакоў капэлы выключнай культуры выканання. Яго дэвізам было: песня павінна гучаць у народзе і для народа.

Пад кіраўніцтвам Рыгора Раманавіча гэты калектыў дасягнуў самай высокай ступені прафесійнага майстэрства.

Жыццё Рыгора Раманавіча цалкам было прысвечана беларускай песні і музыцы, беларускай культуры.

А колькі сіл і стараннуў прыкладаў ён, каб сабраць і запісаць тыя тысячы народных песень, што склалі чатыры тамы унікальнага выдання. Гэта — своеасаблівы летапіс народнага жыцця. Гэта — своеасаблівы подзвіг жыцця нашага слаўнага дзеяча беларускай культуры.

Мы, работнікі культуры, яго паслядоўнікі, заўсёды будзем удзячны Рыгору Раманавічу за шчырую і сардэчную падтрымку, за той уклад, які ўнёс ён у скарбніцу нашай музычнай культуры. Мы будзем заўжды памятаць яго чалавечнасць, чуласць і дабрату, партыйную непрымірымасць да фальшу і безгустоўнасці.

З імем Рыгора Раманавіча звязаны многія падзеі ў музычным жыцці нашай рэспублікі. Кожны з нас, хто меў магчымасць далучыцца да мастацтва гэтага цудоўнага чалавека і грамадзяніна, назаўсёды захавае ў сэрцы ўдзячнасць.

Бывай, дружа! Бязлітасная смерць вырвала цябе з нашых радоў. Але ў народзе засталіся тысячы песень, наша цудоўнае беларускае мастацтва, для якога ты так многа зрабіў.

У народзе застанецца нязгасная памяць і ўдзячнасць табе.

Як эстафету, мы панясём тваю песню па жыцці.

Генадзь ЦІТОВІЧ,
народны артыст СССР.

ПРАВА НА НЕЎМІРУЧАСЦЬ

Песня — душа народа... Менавіта гэтыя словы часта паўтараў Рыгор Раманавіч Шырма. На вялікі жаль, сёння мы ўжо гаворым пра гэта ў мінулым часе. Мы ведалі, што ён цяжка хворы, мы ўсведамлялі гэта з трывожным пачуццём на яго апошнім юбілейным вечары. І тым не менш, прызнацца, не верылася, што гэты нестарэючы, хоць і даўно сівы, гэты ўлюбёны ў народную песенную стыхію і незвычайна моцны, панароднаму здаровы духоўным і фізічным здароўем чалавек можа калі-небудзь пакінуць нас, пайсці ў свой апошні шлях...

Стаяць у мяне на паліцы зборнікі народных песень у запісах Рыгора Раманавіча, слухаў не раз яго сусветна вядомую капэлу, выступаў час ад часу разам з ім перад працоўнымі і моладдзю, гутарыў з ім у Саюзе пісьменнікаў. (Гэта знамянальна, што ён быў членам двух творчых Саюзаў, бо ў яго таленце шчасліва спалучалася любоў да меласу і жывога народнага слова). Словам, я меў гонар адчуваць яго прысутнасць як творцы ў нашым культурным жыцці і яго прысутнасць як аднаго са старэйшых нашых настаўнікаў-дарадчыкаў у жыцці асабістым. Быў ён мастаком і камуністам сапраўдным, быў Чалавекам сапраўды з вялікай літары.

Сваю ўдзячнасць і пашану мы выказвалі яму і пры жыцці. Тым больш пачуцці гэтыя поўняць нашы сэрцы зараз, калі яго ўжо няма ў жывых.

Неўміручая народная песня, якой Рыгор Раманавіч аддаў усё сваё свядомае жыццё, і неўміручымі, як гэта песня, будуць заўсёды ў сэрцы і памяці народнай яго светлы вобраз, яго авеянае славай імя — Рыгор Шырма.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ,
сакратар праўлення СП БССР.

ЯК ДОБРАЯ ПЕСНЯ

Няма з намі Рыгора Раманавіча Шырмы — Чалавека, Музыканта. Усё жыццё яго было звязана з песняй, народнай песняй. Хто вымерае тыя вёрсты дарог, што прайшоў па вёсках роднай старонкі — любай Беларусі — у пошуках жамчужын песеннага фальклору Рыгор Раманавіч. Гэта было даўно, але і сёння мы не перастаём захапляцца гэтым подзвігам чалавека, які падарыў нам і нашым нашчадкам неацэнны песенны россып.

Смерць Рыгора Раманавіча (як страшна вымаўляць гэтае слова ў дачыненні да яго!) яшчэ і мая асабістая трагедыя. Мы родам з суседніх вёсачак на Пружаншчыне, і лёс злучыў нас на шмат гадоў для сумеснай работы ў Дзяржаўным ансамблі песні і танца, які быў створаны яшчэ ў Беластоку ў 1940 годзе на чале з Шырмам (я там узначальваў харэаграфічную частку).

Цесную, сардэчную дружбу мы захавалі на ўсё жыццё. Я заўсёды захапляўся неўтаймоўным характарам Рыгора Раманавіча, яго апантанасцю, нейкай, я б сказаў, фанатычнай прывязанасцю да народнага мастацтва, якое ён ведаў, як ніхто.

З яго імем звязана нараджэнне і творчае станаўленне аднаго з самых выдатных мастацкіх калектываў — Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР, якую ведалі не толькі ў многіх кутках Беларусі, але і далёка за яе межамі.

А колькі сіл аддаваў ён на пасту кіраўніка Саюза кампазітараў БССР!

Здаецца, толькі ўчора мы, удзельнікі ўрачыстага пасяджэння, прысвечанага 85-годдзю з дня нараджэння Рыгора Раманавіча, шчыра віншавалі яго, зычылі яму творчай працы, бадзёрасці. Ён і быў заўсёды бадзёры, жыццярадасны.

І вось — няўмольнае... Цяжка, вельмі цяжка ўсім нам, хто яго любіў.

Бывай, мой дарагі Рыгор Раманавіч! Імя тваё будзе жыць заўсёды, як жыве заўсёды добрая песня.

І. ХВОРАСТ,
заслужаны работнік культуры БССР.

Як паведамлялася ўжо, неўзабаве адбудзецца пленум праўлення СП БССР, у цэнтр увагі якога будзе вынесена пытанне аб беларускай літаратуры для дзяцей і юнацтва, яе стане і задачах у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, пастаноў ЦК КПСС. Гэтаму важнаму пісьменніцкаму форуму рэдакцыя прысвячае змешчаныя ў нумары матэрыялы — аглядны артыкул М. Яфімавай, рэцэнзіі на новыя кнігі для дзяцей — і запрашае пісьменнікаў, крытыкаў, чытачоў прыняць удзел у размове па праблемах дзіцячай літаратуры, якая мае адбыцца на старонках штотыднёвіка да пленума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

ПЕРАД СТАРТАМ У ЖЫЦЦЁ

НАТАТКІ ПРА ДЗІЦЯЧУЮ ЛІТАРАТУРУ МІНУЛАГА ГОДА

Леташні год — гэта год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, а па сутнасці і год шасцідзесяцігадовага юбілею беларускай літаратуры для дзяцей, бо вядома, што толькі ў савецкі час, калі развіццё нацыянальных культур стала агульнадзяржаўнай справай, удалося наладзіць сістэматычнае выданне дзіцячых кніжак і перыёдыкі на роднай мове.

Безумоўна, што ў гэтай літаратуры, асабліва ў той яе частцы, якая адрасавана сярэдняму і старэйшаму школьнаму ўзросту, вядучае месца займаюць творы на героіка-патрыятычную тэму. Пісьменнікі звяртаюцца да падзей рэвалюцыі, дапамагаюць зразумець яе гістарычную абумоўленасць, гуманістычны пафас, сувязь з усімі дасягненнямі нашай краіны, глыбей усвядоміць сэнс неўміручых ленінскіх ідэй, веліч Леніна, камуніста і чалавека, неад'емнасць яго жыцця ад гісторыі нашай партыі. Яны адлюстроўваюць суровую і гераічную рамантыку грамадзянскай вайны і часу ўмацавання Савецкай улады, расказваюць пра мужны подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, услаўляюць магутную і прыгожую сацыялістычную Беларусь, звяртаюцца да тэм далёкага мінулага і да сучаснасці.

Асабліва пашыраны творы гісторыка-рэвалюцыйныя. Напісаныя ў рознай творчай манеры, яны захапляюць ідэяй самаадданага служэння рэвалюцыйнай справе, свайму народу. Гэта ў першую чаргу — нізка празаічных мініяцюр П. Ткачова «Самае галоўнае», яго аповесць «На Шушы, ля падножжа Саяна», («Маладосць», 1977, № 11), зборнік апавяданняў Я. Бяганскай «Над ракой Шушай», дакументальная аповесць С. Грахоўскага «Суровая дабрата», нарыс-даследаванне У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі».

Самае важнае, сцвярджае П. Ткачоў у зборніку «Самае галоўнае», гэта вернасць рэвалюцыйным ідэалам, гатоўнасць актыўна змагацца за іх, жыццё Леніна—найярчэйшы прыклад такога самаадданага рэвалюцыйнага гарэння. Нешматслоўна, уражліва расказвае пісьменнік пра падпольную дзейнасць праваадыра, поўнае рэвалюцыйных турбот яго жыццё ў ссылцы і эміграцыі, пра яго выключна вялікую ролю ў стварэнні Камуністычнай партыі, пра работу на пасадзе Старшыні Савета Народных Камісараў, пра ўважлівыя адносіны Ільіча да патрэб рабочых і сялян, яго клопаты аб таварышах.

Амаль усе мініяцюры (некаторыя з іх друкаваліся раней), як з зярнятка, выраслі з канкрэтнага дакументальнага факта, даты, падзеі. Пісьменнік стварыў шэраг выразных і яркіх штрыхоў да партрэта Ільіча, ён вывучыў і прааналізаваў гістарычны і архіўны матэрыял, перачытаў і выкарыстаў работы Леніна, неаднаразова наведаў музеі і памятныя ленінскія мясціны.

Цікавасць П. Ткачова да ленінскай тэмы трывалая, аб гэтым сведчаць і ранейшыя яго творы, і новая аповесць «На Шушы, ля падножжа Саяна». У ёй ленінскі партрэт узбагачаны новымі рысамі, шмат увагі ўдзелена і рэвалюцыйным паплечнікам Леніна — Крупскай, Лепяшынскаму, Кржыжаноўскаму і інш.

«Больш прыгожага чалавека, чым Ленін, — сказаў аднойчы С. Канёнкаў, — я не бачыў». Гэта гаворыць сваімі творамі і П. Ткачоў, які ў распрацоўцы ленінскай тэмы ідзе складаным шляхам усебаковага мастацкага асэнсавання гістарычнай асобы Ільіча.

У асноўным на праблеме «Ленін і дзеці» спыняецца Я. Бяганская ў кнізе «Над ракой Шушай», адрасаванай малодшым школьнікам. Пісьменніца наведала Шушанскае, сустракалася з шушанцамі, якія, як адзначае яна ў прадмове, «з пакалення ў пакаленне перадаюць расказы тых, каму пашчасціла сустракацца некалі з ссыльным Уладзімірам Ільічом і Надзеждай Канстанцінаўнай Крупскай».

Я. Бяганская любоўна сабрала гэтыя крупінкі жывой гісторыі і ўключыла ў свае апавяданні, якія вызначаюцца лірычнасцю і цеплынёй. Пісьменніца не абмежавалася традыцыйнымі «падарункавымі» сюжэтамі, а расказала таксама, як Ленін і Надзежда Канстанцінаўна, моцна сябруючы з дзецьмі, уплывалі на фарміраванне іх характару, як абуджалі ў юных цікавасць да ведаў, любоў да прыроды, чуласць да прыгажосці, спагадліваасць, пачуццё чалавечай годнасці. Некаторыя з такіх апавяданняў нагадваюць псіхалагічныя навелы — «Непрыемная прыгода», «Мішкаў заяц», «Пашына радасць» і інш.

Нязгасныя праменні Кастрычніка, святло ленінскага генія своеасабліва ўвасобіліся ў надзвычай арыгінальнай кнізе У. Караткевіча з паэтычнай назвай «Зямля пад белымі крыламі». Гэта—нарыс (так вызначае жанр твора аўтар), але ўспрымаецца ён як натхнёны сказ-даследаванне аб Беларусі ад далёкіх часоў мінуўшчыны да сучаснасці. У кнігу ўключаны разнастайныя звесткі з галіны эканомікі, этнаграфіі, культуры, гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху на Беларусі, у ёй адлюстраваны старонкі барацьбы супраць нямецка-фашысцкай навалы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, стваральны пафас сённяшняга часу. Усё гэта прасякнута ўдумлівым пошукам духоўных вартасцей свайго народа, філасофскім асэнсаваннем тых вызначальных гістарычных перамен, якія карэнным чынам змянілі лёс Беларусі.

З дасведчанасцю вучонага, з захапленнем мастака-патрыёта расказвае У. Караткевіч пра гарады і памятныя мясціны Беларусі, пра помнікі культуры і гераічнай славы. Гаворачы пра сённяшнюю Беларусь, ён кожны раз не можа не здзівіцца імклівай плыні жыцця, радасным зменам. «Калі думаеш пра тое, якія змены адбыліся ў нашых гарадах, — хочаш не хочаш, а пачынаеш збівацца. Назваў два прадпрыемствы, а іх на сённяшні дзень — дзесяць, назваў пяць, а іх сёння трыццаць два. Поступ сучаснай гісторыі не дагоніш ніякай кнігай», — зазначае аўтар. Рамантыкай гэтых змен і дасягненняў прасякнута кніга «Зямля пад белымі крыламі». Пісьменнік радуецца сіле, магутнасці, нястрымнаму імкненню роднай Беларусі ў будучы, яшчэ больш цудоўны дзень. Ён нездарма не згаджаецца з тым, нібыта па абрысах наша рэспубліка нагадвае дубовы ліст. На яго думку, родная Беларусь па сваіх абрысах больш падобна на зубра, і ў гэтым параўнанні — глыбокі сімвалічны сэнс.

У пачатку кнігі, звяртаючыся да сваіх чытачоў — юнакоў і дзяўчат, — пісьменнік адзначыў, што сваім творам хоча дапамагчы ім пазнаць радзіму, «даць ключы ад нашага дома». Гэтая задума ўдалася аўтару: ён адкрыў юным таямніцы хараства роднай зямлі, веліч паняцця Радзіма, паказаў багацце і мілагучнасць беларускай мовы, прывабнасць нацыянальных традыцый, уславіў баявую і рэвалюцыйную славу народа, векапомныя Кастрычніцкія падзеі, загартаваную праз стагоддзі дружбу з рускім, украінскім народамі, непарыўную еднасць Савецкай Беларусі з усёй магутнай і вялікай Савецкай Айчынай.

Кніга «Зямля пад белымі крыламі» вучыць юных даражыць усім гэтым, удасканальваць красу роднай зямлі: «Калі вы станеце дарослыя—яны будуць яшчэ прыгажэйшыя, нашы вёскі і гарады. Вы пройдзецеся па іх вуліцах і вам самім захочацца прыкласці свае рукі, веды і ўмельства да таго, каб зрабіць іх дзівам дасканаласці», — піша аўтар.

Дакументалізм — адметная асаблівасць сённяшняй прозы, ён вельмі адчувальна выяўляецца таксама і ў творах аб Вялікай Айчыннай вайне, у развіцці жанраў дакументальнага нарыса, аповесці.

Нарысамі М. Гелера «Як крылы дзівоснай птушкі» паноўнілася серыя «З арлінага племя», якую выпускае выдавецтва «Мастацкая літаратура». У іх адлюстраваны эпізоды жыцця беларускіх арлянят, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — П. Усялёнка, В. Шарая, Р. Фраловіча, В. Пятровіча, А. Котава. Асабліва ўдаліся аўтару нарысы «У родным горадзе», «Сустрэча», «Як крылы дзівоснай птушкі», дзе, зыходзячы з дакументальных фактаў, умела скрыжоўваючы гісторыю і сучаснасць, карысіст сцвярджае думку аб душэўнай велічы юных герояў, перадае сённяшнім пакаленням эстафету гераічных спраў юных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Арыгінальным творам з'яўляецца дакументальная аповесць С. Грахоўскага «Суровая дабрата». У ёй адлюстраваны жыццёвы шлях чалавека легендарнай біяграфіі Героя Савецкага Саюза Васіля Захаравіча Каржа, удзельніка грамадзянскай вайны, баёў у рэспубліканскай Іспаніі, камандзіра партызанскага злучэння на Палессі ў перыяд Вялікай Айчыннай, старшыні калгаса «Партызанскі край» у пасляваенны час. Пісьменнік выкарыстаў архіўныя матэрыялы, мемуарную літаратуру, успаміны людзей, якія асабіста ведалі Каржа, побач з ім жылі, змагаліся і працавалі.

Аповесць вызначаецца кампактнасцю кампазіцыі, уменнем аўтара спыніць увагу юных чытачоў на найбольш вызначальным, важным. У гэтым С. Грахоўскаму, несумненна, дапамог ранейшы вопыт работы ў галіне дакументальнага жанру. У аповесці «Суровая дабрата» шмат найцікавейшых фактаў аб рэвалюцыйнай барацьбе ў Заходняй Беларусі, грамадзянскай вайне ў Іспаніі, аб цяжкасцях змагання ў варожым тыле, гісторыі рэйкавай вайны, аб гераічным рэйдзе партызанскага злучэння пад камандаваннем Каржа, аб яго рабоце на пасадзе старшыні калгаса.

І ўсё ж галоўнае ў гэтым творы — асоба Каржа. Пісьменнік грунтоўна, з шэрагам дакладных псіхалагічных дэталей, даследуе маральны і эмацыянальны свет свайго героя, натхнёнага камуніста-леніца, чалавека рэвалюцыйнай загартоўкі, невычэрпнай ініцыятывы, ваеннага і арганізатарскага таленту, вялікай самадысцыпліны, прынцыповасці, патрабавальнасці, выключнай чуласці і гуманізму. Гэтыя якасці Каржа надзвычай удала акумуляваны ў лаканічнай, багатай падтэкстам назве твора — «Суровая дабрата».

Заслугоўвае ўвагі аповесць А. Кобец-Філімонавай «Жаваранкі над Хатынню». Пісьменніца карпатліва збірала скупыя звесткі аб вёсны, сустракалася з тымі, хто бываў у даваеннай Хатыні, хто ўцалеў тады ў той жудасны сакавіцкі дзень... Дакументальныя штрыхі і з'явіліся асноўным арыенцірам для аўтара. Твор атрымаўся хвалюючым. «Гэта кніга, — піша ў прадмове да аповесці «Жаваранкі над Хатынню» Васіль Быкаў, — жывое і бясхітраснае апавяданне аб людзях Хатыні, аб яе бяспрыкладнай трагедыі, аб дзецях, якія ўжо

...І ПРЫКЛАД ІНШЫМ

Свет маленства, што адкрываецца са старонак новай дзіцячай кніжкі Рыгора Барадуліна, светлы і чысты, рамантычна-ўзнёслы і разам з тым крыху смяшлівы, наіўны, як гэта амаль заўсёды бывае і ў жыцці. У шматколернай краіне, створанай шчодрай фантазіяй паэта, шмат аптымізму, пры якім узнікае і ўзаемны давер, разуменне, з'яўляецца на тварах чытачоў шчырая ўсмешка.

Напачатку ўзнікае нават такое адчуванне, што паэт неашчадна абыходзіцца са сваім талентам, укладаючы ў невялікія пацешкі, жарты столькі майстэрства, якога іншаму аўтару магло б хапіць на некалькі твораў. Але гэтая шчодрасць — вынік вялікай любові да дзяцей, сведчанне такога стану душы, калі абавязкова хочацца стварыць для іх нешта цікавае, радаснае. Зрэшты, гэта меў на ўвазе і В. Вітка, калі ў сваёй цудоўнай кнізе «Дзеці і мы» пісаў, што кожны сапраўдны пісьменнік рана ці позна стане і пісьменнікам дзіцячым.

Віртуозны паэтычны майстра, у творах якога шмат ускладнёных вобразаў, часам адчуваецца нават перанасычанасць выяўленчымі сродкамі, Р. Барадулін добра адчувае, што ў творчасці для дзяцей галоўнае — лаканічнасць, даходлівасць, выверанасць кожнай фразы, кожнага радка. Вось чаму ў кніжцы «Што было б тады б, калі б?» вершы ў большасці сваёй простыя па будове, выразныя па гучанню, а калі ў аўтара і з'яўляецца жаданне «пакаламбурыць», дык гэта робіцца тонка і дакладна, што, бясспрэчна, сэнс верша зразумеюць і малышы — як, напрыклад, у жарце «Пільная патрэба»:

На тэлестудыю цяля
Забегла з просьбай пільнай,
Каб выпускалі ўрашце для
Цялятак
Цяляфільмы!

А колькі тонкасці, умення заўважыць магчымасці пэўнай літары ў вершы «На шашы»?! Адчуванне такое, што ў гэты момант сапраўды знаходзішся ля дарогі, назіраеш за рухам па ёй машын, услухоўваешся ў шоргат шын, а ў думках ажываюць паэтавы радкі:

Штохвіліны на шашы
Шумна, як на кірмашы,
Шоргат,
Шорах,
Шум птушыны.
За машынаю машына.
Нешта шэпча
Шына шыне.
Шпак шыкуе
На шыпшыне.
А пад шатамі ў цішы
На ляшчыне спарышы.
У капелюшы спарыш,
Пашукай спарыш, малыш!
Шпарка па шашы ў кашы
Пашыбуюць спарышы.
Шэпча шустрая шаша:
— Не спяшайцеся,
Ша-ша...

Паэт добра ўяўляе сабе свайго будучага слухача (кніжка адрасавана дашкольнікам) і разумее, што для яго вельмі важна пэўная сюжэтная нечаканасць, жыццёвая немагчымасць асобных фактаў ці сітуацый, якая, аднак, заўсёды абуджае фантазію, садзейнічае вобразнаму мысленню дзіцяці, і тое, што нам, дарослым, здаецца неверагодным, успрымаецца ім як нешта дзіўнае, але зусім рэальнае ў сваёй аснове. Адсюль узнікаюць пытанні: «чаму», «як», «што» — як вось у гэтым жарце (верш так і называецца «Жарт»): «Проста жах — гарыць калодзеж, аж пад неба полымя. Чым астудзіш, ахалодзіш? Не рукамі голымі! Што рабіць? Бяда адна — выгарыць вада да дна. Што рабіць і што рашыць? Як ваду вадой тушыць?!.»

Дасціпная ўсмешка, даверлівасць садзейнічаюць таму, што творы добра запамінаюцца. «Чамучкам» цікава паслухаць

Р. Барадулін. Што было б тады б, калі б? Жарты. Для дзяцей дашкольнага ўзросту. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

ніколі не стануць дарослымі»...

У аповесці шмат удалых мастацкіх дэталей, знаходак, адчуваецца, што пісьменніца пасапраўднаму «перахварэла» тэмай. У творы ўвасоблены боль страты і адначасова вялікая душэўная сіла савецкіх людзей, якіх не маглі напалохаць і зламаць зверствы фашысцкіх катаў. Усім зместам аповесці, кожным радком яе А. Кобец-Філімонава заклікае помніць Лідзіцэ, Арадур, Хатынь...

На аўтабіяграфічным матэрыяле напісаны аповесці А. Пальчэўскага «Сцежкі» і А. Бялевіча «Малюнкі дзяцінства».

Актуальныя праблемы грамадзянскага ўзмужнення і духоўнага пасталення маладога камандзіра, фарміравання яго маральнага вобліку пад уплывам службы ў Савецкай Арміі ўзняты ў творах, якія ўвайшлі ў зборнік А. Жука «Зоркі над палігонам» (аповесць з той жа назвай і некалькі апавяданняў). Аўтар удала завязаў канфлікты, даў шэраг адметных запамінальных вобразаў, аднак аповесці «Зоркі над палігонам» (апавяданні напісаны больш жыва, эмацыянальна) не хапае дынамічнасці, займальнасці, а ў творы, адрасаваным юным чытачам, гэта, як вядома, вельмі важна.

Як радасную з'яву леташняга года хочацца назваць зборнік «Дзень добры, мама!» (укладальнік У. Васілевіч), у які ўвайшлі з густам падабраныя і размешчаныя вершы і ўрыўкі з паэм больш як сямідзесяці беларускіх аўтараў. Усе творы гэтай кнігі прысвечаны маці, і кожны з іх уносіць нешта вельмі важнае ў сэнс дарагога, светлага, такога значнага слова—мама.

Адзначаючы несумненныя дасягненні беларускай дзіцячай літаратуры для сярэдняга і старэйшага ўзросту (у асноўным аб гэтых кнігах гаворка), мы не можам, аднак, не сказаць пра недастатковую ўвагу нашых пісьменнікаў да праблем сучаснасці. На жаль, паранейшаму «добрыя дзіцячыя кніжкі, у якіх захапляюча расказваецца пра сённяшні дзень, пра савецкіх людзей, якія ператвараюць казку ў сапраўднасць—усё яшчэ рэдкасць» (П. М. Машэраў). І летась не з'явілася ніводнага твора аб школе, аб ініцыятыве і справах піянераў і камсамольцаў, твораў, якія б адлюстроўвалі велічны час, узнімалі праблемы працоўнага выхавання, сяброўства, барацьбы супраць праяў індывідуалізму, бездухоўнасці, улады рэчаў і інш. Не з'явілася ў нас таксама навукова-мастацкіх, фантастычных, сатырычных і гумарыстычных твораў для юных чытачоў.

Затое надзвычай плённа гумарыстычныя традыцыі развіваюцца ў літаратуры для малодшага ўзросту. «Доктар Смех» — кніжка вершаў Э. Агняцвет. Незласліва, але вельмі трапна высмейвае Э. Агняцвет недысцыплінаванасць, гультайства, грубасць, несумленныя адносіны да вучобы, няўменне паводзіць сябе за сталом і ў грамадскіх месцах, няўвагу да таварышаў, залішнюю самаўпэўненасць і інш. («Саўка за сталом», «Баксёр», «Ледзянцы», «Свісток» і інш.).

Трапна прыкмячае недахопы дзяцей і лёгка знаходзіць адпаведныя «лекі» С. Шушкевіч:

Гляньце вы на Віцькаў твар,
Пэўна, Віцька камінар?
Брудны, чорны, закарэлы
Толькі лоб пад шапкай белы.
Гэта наш знаёмы Віцька,
Брудны хлопчык —
непамыцька...

Летась выйшлі два зборнікі вершаў С. Шушкевіча—«Красавік» (выбранае) і «Барадаты камар». Аўтар зборніка «Красавік» непрыкметна, пачынаючы з малога, даступнага, вядзе сваіх чытачоў — у адпаведнасці з іх узростам — да ўсё больш грунтоўнага пазнання жыцця, перадае ім сваё захапленне нашай савецкай явай, тонкае адчуванне красы прыроды, якая з «чалавечай дабратою кранае ўстрывожанае сэрца», выклікае ў іх захапленне подзвігамі герояў Вялікай Айчыннай вайны, вучыць слухаць голас тых, хто «не здаўся, не стаў на калені» («Дазнанне», «Голас слухайце іх, пакаленні», «Сніўся сон перад паходам»).

Самым маленькім адрасуецца кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, выдатнага мастака і педагога В. Віткі «Ладачкі-ладкі», у якой змешчаны таленавіта апрацаваныя паэтам беларускія народныя калыханкі, пацешкі, гульні, лічылкі.

Вусна-паэтычная творчасць, у якой, як сказаў К. Ушынскі, увасобіўся педагагічны талент народа, заўсёды будзе неацэнным матэрыялам для выхавання. У нашай літаратуры гэтыя традыцыі надзвычай глыбокія, даўнія. Вопыт паказаў, што ў дзіцячай паэзіі яны не перашкаджаюць, а, наадварот, спрыяюць асваенню новых тэм. Гэта засведчылі сваёй творчасцю В. Вітка, С. Шушкевіч, Э. Агняцвет, А. Вольскі, А. Дзеружынскі. Праўда, нярэдка фальклорныя традыцыі ўспрымаюцца паэтамі як нешта схематычнае, абмежаванае.

Нярэдка ў творах для маленькіх перапяваюцца адны і тыя ж тэмы, матывы. Хочацца, аднак, заўважыць, што ў апошнія гады аўтары, якія пішуць для малодшага ўзросту, імкнуцца вырвацца з-пад улады традыцыйных тэм і сюжэтаў. Гэтыя зрухі адбіліся і ў кніжках, якія выдадзены для малодшага ўзросту ў мінулым годзе, — А. Дзеружынскі «Конікі-будаўнікі»; Я. Крупенька «Усе работы добрыя»; М. Чарняўскі «Залатая ніва»; І. Муравейка «Дуб і дубок»; Н. Галіноўская «Мой дзень». У іх намецілася агульная, падказаная жыццём тэндэнцыя—расказаць дзецям пра сучаснасць, выклікаць у іх любоў да працы, цікавасць да прафесій, неабходных у сферы вытворчасці.

Аб шуканнях, здабытках сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры для малодшага ўзросту сведчыць вясёлая, псіхалагічна тонкая, багатая каштоўнымі назіраннямі, захапляючая і тактоўна павучальная кніга П. Місько для дзяцей малодшага школьнага ўзросту (яе з задавальненнем паслухаюць і дашкольнікі) «Прыгоды Бульбобаў».

Прынцыпова новай з'явай у літаратуры для малодшага ўзросту стала кніга А. Вольскага «Ізумрудавы горад, дзе ты?». У ёй надзвычай своеасабліва скампанаваны апавяданні, нарысы, вершы, замалёўкі, успаміны. Тэматычныя далягляды зборніка вельмі шырокія. Узрушана, удумліва расказаў аўтар пра свае замежныя паездкі, выкрыў супярэчнасці капіталістычнага свету, антынародную палітыку імперыялістаў, з пачуццём сыноўняй гордасці ўславіў Савецкую Армію, Савецкую Канстытуцыю, па законах якой жыве ўвесь наш народ. Есць у кнізе хвалюючыя творы пра далёкую пустыню Кызылкум і пра родную Беларусь, яе выдатных людзей, незвычайны размах стваральнай працы, дзіўную красу прыроды.

...Пэўныя здабыткі мінулага года не даюць аднак падстаў для заспакаення. Перад усёй нашай беларускай дзіцячай літаратурай востра стаіць задача яе далейшага жанравага і тэматычнага ўзбагачэння, паляпшэння якасці твораў, больш паглыбленага мастацкага асваення сучаснасці, задача ўвасаблення героя, які б надоўга ўвайшоў у жыццё дзяцей, у свет іх думак і мар, стаў бы іх верным сябрам і яркім прыкладам для пераймання.

Час дыктуе неабходнасць далейшай устойлівай увагі дзіцячых пісьменнікаў да праблемы працоўнага выхавання, больш грунтоўнага асваення імі тэм сучаснасці. Дзіцячыя кнігі павінны адлюстроўваць рэчаіснасць ва ўсёй складанасці, выхоўваючы ў юных чытачоў ініцыятыву, дух актыўнасці, грамадзянскую прынцыповасць, дапамагаючы ім зрабіць упэўнены старт у жыццё, паспяхова ўключыцца ў працоўны рытм штодзённых будняў Радзімы.

Маргарыта ЯФІМАВА.

пра слана, які не ведаў, «колькі будзе пяць на пяць» і ...завязаў «вузялок на памяць!». А «раніцой прачнуўся ён—мае новы клопат». Які? А такі:

П'юць ваду
Вярблюд,
Індык,
Слон у перапудзе:
Як развязка хобат,
Дык
Правіла забудзе.

(«Як быць?»)

Слон, безумоўна, яшчэ неяк знойдзе выйсце, але як быць неахайнай дзяўчынцы, што запэцкала сукенку? І з'явілася ў кніжцы нечаканая «Аб'ява»:

Тэрмінова,
Тэрмінова
Патрабуецца
Карова,
Не з салоднім
Маланом,
А з шырокім
Языком,
І даўгазным,
І шурпатым,
І таўшчэзным,
І вялізным, —
Каб памог ён
Маме з татам
Форму школьную
Вылізваць!

Дзеці з цікавасцю даведаюцца таксама і пра ваўкоў-дзівакоў, што «надзелі кашулі, кожны ў стракатую клетку каўбойку, і з вераб'ямі палезлі ў бойку» («Ты чуў? Ты чулаі»), і пра «электракобру», якая «працуе добра... У разетку хвост уткні — і любуйся чысціні!» («Электракобра»), і пра «бубнілу-нудзілу», якое «бубнела, хадзіла, пакуль кракадзіла з далёкага Ніла не разбудзіла» і апынулася ў ...жываце кракадзіла («Як дражніць Бубнілу?»).

...Усяго дванаццаць невялікіх вершаў у зборніку. І гэта добра, што аўтар з усёй патрабавальнасцю і строгасцю аднёсся да напісанага для дзяцей, узяўшы са сваёй паэтычнай сявенькі толькі найбольш важкае, спелае зерне. Прыемна і тое, што правільна зразумеў агульную пісьменніцкую задуму мастак Аляксандр Шэвераў.

Малюнкі атрымаліся не проста шматфарбнымі, маляўнічымі. Яны падначалены таму, каб заахвоціць маленькага чытача, засяродзіцца, паразважаць над пачутым і, магчыма, у думках нешта «дамаляваць», дамысліць. На актыўныя адносіны да напісанага скіроўвае і сам макет кнігі, зроблены свабодна, раскавана, што дазваляе тэкст размяшчаць і вертыкальна, і гарызантальна, і нават «упісваць» яго ў малюнкі.

Адным словам, зборнік «Што было б тады б, калі б?» не толькі цікавы падарунак «чамучкам», але і добры прыклад іншым пісьменнікам, мастакам таго, як патрэбна ставіцца да стварэння дзіцячых кніжак.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

Радкі гэтыя пішуцца пад уражаннем паспяховага завяршэння палёту першага міжнароднага касмічнага экіпажа ў складзе Аляксея Губарава і Уладзіміра Рэмека — шматвопытнага рускага і ўпершыню далучанага да слаўнай касмічнай сям'і, шчаслівага высокім даверам дзвюх братніх сацыялістычных краін чэха. Чэсць садружнасці і працы!

Наогул, тры апошнія месяцы нашага жыцця, лічачы ад часу бяспрыкладнай касмічнай адысеі Ю. Раманенкі і Г. Грэчкі, літаральна прывучылі нас жыць па зорным гадзіннику, звяраючы з ім сваю паўсядзённасць і сваё пабыткаванне, у якіх неўпрыкмет і натуральна абжывалася шмат нетутэйшага, ну хаця б накшталт касмічнай пошты.

Так што неба ўсё бліжэй і бліжэй да нас, зоры — побач.

І ўсё больш адкрываецца нам будзённы бок гераізму пакарыцеляў космасу.

«Зоры — побач» — так называецца кніга двойчы Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта СССР, нашага земляка Пятра Клімука, якому разам з Віталем Севасцьянавым дагэтуль належыў савецкі рэкорд знаходжання і работы ў космасе. На 63 сутак борт арбітальнай навуковай станцыі «Саюз-4» стаў для іх домам і даследчай лабараторыяй.

Вызначаючы жанр і асаблівасць кнігі (яна яшчэ названа і «кнігай аднаго палёту»), аўтар піша: «Расказаць пра ўсё, што давялося там (у космасе.—**М. С.**) адчуць, убачыць і перажыць, пра ўсё, што паспелі зрабіць мы з Віталем за час працяглай касмічнай экспедыцыі, я наўрад ці змагу. Зрэшты, кніга мая і не прэтэндуе на нейкую вычарпальнасць. Яна — не навуковая справаздача аб палёце, а ўсяго толькі свайго роду «дарожныя нататкі» з арбіты, падмацаваныя некаторымі «касмічнымі» і «зямнымі» развагамі».

ЧЫТАЦКІ ДЗЕННІК ПІСЬМЕННІКА

ПОДЗВІГ—ПОБАЧ

Мы ведаем, і адзначыць гэта асабліва прыемна, што задума самой кнігі ўзнікла побач з намі, у час наведвання касманаўтам «роднага кута», любай сэрцу Беларусі, дзе са звычайнай вёсачкі Камароўка, што на Брэстчыне, пырхнуў ён у рамантычны свет юначых парыванняў і мар. І вось ужо вялікая Радзіма дае яму дужыя арліныя крылы для касмічнага ўзлёту. Прыемна, што гонар упершыню пазнаёміць чытача з кнігай касманаўта-земляка (дапамагаў яму ў рабоце над кнігай Мікола Гіль) узялі на сябе часопіс «Маладосць» і выдавецтва «Мастацкая літаратура».

«Кніга аднаго палёту»... Мабыць, не памыліўся аўтар, менавіта гэтак вызначаючы яе жанр. Гэта не проста дзённік палёту, справаздача аб ім, расказ пра свой шлях у касманаўтыку—але і яшчэ, што вельмі важна, і «касмічныя», побач з «зямнымі», развагі. Кніга ў тым сэнсе, які надаецца гэтай назве ў народным ужытку: тут вопыт для сябе і для ўсіх, тут праўда, якой нельга не верыць, тут значнасць свайго і агульнага. Чытаючы гэтую кнігу, добра ўяўляеш у даволі шырокім аб'ёме не толькі сучасны стан касманаўтыкі з яе шматлікімі і складанымі праблемамі, у цэнтры якіх не рэкорд, не навуковае дасягненне дзеля яго самога, а перш за ўсё чалавек, лёс ягоны на Зямлі і лёс Зямлі самой. Вось як, напрыклад, у аўтара сказана проста, выразна і ў той жа час патэтычна аб мэтах нашага памкнення ў космас: «Пройдзе час, і чалавек з сына Зямлі стане сынам Сусвету. Яго панясуць туды велізарныя міжпланетныя караблі з закончаным экалагічным цыклам. На гэтым караблі-зоркалёце будзе ўсё так, як і на Зямлі — ажно да расліннасці і басейна для купання. Гэта будзе, па сутнасці, сама маленькая Зямля. Бо што такое наша планета, як не прыродны касмічны карабель, разумна і ашчадна створаны для палёту ў бясконцай мёртвай пустэчы!»

З нетаропкага, грунтоўнага расказу, які настройвае на давер, мы выразна ўяўляем як **вобраз** самога палёту, так і **вобраз** аўтара — дапытлівага, адукаванага, не па-паказному сціплага і ўпэўненага ў сабе маладога чалавека 70-х гадоў, выхаванца камсамоліі, якой, дарэчы, і прысвячае ён сваё слова. Мы выразна ўяўляем, што такое 63 сутак, што ні ў якім выпадку не параўнальныя з зямнымі, што ва ўмовах бязважкасці і абмежаванасці жыццёвай прасторы яны абцяжарачы неверагодна насычанай і складанай навукова-даследчыцкай праграмай, клопатамі па абслугоўванню сістэм карабля. Дадайце сюды, нарэшце, звычайныя праблемы звычайнага быту, уладкаванне асабістай і «калектыўнай» псіхалагічнай «гаспадаркі» (а гэта надзвычай важна, і ў гэтым пераконвае хаця б раздзел «Мы ляталі ўдвух...») — і вы ўбачыце, што нават адна «псіхалогія» палёту, выдзеленая асобна, вартая была б цэлай кнігі. Такая кніга магла б даць матэрыял глыбокага чалавеказнаўчага зместу, пра які яшчэ мала думаем мы сёння, у тым ліку і пісьменнікі. І які, як паветра, патрэбен будзе пісьменніку будучага — не абавязкова фантасту. Бо несумненна, што чалавек, гэтая загадка з загадак, гэтая, кажучы словамі мудрага Дзяржавіна, «крайня степень вещества», будзе спазнаны толькі ў падключэнні ягонага планетарнага вымярэння да вымярэння касмічнага.

Чытаючы гэтую ўдумлівую, разумную кнігу, мне чамусьці ўспаміналіся словы аднаго з піячераў геліябіялогіі А. Л. Чыжэўскага: «Мы прывыклі прытрымлівацца грубага і вузкага антыфіласофскага погляду на жыццё як на вынік выпадковай гульні зямных сіл. Гэта, вядома, няправільна. Жыццё... у значна большай ступені з'ява касмічная, чым зямная. Яна створана ўздзеяннем творчай дынамікі космасу на інертны матэрыял зямлі. Яна жыве дынамікай гэтых сіл...».

Гэтым бы хацелася і закончыць.

Міхась СТРАЛЬЦОЎ.

13 сакавіка 1978 г.

ПРОЗА

Мікола ЛОБАН



ЗВАРОТ

Увазе чытача прапаную некалькі старонак з рамана «Шэметы» — апошняй кнігі трылогіі пад той жа назвай. Падзеі, апісаныя тут, адносяцца да першага перыяду Айчыннай вайны, да перыяду ўзнікнення партызанскага руху на Беларусі.

Аўтар.

ЛЕС УЖО быў зусім недалёка, адгароджвала яго метраў восемсот поля. Спачатку ішла свежая ралля, потым палоса няворанага. Па ёй можна было б павярнуць: яна хоць і не вядзе прама ў лес, але праходзіць блізка каля яго. Там астанецца сто метраў — і кустоўе з рэдкім сасняком. Лес нізкі, можа, нават з вадою. Калі першымі кулямі не скосяць, то нейкая надзея на выратаванне будзе. Каб толькі пераскочыць гэтыя сто метраў раллі. Вельмі далёка ідзе аўтаматчык, каб можна было, падскочыўшы, збіць яго з ног. Прашые, сволач. Тут няможна памыліцца, памылка—смерць. І лепш памерці ў барацьбе, чым у пакоры. Калі павядуць блізка каля раўка, то аўтаматчык павінен будзе падблізіцца, а калі пабаіцца падблізіцца, то адстане. Гэта самы моман, яго няможна прапусціць, другога такога не будзе. Толькі б не звярнулі ўлева, толькі б не звярнулі ўлева, толькі б не звярнулі ўлева. Не, здаецца, не зварочваюць, здаецца, павядуць паўз раўчук. А можа, гэты раўчук іх магіла і ёсць? Ну, фашысцкая морда, давай бліжай, бліжай. Вот так. Яшчэ трошачкі, яшчэ... Не, свалата, не пайшоў, інстынкт падказвае—няможна ісці блізка. Адстаў. Ну што ж, і гэта добра. Зараз трэба кінуцца праз раўчук уніз. Толькі б пераскочыць раллю. Ну, давай бог ногі...

Несла ўперад, быццам нейкая пабочная сіла гнала пад ногі зямлю. Шанцавала, вой як шанцавала! Першая чарга пачулася толькі тады, калі ногі ступілі на цвёрдую зямлю. Не кранула, прайшла над галавою. Яшчэ чарга, яшчэ чарга. Але куль не чуваць. Можа, не па ім? Можа, пачалі разбягацца? Можа, яго пакінулі? Не, бягуць. Трэба хутчэй, трэба хутчэй, трэба выйграць богам падораныя хвіліны. Хутчэй на раллю, каб хаця метраў са сто прабегчы па раллі. Спатыкнуўся і ўпаў. Доўга паўзці няможна, бягуць. Але чарга мінула і на гэты раз. Цяпер толькі прама, прама. Аўтамат недалёка нясе. Яшчэ трошачкі, яшчэ. Вот і скончылася першая палоса ворыва. Нічога не чуваць, акрамя трэску аўтаматаў. А вот ужо і лес, ужо зусім блізка. Не, не ўцячы: наўздагон пусцілі аўчарку. Ён чуе яе брэх. Вялікая адкормленая аўчарка. Гэта зваліць з ног. За ёю следам бягуць аўтаматчыкі. Страшэнна заныла душа: няма ратунку. Была зацеплілася надзея—і ўжо няма. Сумна стала. Хоць бы што ў рукі...

Моцны з разгону штуршок у спіну, і ў шыю ўпіліся зубы. Толькі б не ўпасці, лапы ў рукі ўгібаць. А-а-а, завішчала? Цяпер перакінуць цераз сябе, азадкам аб пень. Вот так, няхай енчыць, можа, не ўсхопіцца больш даганяць?

Лес быў сухі, з высокім куп'ём. Здалёку даносілася аўтаматная траскатня. Значыць, не бягуць, можна азірнуцца. Гэтыя двое, што беглі за аўчаркай, прыпыніліся каля яе. Ратуюць сабаку. Гэта добра, а ён тым часам — далей. Трэба, каб яны згубілі яго з вачэй. Тады можна будзе спакайней бегчы.

Усярэдзіне ўсё гарэла агнём. Зацяганая брудная сарочка была мокрая, хоць выкруці. Распірала грудзі ад знямогі здыхацца. Далей пайшло ўверх. Стаяў рэдкі і гонкі сасняк. Пад нагамі патрэсквала насохлая кастра. Быццам цішыня наступіла ці гэта толькі здаецца? Андрэй прыпыніўся, каб прыслухацца. Ціха, толькі сэрца ледзь не вырывалася з грудзей. Няўжо ўсё скончылася? Перабілі? Не, яшчэ як быццам пастрэльваюць. Толькі вельмі ж далёка. Можа, у пасёлку разбой вядуць?

Гадзіны са дзве Андрэй плёўся па лесе. Сілы яго пакідалі. Жаданне спаць перамагала ўсе болі і ўсе страхі, нават голад адступіўся назад. Каб упаў цяпер, то на трое сутак, каменем бы ляжаў.

Бор ішоў угору і цямнеў, гусцеў і шырыўся, здавалася, не было яму канца. Андрэй плёўся наманы, не ведаючы, куды і што, абы далей, абы глыбей у лес, спатыкаўся на карэнне, на пенчукі, хапаўся за ствалы сосен, цёплыя ад сонца і лясное духаты.

Узбіўся на круговіну з высозным зеллем, заблытаўся на самую сярэдзіну, упаў і... праваліўся.

Як праз сон пачуў нечую гаворку. Па галасах пазнаваліся жанчына з дзяўчынкай. Можна галаву падняць. Суніцы збіраюць. Як так зрабіць, каб яны пачулі яго і не перапалохаліся? Хіба застагнаць? Ад раненага жанчына не ўцячэ. І Шэмет застагнаў, цяжка задыхаў. Гаворка заціхла. Ён яшчэ застагнаў і расплюшчыў вочы. Каля яго на каленках, нахіліўшыся, стаяла маладая жанчына, а ў двух кроках за ёй — дзяўчынка, маленькая, гадоў на шэсць. У абоіх вялікія перапалоханыя вочы не дзівіліся, а пыталіся, як памагчы.

— Больш тут нікога? — ледзь-ледзь сабраў сілы, каб запытаць.

Жанчына пакруціла галавою. Нешта азадачвала яе і перашкаджала адразу ўзяцца заклапатаць. У яе вачах, як у люстры, ён убачыў сябе: мабыць, ён быў вельмі ж страшны. Трэба растлумачыць ёй, чаму ён такі страшны.

— Я ўвесь паранены. Піць мне.

Жанчына абярнулася да дзяўчынкі, што побач на каленках стаяла і не дыхала:

— Малака барзджэй, хлеба.

Дзяўчынка, як зайчык, без слова шмыгнула з зелля.

— Паспрабую ратаваць цябе. — Андрэй ласкава дакрануўся рукою да яе рукі. — Учора прыязджалі. Па ўсяму пасёлку шукалі парванага аўчаркай чалавека. Шчасце маеш, не ўзбіліся. — У жанчыны з вачэй капацелі слёзы. — Ноччу забяру цябе адсюль. Повідну няможна, навядуць. Усякія людзі ёсць.

Андрэй злавіў яе руку, к губам прыцягнуў, пачаў цалаваць. Жанчына падставіла яму кошык з ягадамі.

— Паеш, — і сама ўзяла ў чорныя пальцы ягадзіну і ўклала яму ў рот. — Паляжы, можа, сюды больш не прыйдуць. Недзе па другіх пасёлках шукаюць.

Суніцы былі пахучыя, спелыя, у роце і раставалі. Жанчына выпрастала прымятае зелле і адышла.

Над галавою, у бялява-блакітным гарачым небе, непрытомна пахіставаючыся, шумелі вяршынямі сосны. І трошачкі нават прыемна было чыгуннай галаве ад гэтага плаўнага руху. Калі б сосны спыніліся, то ён бы не вытрымаў болю. Вой як цвёрда было галаве! Ад сухаты ламала горла. Не, ён не здольны падняць галавы, ён нават не здольвае растуліць павекі. А з заплюшчанымі вачамі... Усё круцілася, нават зямля павольна паварочвалася вакол яго. Каб не скаціцца некуды ўніз, калі зямля лажылася на бок, ён хапаўся за зелле.

— Дзядзя! Дзядзя!

Ён чуе гэты кволенькі і чысценькі галасочак, але ён, здаецца, не можа паварушыць губамі, быццам іх нехта дротам перашыў. Дзяўчынка стаяла паміж былінак роўненькая з імі і худзенькая, як сама былінка. Павекі стопудовымі гірамі цягнула апасці, і ён больш не здольваў іх утрымаць. Наступіла чарната, поўная чарната, нават праз павекі не працэджвалася гарачае сонца. Затое яно лезла некуды ўсярэдзіну, сушыла ў грудзях.

У гэтыя апошнія хвіліны, калі памяць ужо затуманьвалася, ён пачуў: да яго нерухомых вуснаў дакранулася халодная металічная пасудзіна, і з яе пырснула ў рот нешта вадкае. З болем, але глынуў. І яшчэ раз глынуў. Нечая рука ліпа, а ён глытаў, глытаў. У Андрэя паступова праходзіла абмарачэнне, ён ужо адчуў рукі і ногі, і ўжо зусім, як быццам, стала добра, нават сосны перасталі так моцна гойдацца і шумець. Ужо ён добра бачыў: жанчына, укленчыўшы, сядзела каля саменькага і глядзела яму ў вочы:

— Глыні яшчэ з разок, напіся малачка, палягчэе.

Андрэй добра чуў гэтыя словы чалавека, які хацеў яму толькі дабра, і ён яшчэ і яшчэ глынуў, раз яна прасіла.

— Ну, як табе? Лепш не стала?

— Стала, дарагая мая, стала лепш. Сонца мяне мучыць, горача.

— Дык сонца ж няма тут, даражэнькі. Гэта гарачка ў цябе. Скора гарачыня спадзе, сонца над захадам. Перацярпі да цямна. Я не хачу, каб цябе хто бачыў.

Дала сальца з хлебам укусіць. Якое яно смачнае, гэта сальца. Кволячыся, жаваў: галава расколвалася, шыі нельга было павярнуць.

— Думаў, што ўжо канец, калі аўчарку напусцілі. — Цяпер толькі агледзеўся: усе рукі былі пакусаныя, усё ў крыві было, у чорнай, запечанай.

— Прыйдзем у хату — я цябе агледжу, абмыю і балячкі твае паперавязваю. Глядзець на цябе страшна, гэтакі ты ўвесь скрываўлены. За што яны цябе так?

— За што? — Андрэй зрабіў доўгую паўзу, укусіў хлеба, глынуў малака. — За тое, што камуніст. За тое, што не гнуся. Вялі расстрэльваць. З-пад куль уцёк.

— То, можа, трэба было трошкі і сагнуцца, абы мінула ліха? Свайго парадку не ўстановіш.

— О-о-о, яны гэтага толькі і хочуць, сагніся, абплюй тое, у што ты верыш — яны табе ўсё даруюць, нават тое, што ты быў камуністам, па галоўцы пагладзяць і запішуць у першаразрадныя рабочыя аслы. А я не хачу быць аблашчанай скацінай, я хачу быць свабодным рабочым чалавекам.

На золаку ліпеньскага дня — барані божа, каб хто бачыў — Насця вывела Андрэя з хаты. Не сказала — ідзі ўжо, сама аж у саменькі лес завяла. Паперадзе ішоў ён, высокі, худы, у сялянскім адзенні, з касільнам і торбачкаю за плячамі, за ім — яна, ледзь патрапляючы ў след. Прайшлі моўчкі і да лесу і па лесе. Нарэшце Андрэй спыніўся.

— Хопіць ужо табе, — сказаў і абняў Насцю за плечы, абцалаваў яе. Такога ён чалавека сустрэў на сваёй пакутнай дарозе. Насця ціснулася да Андрэевых грудзей і плакала.

— Адненькі тыдзень пабыў, а я і прывыкла, ужо і разлучацца цяжка.—Узяла за руку і яшчэ правяла. Гэтакі лес, гэтакая дабрыня, гэтак усё спявае ў ім. А ці бачаць, ці чуюць яны ўсё гэта? — Тут валежына недзе тоўстая была. Трэба пасядзець на дарогу.

Акно было завешана коўдраю, і агонь у лямпе ледзь хліпаў. Недзе пад гадзіну пачулася, як бы хто на ганак ступіў. Ніна падняла агонь і прыслухалася. Лёвачка таксама не дыхаў, і вочы па яблыку зрабіліся. Яны абое глядзелі на дзверы, якія ото павінны былі адчыніцца.

Увайшоў Мацвей. Лёвачкаў твар павесялеў: нічога благога не будзе, раз дзядзька Мацвей прыйшоў. А за ім? А за ім увайшоў яшчэ адзін Мацвей. Аброслы, спакутаваны, у старэнькай свіце. Лёвачка не адрываў вачэй ад гэтага чалавека, пачаў скурчвацца, нібы баючыся, што гэты, другі Мацвей, прыйшоў зрабіць ім нешта вельмі благое. Ён на адзін момант перавёў вочы на маму. Тая стаяла, пахіліўшы ўніз галаву, і з яе вачэй капацелі слёзы. Лёвачка наблізіўся да мамы, абняў яе і, не адрываючыся вачамі ад чалавека, які павінен быць яго татам, паказаў, што ён пры любых акалічнасцях абароніць сваю маму. Не, не можа быць, каб гэты чалавек быў яго татам. Ён зусім не падобен на яго, які вымаляваўся ва ўяўленні праз усе яго свядомыя гады.

Хвіліна маўчання зацягвалася, і Мацвей вырашыў сам парушыць яе:

— Сустракайце, чаго ж вы?

Ніна падняла вочы на Андрэя, сустрэлася з ім позіркам і, быццам папрасіўшы дазволу, скранулася. Ён не даў ступіць ёй гэтыя два крокі, сам наблізіўся, каб абняць, а яна палажыла яму галаву на грудзі і затрэслася ў плачы. Лёвачка быў на хвіліну забыты, і раўніва з-пад ілба пазіраў на гэтага чалавека і на маму. Чалавек, падобны на дзядзьку Мацвея, быў добры да мамы — значыць, гэта ўсё ж такі тата. І яму хацелася падлезці пад рукі, стаць паміж імі, каб тата абнімаў і яго, і самому абняць іх абоіх. Нарэшце ён адчуў на сваіх плячах вялікую, як у дзядзькі Мацвея, татаву руку.

Мацвей непрыкметна выйшаў на ганак, і цяпер адтуль чуваць быў яго кашаль.

Ужо і мама і тата абнімалі Лёвачку, а ён усё плішчыўся, усё больш падлазіў пад татаву руку.

— Вот які ўжо... Худзенькі, рабенькі. Якога змагла... Не шкадавала сябе, — адчытвалася Ніна, быццам Лёвачка быў сын больш яго, чым яе, і за Лёвачку яна ў большым адказе перад ім. Барані божа, каб ён не падумаў, што Лёвачка ў яе забыты, недагледжаны. — Як магла, — задуменна і тужліва сказала яна.— Пытайся, можа, чым вінавата перад ім, перад тваім сынам. Уцякаў раз, пакідаў мяне, бацьку бег шукаць, значыць крыўдзіла, мачахаю была.

— Няпраўда! — Лёвачка абняў і сціснуў адну толькі маму.

— Ну як жа — няпраўда? Не даганялі мы цябе з Параскаю на машыне? — Лёвачка ціснуў і маўчаў. — Трэба, каб татка ўсё ведаў.

— А мяне ты помніш, сынок? — папытаў Андрэй.

Абое, і Лёвачка і Ніна, закруцілі галовамі.

— З год успамінаў. А потым усё сцерлася. Казкі пра тату-камандзіра, пра тату-капітана на моры засланілі ўспаміны...

Лёвачку Ніна адаслала спаць, сказала, што татка пабудзе з імі і ўсё-ўсё яму раскажа. Разумненькі Лёвачка ведаў, што маме з татам трэба астацца адным, каб шмат аб чым пагаварыць. А заўтра ён будзе ўвесь дзень з ім, тады і распытае ўсё. А цяпер будзе спаць, накрыецца з галавою і будзе спаць. Каб хутчэй дачакацца той хвіліны, калі зноў яму можна будзе быць з татам, ён павінен заснуць. Калі чалавек спіць, то ноч праходзіць за адно імгненне. Заўтра ён будзе гаварыць з татам, ён запытае, чаму яго недзе так доўга трымалі, чаму дарослыя прыдумваюць сабе ўсякія такія справы, з-за якіх яны потым доўга пакутуюць. Мама кажа, што каб ва ўсім гэтым умець разабрацца, трэба стаць дарослым і многа ведаць. А калі ён стане дарослым? Праз дзесяць гадоў? Калі яму будзе дваццаць? Не, ён столькі не можа чакаць, ён хоча...

Навокал, можа, на тысячу кіламетраў — белы, са сліпучымі іскрынкамі снег. І толькі на кругавідзе чарнела постаць нейкага карабля. Потым яны з татам — а можа, гэта быў і не тата — селі на сані і паехалі на сабаках. Чорны карабель на вачах рос з глыбінь белага снегу. Іх на караблі сустрэлі паморы ў высозных, за калені, унтах, і з імі Ота Юльевіч Шміт. Потым Ота Юльевіч падышоў да яго, узяў за руку і павёў. А Ота Юльевіч — гэта не Ота Юльевіч, а яго тата, пераапрануты яго тата. Яны доўга ішлі паміж казачных ледзяных гор. Потым ім трэба было перайсці праз вялікае, ахінутае змрокам снежнае поле, на якім злавесна вылі ваўкі. Было вельмі страшна. Ён не разумеў, навошта тату ісці праз гэта жудаснае поле, а не астацца на караблі? Яны ўжо былі сярод гэтага поля, вакол вылі ваўкі, і толькі ў адным напрамку нешта ружавела на кругавідзе. Тата трымаў яго за руку і цягнуў хутчэй ісці ў гэтым напрамку, як быццам абавязкова трэба было перайсці гэта вялізнае поле, а не вярнуцца назад на карабель. Снег пасінеў, і стала

амаль зусім цёмна. Ваўкі, павіскваючы, нахабна перабягалі і лажыліся напераздзе ў некалькіх кроках. Адзін воўк не саступаў з дарогі, і тата патупаў на яго нагамі...

Невядома, што б далей было, калі б Лёвачка не прачнуўся. Ён быў вельмі рады, што гэта быў сон і што яму з татам не трэба пераходзіць гэта жудаснае воўчае поле. Лёвачка так і не ведае, ці ўсхапіўся той воўк, каб адбегчы.

Праз шчылінку ў дзвярах кухні цадзілася кволае жоўтае святло і адтуль чутна была рэдкая прыглушаная гамана.

Надышлі апошнія гадзіны апошніх сутак. Ноччу ён павінен будзе пайсці. І надоўга. Можа здарыцца, не гадаючы горшага, што і да канца вайны.

Яна стаяла каля кухоннага століка і праз акно глядзела некуды ў агарод, на шаўкавіцы, што раслі па мяжы, на стары сярод пажоўклага поля дуб — помнік таго, што тут рос некалі магутны дубняк. А ён сядзеў у пакоі над разгорнутай газетай. Не чытаў — гэты нумар старой газеты быў ужо даўно прачытаны, — проста сядзеў, паглыбіўшыся ў самога сябе. Ішло на апошнюю размову пра тое, што мучыла абоіх, што адкладвалася на гэтыя перададыходныя гадзіны. Вельмі ж цяжка было пачынаць яе. Ды і Лёвачка перашкаджаў — не пры ім жа пра гэта гаварыць.

— Сыночак, сёння ноччу татка пакіне нас. Не вядома, калі мы яго зноў убачым. Ідзі развітайся з ім ды пойдзеш спаць да дзядзькі Мацвея.

Лёвачка аж скалануўся, аж затросся ад крыўды:

— Дакуль тата будзе пакідаць нас? Я не пайду! Я хачу з татам!

Ніна абняла яго, абмілавала, абцалавала, сама ледзь здолела вымавіць слова.

— Так трэба, сыночак, ён пойдзе ваяваць. Усе ваююць — і ён пойдзе ваяваць.

Лёвачку трошкі супакоіла тое, што тата пойдзе не куды-небудзь, а ваяваць, што ён будзе там, дзе ўсе таты, дзе ўсе дарослыя мужчыны. І вернецца адразу да іх, як толькі зваююць немцаў.

— Я яшчэ трошкі пабуду, — заплаканымі вачамі ён паглядзеў на маму.

— Ага-ага, пабудзь, міленькі.

Яна неяк раптам вельмі востра адчула, што яна не мае права адбіраць ад яго гэтыя апошнія хвіліны пабыць з татам, якога ён так мала бачыў.

— Пабудзь-пабудзь трошкі, — паўтарыла яна. — А праводзіць не трэба, міленькі. Татка пойдзе, каб ніхто не бачыў. А цяпер ідзі да яго. І не баўся з ім, міленькі. Татку трэба збірацца ў дарогу.

Ніна выбегла, каб не чуць, не бачыць, як будуць развітвацца Андрэй з Лёвачкам. Да Чыкілеўскіх забегла перабыць гэтыя хвіліны. Нешта расказвалі ёй, а яна як не чула, сваё было ў галаве. Андрэй з Аляксандрам і Лёвачка з Веркай стаялі перад вачамі.

Раптам усхапілася. Зноў ёй шкада стала, што не давала дабыць апошнія хвіліны Лёвачку з татам. Можа, яна заспее яшчэ вярнуць сына. А самой можна будзе ў полі пагаварыць. Сядуць у жыце і пагавораць.

Позна адумалася, Лёвачкі ўжо не было, Андрэй адзін стаяў сярод пакоя. Згледзеўшы яе, адвярнуўся, каб схаваць вочы. Ніколі яна не бачыла, каб Андрэй так расчуліўся. Знарок памарудзіла на кухні — нешта не там стаяла, то пераставіла. За гэту хвіліну Андрэй агледзеўся і сеў на канапе. Яна ўвайшла і падсела блізенька да яго. Як мала было гэтых хвілін, каб вот гэтак, блізенька! Андрэй узяў яе натруджаныя маленькія рукі, сціснуў у сваіх мулкіх далонях і прылажыўся да іх ілбом. Гаворка не ўзнікала, маўчалі. Чуваць было — усходжваўся і пачынаў гарцаць па гары вецер. Ніна прыслухалася.

— Надвор'е мяняецца. Каб дождж не сабраўся.

Андрэй усё роўна маўчаў. Што гэты дождж? Ён адгадаваў на сабе такую скуру, што нічога да яе не прыстане. За сваё не такое ўжо і вялікае жыццё і намокся і накісся.

— Табе хоць добра з ім? — выціснуў нарэшце з сябе Андрэй.

Ніна часценька заківала галавою. Потым дадала словамі:

—Добра, Андрушачка.

— Ён цябе любіць?

Яна зноў часценька заківала і ўжо з плачам у голасе дадала:

— Любіць. І Лёвачку любіць.— Апошняе сказала, ведаючы, што Андрэй не папытае, а яму ж хочацца ведаць і пра Лёвачку.

Пытаўся Андрэй і сам разумеў, што ўсё гэта цяпер, на пачатку вайны пазбаўлена ўсякага сэнсу. Але і не папытаць як быццам нельга было.

— Спачатку думаў не заходзіць, каб не вярэдзіць душы ні табе, ні сабе. А потым...

— Ну як гэта?

— Можа, і лепш было б, каб на гэты час вы нічога не ведалі пра мяне, і не здолеў. Вельмі ж хацелася зірнуць на вас, як вы тут. Думалася, пабачу — лягчэй будзе на душы. А лягчэй не стала.

Ніна адышла да Верачкі, над ложачкам глыбока ўздыхнула, закусіла верхнюю губку.

— Даруй мне, Ніначка гэту сентыментальнасць. Не гэтай парою дапускаць такое слюнцяйства. Усё. Маё месца — там. Лёвачка непакоіць: каб не помсцілі за мяне. Можа, давядзецца забраць.

— Як жа я без Лёвачкі буду?

Андрэй паківаў галавою:

— А што зробіш? Каб лягчэй — няма ніякага спосабу. Мацвея трымайцеся. Сам буду мець на воку.

Ніна не скранаалася, яе не задавальнялі гэтыя Андрэевы словы, у яе нешта сваё было да яго.

— Сам аставайся! Хіба ты не маеш на гэта права? І немцы чапаць цябе не будуць. Вот табе і спосаб!

Па Андрэевым твары спачатку прабегла здзіўленне, потым роспачна-тужлівая ўсмешка.

— Табе было вельмі цяжка, я разумею.

Андрэй устаў, моўчкі падышоў да акна, пратуліў фіранку і паглядзеў на вуліцу. Ціха, быццам і вайны няма на свеце. Акупанты тут бываюць наскокам. Во тады шум і гам, страляніна, што-небудзь гарыць. А так—людзі больш па агародах ды па загуменні нароўяць хадзіць, каб абы-чаго не вытыкацца. Па вуліцы ўсяго і людзей, што Ясік-паліцай прасунецца або старасста пройдзе на работу наказаць.

— Кажаш, Ціток Сядура вярнуўся?

Андрэй паглядзеў на Ніну, і яна моўчкі кіўнула галавою.

— А вот і не дрэнны чалавек да людзей. Калі што, то і падкажа.

— Жывучая, свалата.

Андрэй ніяк не мог успомніць аблічча Цітковa: усё ўяўляў, як ногі, так рукі, абшмэрганы на калочку кажушок, а твар не ўспамінаўся — усё Гаварушка лез на Цітковы плечы, усё той вышчэрваў свае самураеўскія зубішчы.

— Гэта не спосаб, Ніначка. — Андрэй падышоў да яе і абняў за плечы. — Я разумею, табе было цяжка, а будзе і яшчэ цяжэй, але гэта не спосаб. Не, я не маю права на такі спосаб. Ён не для мяне. Гэта самагубства. Калі ісці на гэта, то лепш у яго чыстым выглядзе. — Ён пальцам паказаў пятлю на шыі.

— Я так і ведала, ты і з адбітымі рукамі ваяваць будзеш.

— Буду, Ніначка, буду і з адбітымі і зусім без рук.

— Безнадзейны фанатык!

— І не фанатык. Які ж я фанатык? Я проста не магу суіснаваць з разбойнікам у сваёй хаце, не магу. І кожны, хто паважае ў сабе чалавека, зрабіў бы тое самае. Да такога суіснавання прывыкнуць нельга. І не важна, што яны мяне чапаць не будуць. Аднаго «не чапаць» мне мала. Я не траваядная жывёліна, якая здольна сцярпець усё. Больш за ўсё ў чалавеку я ненавіджу вот гэтага «сцярпець». Гэта псіхалогія раба, бязмоўнай скаціны! А ў чалавеку я хачу бачыць чалавека, істоту гордую і свабодную.

— Які ты быў, такі і астаўся.

— Гэта вельмі дрэнна?

— Твае людзі яшчэ не нарадзіліся.

— Няпраўда, Ніначка, будзь больш уважлівай і ты заўважыш іх. Яны ёсць. Іх многа-многа. Ды і нехта ж іх павінен нарадзіць? Я і не задаюся мэтай нарадзіць нейкае такое новае грамадства, я проста хачу быць ахайным, каб ад мяне не несла ідэалагічным смуродам. І толькі. А табе гэта здаецца бог ведае якім фанатызмам.

Позненька Ніна павячэрала з Андрэем, як некалі, калі Лёвачка быў яшчэ зусім маленькі і калі яна, не могучы заснуць, чакала. А ён кожны дзень прыходзіў позна — канца і краю не было райкомаўскай рабоце. Кожны вечар ён каго-небудзь прыводзіў начаваць. Як падумаць цяпер, і клопатна было і нечым утульна. А можа, мінулае заўсёды крышачку падфарбоўваецца ў памяці?

Андрэй зноў пераадзеўся ў Мацвеева. На зэдліку чакала яго прыгатаваная вялікая торба. З дзвюх буханак Андрэй узяў акраец, як разоў на тры з'есці, і з кавалка сала адрэзаў драбок грамаў на трыста. У касца не павінна быць вялікай торбы, касец ідзе рабіць на гаспадароў хлеб.

Патушыўшы лямпу, каб ніякага бляску не было на загумень, дзе мог хто-небудзь сунуцца, Ніна выпусціла Андрэя. Няхай сабе падумаюць, хто ўбачыць, што Мацвей позненька выйшаў ад Ніны. Гэта яна перажыве. Пастаяла ў прачыненых дзвярах. З надворку пацягнула вільгаццю: не заўважылі, як прайшоў дожджык. Мокрыя маснічыны гулка аддаліся пад Андрэевымі нагамі, зашоргаў прыбіты пясок. Ніне здавалася, што яна бачыць у начной чарнаце, як постаць прайшла пад вароты, потым павярнула ўлева, каб абысці стайню і Вярыгавых агарод.

«Каб у глінішчы поцемку не ўсунуўся».

Постаці ўжо даўно ў вачах не было, а Ніна ўсё стаяла. Потым ціхенька прыціснула дзверы і ўзяла на крукі, на ніжні і верхні. Цяпер ва ўсіх дзверы зачыняліся на завалы, запоры і крукі. Была адышла і раптам ёй здалося, што Андрэй назад пастукаўся. Можа, нельга ісці? Падбегла:

— Хто?

З надворку нешта віскнула, і пачулася лёгкая тупаніна. Ніна ўгадала Чыкілеўскіх сучку.

— Вон пайшла, каб ты здохла! Дагледзела.

У пушчы пачало паказваць на раніцу: патухлі зоры, стала здорава, і на марачанскім плёсе заканозілі драчы. Успомнілася дзяцінства. Эх бы ён цяпер, скінуўшы чаравікі, прабег босы ўздоўж Марачанкі! Тут яшчэ дзед пачынаў пратоптваць сцежку. Крывая яна была, віхлястая. Метраў сто ад яе, насупраць самай лукі — месца іхняй лесніччоўкі. Хаты ўжо, вядома, не было, з першых немцаў — як спалілі, ніхто больш і не ставіў яе, але месца нечым цягнула да сябе. Усміхнуўся, прайшоў некалькі крокаў і рэзка павярнуў на Марачанку. Усё ж павярнуў. Хто не мае слабасці да месца свайго дзяцінства? Гэта быў той рэдкі выпадак, калі ён не здольваў звалодаць з сабою. Калі яшчэ здарыцца быць тут? Захацелася, непераадольна захацелася пакланіцца, можа, апошні раз, гэтаму куточку зямлі.

Свежа, свежа на Марачанцы, дымок з вады ўстае, маляўка мошку хапае і... лютуюць драчы. Адзін блізенька, зусім блізенька, ці не да рэчкі бярэ кірунак, напіцца захацелася. Дожджык толькі пакапаў, сухенька. Другі — воддалек. Быццам перагаворваюцца, за вяровачку трымаюцца адзін з адным.

А сцежачкі то і няма, густым трыпутнікам зарасла сцежачка, няма цяпер каму яе пратоптваць.

А вот і былая шэметаўская палянка. Некалі сюды гэтак падышоў дзед яго, Ілья, выцягнуў з-за пояса сякеру, зрабіў залысіну на панадрэчнай хваіне і сказаў: «Тут буду жыць». І жыў. Кавалак зямлі сабе выплентаваў, хатку са сляпымі акенцамі паставіў, сына нарадзіў...

Палянкі то ніякай ужо не было, па ўсёй палянцы сасняк пайшоў. Гадоў па дваццаць сасёнкі, гэта з тых дзён, як не хадзілася тут, як у Некрашы перасяліліся. Вот яно, кола гісторыі. Праз пяцьдзесят год тут будзе стаяць бор — і ніякай памяці.

Нейкім забытым, нікому не патрэбным паказаўся ў гэту хвіліну лес. Мёртва было ў ім, ён здаваўся лесам на абязлюдзелай планеце. Андрэй раптам адчуў нейкі непераадольна балючы сум па гэтым жывасілам спыненым жыцці.

— Хопіць!—Андрэй аж уголас прамовіў сам сабе і рашуча адарваўся ад гэтых думак.—К чорту! Трэба жыць адным, толькі адным! Кожны твой крок павінен адзывацца болем у ворага! Не слюнцявіцца і не хавацца ў нару—слюнцяі і баязліўцы ніколі не перамагалі!

Ён ужо жвавым крокам ішоў па лесе з баравіны ў лажок, з лажка на баравіну, цураючыся палян, унікаючы сустрэч з людзьмі. Тут мог праходзіць і знаёмы некрашовец. Не столькі Андрэя пазнаў бы ў ім, колькі Мацвея. Мацвей не Мацвей, а нехта вельмі ж падобны. Хто ж гэта такі мог ісці вельмі падобны на Мацвея з Некрашоў? Пойдуць здагадкі і ўсё такое. Лепш да гэтага не даводзіць.

Ён доўга яшчэ будзе вот гэтак хадзіць, дарога ў яго даўжэзная. Але ад гэтага хаджэння ў ворага і волас не ўпадзе з галавы. А як пачаць, каб сёння, каб зараз жа? Барацьбу няможна адкладваць на заўтра. Гэта ўжо будзе не барацьба.

Андрэй падыходзіў да таго месца ў пушчы, дзе было найбліжэй да Малое Бурдзілаўкі. Гэту вёску ён добра помніў па тых гадах, калі працаваў сакратаром райкома на Устроні. Тут у калгасе быў старшыня-арыгінал, Журавінка, цёмная і несімпатычная асоба. Дзе ён цяпер? Ну, шукаць яго Андрэй не будзе — не з такімі за падполле брацца. Ён пойдзе шукаць Бадытчыка, Рубчэню... У яго тут многа знаёмых надзейных людзей.

Каля Малое Бурдзілаўкі лес канчаецца, пачынаецца бязлесная мясціна аж да самай Устроні і кіламетраў з трыццаць за ёю. Яшчэ помнілася Андрэю — недалёка ад краю лесу праходзіла гравійка, у адзін бок яна вяла на Букчу, Устронь, а ў другі—пад старую граніцу. На ёй цяпер мог быць рух машын, і перайсці яе будзе нялёгка, асабліва днём. Але ж і ночы чакаць Андрэй не збіраўся.

На колькі можна будзе, ён падыдзе да дарогі, а там агледзіцца і пяройдзе. Праверы[1], ці ж «лімонка» пры поясе, можа, спатрэбіцца ўхапіць, то каб латва было. Адкуль «лімонка»? Мацвей узычыў — паказаў, што і ён нешта збіраецца габіць.

Нарэшце пачулася і дарога. Тут можна было б і прысесці, касу запрэгчы. Іржавая наліхенька. З такою касою, калі хто ведае, то і папасціся можна. Хоць аб пясок трохі пабяліць ды касянуць разоў са сто, каб якая травяная наедзь асталася на сталі.

Андрэй падняўся ісці. Дарога была ўжо добра чутна, машыны ішлі адна за адною з невялікімі інтэрваламі. Напэўна, перамяшчалася сваім ходам якая-небудзь часць.

Пакуль дарога не праступала праз сцяну сасняку, можна было ісці, выбіраючы, дзе гусцейшы лес—асцярога яшчэ нікому не нашкодзіла.

Наперадзе высвеціла сонечная мясціна, ягадная лапінка. Ладная такая лапінка. А за ёю метраў праз сто ўжо чулася і дарога. І не толькі чулася, а і відна была, праблісквала.

Але што ж гэта? На дарозе як быццам нямецкі зольдат? Ён. Ей жа богу, ён. У касцы, з аўтаматам. Ён. Са сцяжком. Вот яно як, узбіўся штонінаёсць на саменькіх, на жывых. Андрэй, як паляўнічы сабака, згледзеўшы дзічыну, замёр на месцы. Адзін ён тут, сярод лесу, не можа быць. Трэба добра разгледзецца, каб не ступіць нагою ў гадзючае гняздо. Ну так і ёсць, на абочыне стаіць грузавік. А на ім, на грузавіку? А на ім, здаецца, нікога няма. Распаўзліся па лесе? З-за гудзення машын нічога не было чуваць. Ці быў покрык? Можа, нават і быў? Андрэй пачаў прыглядацца вакол сябе. Божа, дык вот жа яны, у глыбокім буячніку, толькі зады тырчаць. Першае, што адразу захацелася зрабіць, то гэта апусціцца на калені і быццам самому браць ягады. А цяпер адпаўзці. Але куды? Яны кругом. Справа, здаецца, толькі адзін і там блізка гушчар. Паспрабаваць паўзці на яго? Іх тут многа, яны спакойныя, яшчэ не пужаныя. Калі падыме галаву—наваліцца і задушыць, калі не падыме—тое самае. На ўсякі выпадак намацаць «лімонку». Голай рукою не зваліш, трэба што-небудзь у руку. Нож таксама не падыходзіць: падыме крык, пакуль прырэжаш. Галоўнае — як можна бліжэй падпаўзці. Спяшацца не трэба, няможна хоць чым-небудзь парушыць цішыню: досыць аднаму падняць галаву, як усе хопяцца за аўтаматы. І тады ўсё. Нішто не выратуе.

Назначаны аўтаматчык зусім блізенька, крокаў за пяць, у самай сярэдзіне куста, з лісцем абдзірае ягады ў каску і нешта сам сабе мармыча пад нос. Спакойна, Шэмет. Сарві і ты ягадку і ў рот пакладзі, для спакою. Вот так. А цяпер можаш яшчэ падпаўзці крок.

— Feine Beeren hier, nicht?[1],—выразна вымаўляе немец.

Вот яшчэ чаго не ўлічыў. Значыць, немец чуе яго падпаўзанне і прымае за свайго суродзіча. Што б ні было, а трэба адказваць.

— Ja-Ja[2], — працягла і не сваім голасам вымаўляе Шэмет.

Немец галавы не падымае, спакойна абцірае ягады.

— Mensch, guck mal. Sie sind hier wie Sand am Meeresstrand gestreut[3].

— Іа-а-а,—тым жа не сваім голасам, але ўжо спакайней адзываецца Шэмет і яшчэ бліжэй падпаўзае да салдата. Трэба быць як можна бліжэй. Той яшчэ можа што-небудзь запытаць, і ён не здолее яму адказаць. Але і не спяшайся, спакайней. Прытрымай сябе. Усё наўкруга спакойна. Важна, каб нічым не выклікаць ніякай непатрэбнай насцярогі.

Ужо аставаўся адзін крок. Ногі яго ў каваных чаравіках—ужо вот яны. Зараз ён абавязкова падыме галаву—яму ж трэба ўведаць, хто да яго падпаўзае, Ганс ці Фрыц. Ён падыме галаву, каб проста здзівіцца—хіба мала кустоў, што канечна сюды. Не, яму не шкода, гэта проста маленькае здзіўленне.

Відаць, ад нейкага перанапружання Шэмет на адно імгненне страціў увагу і прапусціў той момант, калі немец разагнуўся і павярнуў у яго бок галаву. Вочы былі поўныя жаху. У стане шоку ён толькі і здолеў, што падняць руку, каб сустрэць удар пасечанай, рубцаватай «лімонкі». Ні гуку не прамовіў немец і ткнуўся носам у ягаднік. Каля яго прылёг і Шэмет, каб садраць аўтамат.

Усё ціха, ніякай трывогі. Няхай так і будзе. Цяпер паўзком за кусты, за дрэвы і давай бог ногі з гэтага месца. Пакуль не хапіліся, трэба ўбок, у глыб лесу.

---

[1]) Якія цудоўныя ягады а?
[2]) Ага.
[3]) Паглядзі, тут жа процьма ягад.

АДВАЯВАНЫ КАРАВАЙ

Разам з механізатарамі рыхтавалася выехаць на збожжавыя палеткі здымачная група беларускай кінастудыі. На аб'яднанні «Летапіс» запланавалі стужку пра жніво-77. Відаць, і назвалі б яе «Беларускі каравей-77», але...

Прэм'ера дакументальнага фільма Б. Сарахатунава, А. Алая і В. Купрыянава прайшла па тэлебачанні. Шчыльна «забяспечаны» інфармацыяй дыктарскі тэкст, напружаны відэарад — і 20 мінут ля экрана здаліся гадзінай! А ўвогуле разам з аўтарамі мы перажылі суровыя дні і ночы, калі героі фільма ў цяжкіх метэаўмовах змагаліся за ўраджай. Фільм па-газетнаму графічны, без какетлівага аздаблення «прыгожымі карцінкамі». Па манеры апавядання ён нагадвае публіцыстычны рэпартаж, дзе аб'ектыўная хроніка, аўтарская ўсхваляванасць і дзелавыя разважанні — побач.

Здымкі хмурага неба, палеглай збажыны, раскіслай нівы; «стогн» забуксаванага камбайна і хлюпанне вады пад коламі грузавіка; трывожна-манатоннае гучанне музычнага суправаджэння. Над усім гэтым — цвёрдая, але спакойная інтанацыя дыктара, які паведамляе пра зварот ЦК Кампартыі і ўрада рэспублікі да ўсіх, хто вырошчваў збожжа і павінен быў правесці жніво. Заклік выйграць бітву за ўраджай!

Імклівы мантаж не дазваляе гледачу засяродзіцца на асобных кадрах, падумаць пра мэтазгоднасць уключэння таго ці іншага з іх у фільм. Вярчэнне камбайнавага метавіла; збожжавы струмень; зерне буйным планам — усё гэта традыцыйныя, але непазбежныя прыёмы ў вырашэнні падобнай тэмы. Толькі не трэба злоўжываць імі: замест вобразнай дэталі яны ператвараюцца ў кінематаграфічны штамп. Затое як «працуюць» дэталі, падгледжаныя менавіта на тым жніве! Завіхаюцца на пакосе жанчыны; адбівае касу калгаснік; нехта ў прапацелым пінжаку спрытна «махае» вілами — хутчэй, хутчэй! Знявечаная — у шрамах і лужынах — зямля; раней надзейная, а тут — бездапаможная тэхніка; заклапочаныя, амаль пакутлівыя твары людзей... Поспехі, віншаванні прама ў полі. Перамога!

«Удзень і ўначы» (назва фільма) — не рытарычнае захапленне мужнасцю хлебаробаў. Тут зафіксаваны пэўны земляробчы вопыт. Апісаны і паказаны ў дзеянні прыстасаванні да камбайнаў, вынайдзеныя і скарыстаныя ў перадавых гаспадарках рэспублікі. Падрабязна і пераканальна расказана пра пераможны шлях экіпажа знатнага камбайнера, Героя Сацыялістычнай Працы Георгія Катлярова да запаветнага тысячнага рубяжа. Зрэшты, фільм больш за ўсё тым і каштоўны, што ён — пра чалавека, вось пра такіх герояў сельскагаспадарчага фронту. Патрэбны ён як удзячнасць таму, хто выратаваў наш сёлетні хлеб; патрэбны ўсім нам— каб ведалі і памяталі цану гэтаму хлебу.

Хораша і проста заканчваецца стужка. Буйны план поўнага зернем кузава супастаўляецца з панарамай апусцелага поля бітвы, нібыта параненага разрывамі артылерыйскіх снарадаў. Раптам — трактар, «запрэжаны» ў плуг. Аддаляецца ад камеры, пакідаючы за сабою баразну. Першую баразну пад ураджай новага года.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

ТОЛЬКІ ДВА КІЛАМЕТРЫ



...Упершыню па кінастудыю «Беларусьфільм» Валодзю прывёў бацька — вядомы беларускі дакументаліст Уладзімір Паўлавіч Цяслюк, адзін з тых майстроў, што стаялі ля вытокаў беларускага дакументальнага кіно. Як і бацька, ён спачатку ўзяўся за кінакамеру, зняў некалькі дзесяткаў фільмаў. Першыя ж стужкі паказалі, што Уладзімір Цяслюк-малодшы шукае свой погляд на жыццё, імкнецца быць не халодным рэгістратарам падзей, якія праходзяць перад камерай, а іх удзельнікам.

Вынік яго аператарскага майстэрства — такія фільмы, як «Птушка Ікс» і «Вялікая дыяганаль». Першы з іх Цяслюк здымаў, будучы студэнтам 3-га курса інстытута кінематаграфіі, і ўжо тады атрымаў два прызы ЦК ВЛКСМ. У 1972 годзе «Птушка Ікс» заняла 1-е месца на рэспубліканскім конкурсе і стала лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю савецкай моладзі, а таксама атрымала галоўны прыз фестывалю ў Тэгеране «Залаты Дэльфан». Першае месца заняў на Усесаюзным фестывалі спартыўных фільмаў у 1976 годзе, а пазней быў удастоены прыза «Сідалк» у Лондане і Будапешце фільм «Вялікая дыяганаль».

А чым было выклікана імкненне Уладзіміра Цеслюка прыйсці ў рэжысуру? На гэтае пытанне ён адказвае так:

— Мне здаецца, кожны мастак пастаянна адчувае патрэбу як мага больш поўна выявіць сваю творчую пазіцыю. Як рэжысёр, я маю большую ініцыятыву ў выбары тэмы, у распрацоўцы цікавых для мяне праблем. І пры гэтым у мяне ёсць магчымасць самастойна ажыццявіць цэласную задуму будучай стужкі, як гэта было, напрыклад, у маім апошнім фільме «Толькі два кіламетры»...

У дні, калі завяршаліся здымкі гэтай дакументальнай работы, мы сустрэліся з Уладзімірам Цеслюком. Я даведалася, што на долю здымачнай групы выпала задача не з лёгкіх. Трэба было адлюстраваць не толькі сам па сабе унікальны факт — транспарціроўку па сушы незвычайнага грузу ў форме сталёвай цыгары даўжынёй у 45 метраў і вагою ў 240 тон, але і ўсебакова паказаць, як паводзяць сябе людзі, занятыя ў гэтай складанай аперацыі. Тыя, каму ўжо давялося паглядзець стужку, высока ацанілі працу яе стваральнікаў (аўтар сцэнарыя — Ігар Касюкоў, рэжысёр-аператар — Уладзімір Цяслюк). Тым больш, што здымалася яна 19 дзён замест 31 запланаванага.

Уладзімір Цяслюк расказвае пра новую работу:

— Мы даведаліся, што ў канцы мая 1977 года прыбывае ў Гродна для азотнатукавага прадпрыемства буйнагабарытны груз. Здымачная група выехала на месца падзеі. Радасна было сустрэцца з нашымі сучаснікамі, самаадданымі, гатовымі на подзвіг людзьмі. У дадзеным выпадку — на подзвіг працоўны. Яны варты таго, каб пра іх ведалі сёння, каб іх памяталі заўтра.

Тэма сучаснасці, чалавек з яго светаадчуваннем, яго імкненнямі, яго думкамі і клопатам пра будучае — галоўны напрамак творчасці Уладзіміра Цеслюка — праходзіць і праз фільм «Толькі два кіламетры».

М. КАРНІЦКАЯ.

Кадр з фільма «Толькі два кіламетры».

ДОЎГА КАЗКА РАСКАЗВАЕЦЦА...

Пасля прэм'еры тэлефільма «Пра Чырвоную Шапачку», якая адбылася ў Доме кіно, трохгадовы глядач, пакуль маці апранала яго, пытаўся: «Мама, ты мне купіш Чырвоную Шапачку?» Я не пачула працягу размовы, але, відаць, чымсьці яму спадабалася дзяўчынка з казкі, якую расказала кіназдымачная група студыі «Беларусьфільм»—рэжысёр-пастаноўшчык Л. Нячаеў, аператар-пастаноўшчык Ю. Ялхоў, мастак І. Тапілін, кампазітар А. Рыбнікаў.

Што ж прывабіла трохгадовага малога ў новай кінаказцы, а разам з ім мяне, дарослага гледача?

Вабіць перш за ўсё сама сустрэча з Чырвонай Шапачкай — праз год пасля знаёмых нам падзей, што адбыліся ў старым лесе. За гэты час шмат што змянілася. Лес парадзеў, і ваўкоў у ім засталося зусім мала, ды і не такія ўжо лютыя ваўкі, як той, што летась праглынуў Бабулю і Чырвоную Шапачку. У самой дзяўчынкі з'явіліся новыя знаёмыя. Але па-ранейшаму прыхворвае іншы раз бабуля, якую па-ранейшаму праведвае добрая, вясёлая, знаходлівая Чырвоная Шапачка. Яе падпільноўваюць новыя небяспечныя прыгоды ў лесе, а разам з тым—і цікавыя сустрэчы.

Пазнаць — і не пазнаць нашу знаёмую дзяўчынку. Вось яна бясстрашна крочыць па лесе: чуваць яе вясёлая дарожная песенька. Але вось яна, пачуўшы падазроныя гукі, збочвае, каб паглядзець, чым займаецца яе стары сябра Звяздар, які ў гэты час павінен моцна спаць. А як яна хораша танцуе ў лузе, сярод чырвоных макаў! Як горача пераконвае дзіця ў тым, што кожны павінен рабіць усё сам. Яна такая самастойная, разумная дзяўчынка! Дык чаму ж ніяк не пазнае каварнага, хітрага Худога і дабрадушнага Тоўстага—ваўкоў, якія завабілі яе ў лес і не адступаюць ні на крок? Таму што яны ўвесь час пераапранаюцца? Гэтага, на думку аўтараў фільма, дастаткова...

Але ўспомнім ката Базіліо і лісу Алісу з «Прыгод Бураціна», якія ні разу не пераапраналіся за ўвесь фільм, але праявілі шмат знаходлівасці і выдумкі, каб ашукаць драўлянага хлопчыка! Відаць, усё ж такі справа не «ў маскарадзе»: проста ў першым фільме была больш абгрунтаваная драматургічная характарыстыка ўсіх вобразаў, а таксама іх адпаведнае дакладнае выяўленчае рашэнне. Усё ў цэлым (пры ўсёй умоўнасці) стварала імгненную пазнавальнасць персанажаў. Чаго нельга сказаць пра новую стужку. І асабліва гэта праявілася ў такіх важных вобразах, як Худы і Тоўсты. Імкнучыся неяк ліквідаваць пралікі драматургіі вобразаў (сцэнарыст І. Веткіна), рэжысёр «расквечвае» іх. Але яму часам здраджвае пачуццё меры і густу. Паводзіны гэтых двух персанажаў іншы раз разлічаны на зусім непатрабавальнага гледача. А ў выніку цудоўныя акцёры У. Басаў і М. Трафімаў часам выглядаюць даволі непрывабна ці проста вартымі жалю. А ім, як і Чырвонай Шапачцы, адведзена шмат экраннага часу.

Праўда, за гэты час адбываецца так мала падзей, ды і не надта яны ўжо цікавыя. Чамусьці на гэты раз фантазія яўна падвяла драматурга і рэжысёра. Самі дзеці, бывае, больш вынаходліва і ўдала «ўпісваюць» сваіх любімых герояў у сучасныя абставіны.

Запаволены рытм, які прыйшоў з драматургіі ў фільм, не ўдаецца пераадолець. Здаецца, што рэжысёр з аператарам мелі на мэце абвергнуць першую частку выраза казачнікаў: «Хутка казка расказваецца...» Часам яны забываюць, куды і навошта ідзе Чырвоная Шапачка. І шлях яе аказваецца вельмі і вельмі доўгім. Дзяўчынцы даводзіцца прайсці не толькі квітнеючы луг, лес, а і пустыню, пабываць на беразе мора, а потым толькі зноў апынуцца ў лесе.

Міжволі хочацца звярнуцца да іх першага фільма — «Прыгоды Бураціна», які быў вельмі дынамічны, вясёлы, маляўнічы, звонкі, рытмічны. Рух фільма імклівы, лёгкі, часам здавалася, што героі ледзь паспяваюць за кінакамерай. На гэты тэмп «працавала» ўсё. Ён быў абумоўлены самой стылістыкай карціны. Праўда, да канца яго ўсё ж не ўдалося захаваць. І думалася, аўтары абмяркуюць пралікі, дапушчаныя ў гэтым фільме, каб у новым іх не паўтарыць.

Ёсць у новым фільме цікавыя вобразы. Гэта перш за ўсё сама Чырвоная Шапачка—такая абаяльная ў выкананні Яны Паплаўскай. Дзіця, якога з усёй сур'ёзнасцю і непасрэднасцю іграе самая маленькая актрыса фільма—Іна Сцяпанава. Прыемнай аказалася і сустрэча з нашым старым знаёмым Дзімам Іосіфавым. Тут у яго роля не менш няўрымслівага, чым Бураціна, Ваўчаняці. Леанід Нячаеў умее і любіць працаваць з акцёрамі-дзецьмі.

Такім майстрам, як Рына Зялёная і Яўген Еўсцігнееў, пашанцавала не вельмі: яны зусім мала з'яўляюцца на экране. Але і гэтага дастаткова, каб запомніць Бабулю, якая любіць не толькі рабіць дзіўныя свістулькі, але і глядзець на зоркі, спяваць песеньку пра Млечны Шлях. І Звездара, які не толькі спраўна лічыць зоркі, а і спрабуе, як Бабуля, рабіць свістулькі і вельмі гэтага саромеецца... Справа тут і ў тыпажнасці акцёраў, і ў знешнім малюнку роляў, у тым, як мастак І. Тапілін некалькімі штрыхамі прымушае «гаварыць» рэчы, якія акружаюць гэтыя персанажы. Як прыгожа апранута Бабуля, якая маляўнічая ў яе хатка! А як цікава ў поўнай дзяцей хаце Старога (А. Бялоў), які пячэ аладкі і ўспамінае сваю апошнюю сустрэчу з Бабуляй Чырвонай Шапачкі! Нават уяўляеш, як было б здорава, калі б казка пачалася менавіта адсюль.

Але, на жаль, гэтыя прывабныя эпізоды і вобразы нібы існуюць самі па сабе. І толькі падкрэсліваюць непаслядоўнасць стылістыкі стужкі. Яскравыя, вясёлыя песні фільма таксама хутчэй існуюць як канцэртныя нумары, а не як музычныя характарыстыкі вобразаў.

Адным словам, у новай кінастужцы няма той цэласнасці стылістыкі, багацця выяўленчых сродкаў, якія так парадавалі ў першай сумеснай рабоце аўтараў. Там яны заявілі, што могуць працаваць творча, цікава. А таму хочацца пажадаць ім надалей большай паслядоўнасці, смеласці і фантазіі ў няпростым і сур'ёзным жанры—казцы.

М. СТАРЫХ.

АБУДЖЭННЕ ДОКТАРА РЭНЕТА

Параўнальна нядаўна мы бачылі на кінаэкране такога героя сучаснага буржуазнага грамадства, якому выпадкова была прадастаўлена магчымасць убачыць Зямлю будучага: жудасную карціну мёртвай Зямлі. Праўда, у сне, але містэр Мак-Кінлі, а гэта быў ён, зразумеў, што не ўцякаць трэба ад жыцця цяперашняга, а, дзеля будучага, несці за яго адказнасць.

І вось новая сустрэча, на гэты раз на тэлеэкране, з чалавекам, які мае ўсе падставы непакоіцца за будучае. Чалавек гэты — таленавіты, сумленны амерыканскі вучоны, які прымаў удзел у стварэнні атамнай бомбы. Знішчальная сіла выбуху, якая не ўваходзіла ні ў якія ранейшыя рамкі, яго згубныя вынікі не проста ўзрушылі гэтага вучонага — яны траўміравалі яго душу, зламалі духоўна.

Ён не можа больш займацца фізікай разбурэння, ён займецца фізікай стварэння — даследаваннем прыроды касмічных прамянёў. Але ранейшая натхнёнасць пакінула яго. Раптоўныя здагадкі, адкрыцці прыходзяць да яго ўсё больш рэдка, затое ўсё часцей і часцей — кашмары ўспамін. Яго палохае сучаснасць, але яшчэ больш будучае, у якім ён не бачыць нічога светлага. Жонка, не разумеючы, што з ім, пакідае яго. Пакінуў даследчую работу і яго былы калега. Ён застаецца зусім адзін...

Вось у такі драматычны перыяд жыцця знаёмімся мы з галоўным героем новага тэлевізійнага трохсерыйнага мастацкага фільма «Сустрэча на далёкім мерыдыяне» (студыя «Беларусьфільм», па заказу Дзяржтэлерадыё СССР; аўтар сцэнарыя — І. Менджарыцкі, рэжысёр — С. Тарасаў), знятага па матывах адменнага рамана вядомага амерыканскага пісьменніка Мітчэла Уілсана.

Аўтары твораў для экрана не ўпершыню звяртаюцца да важных палітычных падзей з жыцця амерыканскага грамадства. Можна нават прасачыць і пэўную паслядоўнасць у паспяховай распрацоўцы гэтай тэмы як кінематаграфістамі, што робяць фільмы для дэманстрацыі на «блакітным экране», так і творчымі работнікамі аб'яднання «Тэлефільм».

Барацьба «па-амерыканску» губернатара Вілі Старка за галасы ў прадвыбарчай кампаніі (тэлефільм «Уся каралеўская рацэ») нібы папярэднічала даласкай трагедыі, забойству Роберта Кенэдзі («Вашынгтонскі карэспандэнт»). У фінале апошняй стужкі галоўны герой, савецкі карэспандэнт у Амерыцы 60-х, звяртаючыся ў тэлеперадачы да сваіх амерыканскіх калег з заклікам умацоўваць сяброўскія кантакты паміж двума народамі, гаварыў аб «пацяпленні» міжнароднага клімату, аб станоўчых зрухах у савецка-амерыканскіх адносінах. Тэлефільм «Сустрэча на далёкім мерыдыяне» паказвае развіццё і ўмацаванне гэтых кантактаў, а менавіта — садружнасць савецкіх і амерыканскіх вучоных.

Гэтыя тэлефільмы, зробленыя на кінавытворчасці і сіламі тэлебачання, аб'ядноўвае не толькі зварот іх аўтараў да падзей і фактаў амерыканскай рэчаіснасці. Два з іх — экранізацыі раманаў вядомых амерыканскіх пісьменнікаў. Сцэнарыі двух з іх напісаны адным і тым жа аўтарам (І. Менджарыцкі ўдзельнічаў у стварэнні сцэнарыя «Вашынгтонскі карэспандэнт»). Ва ўсіх трох тэлефільмах заняты вядучыя акцёры савецкага кіно і тэатра. І яшчэ адна агульная каштоўная якасць: погляд стваральнікаў гэтых стужак на гісторыю мінулых гадоў з пазіцый сённяшняга дня. У прыватнасці, аўтары апошняга фільма не толькі ўваскрэсілі на экране падзеі канца 50-х гадоў і паказалі вытокі савецка-амерыканскіх адносін, але і далі гэты працэс у развіцці і ў пэўным завяршэнні яго наступных этапаў, ажно да сустрэчы на арбіце касмічных караблёў «Саюз» і «Апалон».

Пытанні, якія ўзнімае тэлефільм (барацьба супраць гонкі ўзбраенняў, за мірнае суіснаванне краін з розным сацыяльным ладам, за дзелавое супрацоўніцтва ў розных галінах), гучаць надзённа цяпер, калі ў палітычнай разрадкі яшчэ нямала праціўнікаў, калі ва ўсім свеце шырыцца рух за спыненне нытворчасці яшчэ больш жудаснага сродку ўсеагульнага знішчэння — нейтроннай бомбы.

...«Прывід» асляпляльна белай пагібелі свету, пачуццё віны і адказнасці мучыць доктара Рэнета, паралізуе яго волю, прыводзіць да творчага застою, раўнадушша. Адна толькі акалічнасць не дае яго жыццю канчаткова страціць сэнс. Савецкі фізік Ганчароў і Рэнет, знаходзячыся ў розных пунктах планеты, адначасова прыйшлі да аднолькавых вынікаў у важным навуковым эксперыменце. Ганчароў павінен якраз прыехаць у ЗША. І ў Рэнета з'яўляецца нейкая няясная надзея на сустрэчу з чалавекам, які, мабыць, дапаможа яму разабрацца ў нечым вельмі важным. І Рэнет не памыліўся.

Другая скразная лінія тэлефільма — «паядынак» Рэнета з Леанардам Хеншэлам, былым калегам, «былым вучоным». Ён даўно пакінуў лабараторыю, стаўшы ў рады «дыпламатычных фізікаў». Цяпер ён «зманьвае» да сябе Рэнета. І менавіта Рэнет урэшце ўсведамляе, што не бегчы трэба, а змагацца за тое, каб навуковыя дасягненні служылі толькі на карысць чалавеку.

Не адразу прыходзіць ён да такога выніку. Тэлефільм пакажа нам героя ў сябе на радзіме, у нашай краіне: у лабараторыях, на кватэры Ганчарова, на Каўказе. Мы бачым, як паступова, праз недавер'е да савецкіх людзей яго суайчыннікаў, што знаходзяцца ў Маскве (прыгадаем, як лёгка паддаецца і Рэнет, прыехаўшы ў нашу краіну, беспадстаўным падазрэнням), у працэсе кантактаў з савецкімі калегамі «абуджаецца» ён, многае спасцігае, і як у ім зноў паяўляецца смак да працы.

Так, «на далёкім мерыдыяне» доктар Рэнет набывае «другое дыханне», чадыходзіць яго «духоўнае выздараўленне». Ён робіць найважнейшае ў сваім жыцці адкрыццё: можна і трэба працаваць у імя стварэння. Аказалася, што ўзаемаразуменне — гэта цудоўна! Аказалася, можна не толькі разам працаваць, адчуваючы пры гэтым сапраўднае творчае задавальненне, але нават і закахацца ў калегу па працы.

Праўда, у апошнім пытанні больш няясناсцей, чым у першым. Спачатку гэта здаецца дзіўным, але ж у свой час, калі выйшла кніга М. Уілсана, пісалі пра тое, што «лірычная лінія» не зусім удалася пісьменніку, што тут яму здрадзіла пачуццё мастацкага такту. Не ўдалося да канца пераадолець пэўную непаслядоўнасць і ў тэлефільме. Невялікая розніца ад таго, што тэлевізійны Нік не паспявае закахацца яшчэ і ў Ані Робісан і што наогул яго адносіны з Ані і Валяй у фільме развіваюцца і заканчваюцца зусім інакш. Усё роўна яго каханне да Валі выходзіць на першы план — у выніку суаднесенасць галоўнага і другараднага хутка мяняецца на карысць апошняга ў трэцяй серыі (і без таго некалькі запягнутай і некалькі ілюстрацыйнай).

Аўтару кнігі не ўдалося да канца пераадолець і некаторую аднапланавасць у паказе савецкіх фізікаў, і асабліва Ганчарова. Па зразумелых прычынах характар Ганчарова толькі намечаны, у тэлефільме акцёру В. Ланавому давялося зрабіць многае, каб у рамках прапанаванага драматургічнага матэрыялу мы неяк адчулі: гэта асоба не адназначная. Праўда, пастаноўшчык увёў у фільм сцэны, якія нічога новага не дадаюць, а часам выглядаюць нават крыху наіўна (напрыклад, сцэны, у якіх Ганчароў і Рэнет пачынаюць раптам «рашаць» важнае для іх пытанне на радыятары машыны ці на снезе ў гарах).

Хацелася б сказаць вось яшчэ аб чым. У папярэдніх работах кінематаграфістаў і работнікаў «Тэлефільма» аб Амерыцы добра прадстаўлены дакументальны фон. Тут ён адчуваецца менш. Не ў тым сэнсе, што адсутнічае дакументальная хроніка, — проста часам фільму не хапае дакументальнай праўдзівасці. Тэма часу, яго пульс, рытм падзей — усё гэта вельмі прыглушана. Так, мы вымушаны здагадвацца, што, відаць, адбыліся нейкія змены ў савецка-амерыканскіх адносінах: упершыню ў ЗША прыязджаюць «загадкавыя рускія» — савецкія вучоныя. Мы верым на слова. Рэнет бліскуча выступае на міжнароднай канферэнцыі — верым на слова. Хеншэл кагосьці прадстаўляе ў Жэневе, збіраецца весці нейкія перагаворы... У сябе на радзіме Рэнет паказаны ў поўнай адзіноце, а мы ведаем, што сярод амерыканскіх вучоных былі і ёсць прыхільнікі Рэнета...

Няўпэўнасць у тэлефільме агульных мер робіць яго менш маштабным, менш значным і праўдзівым, чым ён мог бы быць. Калі гэтага не зрабіў М. Уілсан (у свой час стварэннем гэтай кнігі ён і так здзейсніў пісьменніцкі і чалавечы подзвіг, учынак, прадыктаваны, паводле слоў К. Сіманава, «сапраўднай мужнасцю і сапраўднай верай у людзей»), то мы маглі б чакаць гэтага ад аўтараў тэлефільма.

Прайграе тэлевізійная стужка і ў тым сэнсе, што прымушае гаварыць аб пэўных паўгорах, аб выкарыстанні ўжо знойдзенага і бачанага ў ранейшых работах. Так, міжволі кадры, у якіх акцёр В. Дваржэцкі, выканаўца ролі Рэнета, стаіць на беразе мора (першая серыя), няхай і аддалена, але адразу ж уваскрашае ў памяці эфектную сцэну з кінафільма «Бег». І ў гэтым сэнсе роля Дваржэцкага, нягледзячы на тое, што ён упэўнена завяёўвае нашу ўвагу,— не адкрыццё для гледачоў.

Знешняе падабенства з «Вашынгтонскім карэспандэнтам» заўважаецца і ў пабудове сюжэта: пачынаюцца і заканчваюцца абодва фільмы адной і той жа сцэнай, прычым у гэты час мінулае сустракаецца з сучасным... У канцы тэлестужкі мы бачым героя зусім іншым чалавекам. Упэўненым у тым, што справа яго служыць мэтам стварэння. А мы ўпэўнены ў тым, што ён хоча бачыць будучае, не азмрочанае ценем атамнага выбуху. І — што паказвае само жыццё — у гэтым доктар Рэнет не адзінокі ў сваёй краіне.

А. ПЛАЎНІК,
кандыдат гістарычных навук.

СЛОВА ПРА ГЛЕБАВА

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Ён — наш сучаснік. Надоўга. Назаўсёды.

І гаварыць пра Глебава немагчыма без упамінання пра яго любімага настаўніка Міхаіла Аркадзьевіча Керзіна. Любімага і, урэшце, адзінага.

Керзін літаральна змагаўся за Глебава. У хлопчыку са Смаленшчыны, які трапіў у Віцебскі мастацкі тэхнікум, ён прадбачыў майстра, бараніў яго чулую душу ад таго, што мякка назавём выпрабаваннямі жыцця: ды і Керзін не быў усемагутны — абставіны склаліся так, што Глебаў кінуў тэхнікум.

Воля да творчасці прывяла яго ў Маскву, дзе пашчасціла сустрэць нямала добрых людзей. Аднак асноўнае — работа ў скульптуры — апынулася не на першым плане. Керзін літаральна перацягнуў Глебава ў Мінск, прытуліў яго на першым часе ў сваёй майстэрні.

Ах, з якой прагнасцю працаваў малады Глебаў!.. Якія складаныя задачы ставіў перад сабой!.. Паспяхова вырашыў конную статую!.. Задача, якая па плячы толькі майстру...

Прыйшло грамадскае прызнанне: ён стаў пераможцам конкурсу на помнік у гонар вызвалення Беларусі ад інтэрвентаў — статуя мусіла быць пераведзена ў матэрыял і ўстаноўлена...

Аднак пачалася вайна... Глебаў стаў кулямётчыкам. Цяжка паранены на фронце, трапіў у шпіталь...

Вось радкі з яго пісьма, так і не адпраўленага адрасату, перакрэсленага, бо, відаць, не здавальнялі Аляксея Канстанцінавіча словы, у якіх ніяк не ўдавалася выказаць усю глыбіню пачуцця да людзей, што ўратавалі яму жыццё:

«Мне балюча Вам пісаць... бо я мог гэта зрабіць даўным-даўно. Даруйце, але ў мяне былі прычыны. Добра б пра гэта пагутарыць пасля, у выпадку, калі я папраўлюся.

Самае горкае, што я хварэю і пішу Вам з бальніцы. Хвароба, мабыць, у мяне невылечная і ўбачыцца наўрад ці давядзецца.

За ўсё, што Вы зрабілі ў жыцці маім для мяне, вялікае салдацкае дзякуй. Жыццё салдата Глебава спатрэбілася пасля Глебаву-мастаку. Апошні мог лепей адчытацца перад Вамі, але, мабыць, не хапіла часу...»

Прамільгнула жыццё... І ўсё ж, на многае хапіла часу... Многае паспеў.

Усё жыццё паўтараў керзінскія ўрокі: мастак пачынаецца з любві да жыцця — ад кветкі да чалавека. На ўласным вопыце спасціг: не вывучыўшы тую ці іншую форму дэталёва, нельга і гаварыць пра агульны яе лад. Бо агульны лад у творы — вынік не схематызацыі, а падначалення дэталёвага асноўнаму, якое пластыкаю сваёю выяўляе тую ці іншую думку.

Яго «Юнацтва» — ці не найлепшы гэта доказ творчых прынцыпаў, якія спавядаў?!

Глебаў заўсёды працаваў як апантаны. Прыгадаем з яго пасляваенных работ, напрыклад, матывы чырвоных коннікаў, конныя атакі. Каб тварыць з такой імправізацыйнай лёгкасцю, трэба было дасканала вывучыць рухі каня, ягоную мускулатуру, непаўторную пластыку гэтага чароўнага твора прыроды. Назубок ведаў трактаты пра ўмельства адлюстроўваць у мастацтве каня.

Часта паўтараў любімую керзінскую думку:

— Самае прыгожае ў прыродзе — жанчыны і коні!..

Андрэй Ануфрыевіч Бембель прыгадвае:

— Быў захоплены жыццём. Улюбёны ў жывую форму. Умеў перадаць трапятанне яе, рух... У Глебава коні — кавалерыя!.. А яго «Юнацтва» — вяршыня. Яна сведчыць, колькі шчэ мог зрабіць майстар. Класічнае, непераўзыдзенае ў глебаўскай творчасці рашэнне... Вобраз уражвае... Поўная гармонія!.. Дакладны змест, дакладная форма...

Безумоўна, у скульптуры Савецкай Беларусі Глебаў быў сярод зорак першай велічыні.

Ён браў удзел у скульптурным аздабленні інтэр'ераў Дома ўрада ў Мінску.

Ён стварыў натхнёныя вобразы Уладзіміра Ільіча Леніна і Янкі Купалы, Льва Даватара і Францыска Скарыны...

На абеліску ў гонар воінаў і партызан Вялікай Айчыннай, што на плошчы Перамогі ў Мінску, Глебаву належыць рэльеф «Партызаны Беларусі»...

У Маскве на Ленінскіх гарах каля будынка універсітэта — глебаўскі Пётр Лебедзеў...

Народны мастак БССР, выдатны майстар, ён быў настаўнікам многіх. І сам — ні на хвілю не пераставаў вучыцца.

Бываў у майстэрні літаральна штодзённа. Майстэрня была для яго і домам, і творчай лабараторыяй, і школай для ягоных вучняў.

Глебаву пашчасціла зведаць сапраўднае натхненне. Бо працаваў заўсёды, не чакаючы візіту капрызнай музы...

— Дні, як на злосць, — чым больш жывеш, тым — карацей...

Гэтыя словы пачуў ад яго, беручы інтэрв'ю для «Літаратуры і мастацтва». Я не ведаў тады, што гэта будзе апошняе інтэрв'ю.

Здавалася тады, што для больш дэталёвай гаворкі з майстрам пра гэты помнік яшчэ надыдзе час. Лёс наканаваў інакш — помнік Францыску Скарыне, завершаны вучнямі, адкрывалі ў Полацку без Аляксея Канстанцінавіча...

Не паспеў здзейсніць задуму — стварыць сімвалічны вобраз Нарачанкі...

У апошнія дні крэсліў аўтаручкаю ў сшытку накіды яшчэ адной работы, што мроілася ва ўяўленні, — «Ветрык»...

Ніколі не забуду, як, у апошнюю нашу сустрэчу ў майстэрні, гаворачы пра сваё адчуванне, што цяпер, маўляў, ён падрыхтаваны да самай складанай задачы, якую толькі можа паставіць перад сабою мастак, Аляксей Канстанцінавіч, перасунуўшы акуляры з вачэй на лоб, раптам перайшоў на шэпт і адчаканіў:

— Таму што я — на-род-ны!..

І па-змоўніцку ўсміхнуўся, высока ўзняўшы руку з лінейкаю...

Уладзімір БОЙКА.

Загадкавыя радкі

У СЦЮДЗЕНКУ і Брылі, што знаходзяцца па левы і правы бок ракі Бярозы, часта едуць цікаўныя людзі: пісьменнікі і журналісты, мастакі і артысты, ваенныя і гісторыкі. І ва ўсіх адна патрэба, — паглядзець тыя мясціны, дзе ў XIX стагоддзі рускія войскі разбілі напалеонаўскія палкі. Старонкі мужнасці беларускага народа, партызан у Айчынную вайну 1812 года зацікавілі і Янку Купалу. Упершыню аб гэтых фактах паэт пачуў у 1912 годзе, калі пачалі ў нашым краі ставіць помнікі салдацкай славы.

Па сведчанню жыхароў названых вёсак Купала наведваў гэтыя мясціны некалькі разоў — у дарэвалюцыйны час, у дваццатыя і трыццатыя гады. Прычым кожны раз не адзін. Як потым мне расказвала жонка паэта — Уладзіслава Францаўна, сапраўды па Барысаўшчыне ездзілі беларускія кампазітары, фалькларысты і этнографы А. Грыневіч і У. Тэраўскі. А пазней туды зноў наведваўся У. Тэраўскі і Н. Сакалоўскі, які тады працаваў у народным тэатры У. Галубка, спачатку хормайстрам, а потым загадчыкам музычнай часткі. Ну, вядома, прыязджаў і сам Галубок і некаторыя яго акцёры. Іх мэта была сабраць фальклорны матэрыял — песні, вершы, легенды для канцэртаў. Яны агітавалі Купалу напісаць п'есу пра выдатныя гістарычныя падзеі, пра беларускіх партызан 1812 года. Што перашкаджала Купалу ў гэтай рабоце, мы пакуль што не ведаем. Аднак тэму гэту ён пачаў распрацоўваць яшчэ ў Вілейскі перыяд, у сувязі з падрыхтоўкай да стагоддзя Айчыннай вайны.

Паэт уважліва чытае кнігу В. Вараноўскага «Отечественная война в пределах Смоленской губернии», што была выпушчана да стагоддзя гераічнай перамогі. Пазней, як вядома з успамінаў дачкі, сына і жонкі рускага мастака Д. Полазава — гэтую кнігу Купала даваў чытаць яму, свайму сябру. Цяпер экземпляр знаходзіцца ў фондах Літаратурнага музея Янкі Купалы. Яго прывезла з Ленінграда ад дачкі Д. Полазава Я. Раманоўская.

Купала сустракаўся і з калгаснікам Іванам Трахімавічам Дарафеевым.

Вясковыя людзі цікаўныя. Дарафееў запытаўся ў паэта:

— Ці не збіраецеся вы пісаць пра наш край?

— Магчыма

— Дык у добры час вам.

— Дзякую...

Наступныя сустрэчы Купалы з Дарафеевым, як успамінаюць сяляне вёсак Сцюдзёнкі і Брылі, былі больш цікавымі.

На гэты раз ён гутарыў не толькі з Дарафеевым, але і з іншымі старажыламі ды і маладымі.

Іван Дамінікавіч пераконваўся, што Дарафееў не толькі здольны апавядальнік, але і дасведчаны чалавек, з якім можна раіцца, гаварыць без стомы, ён ніколі не губляў цікавасці да гісторыі.

У трыццатыя гады Купала і Дарафееў сустрэліся як старыя знаёмыя.

— А, дзядзька Купала, мусіць, ужо напісалі пра нас нешта?

— Вось хачу вас пазнаёміць з некаторымі накідамі сваіх вершаў ці будучай паэмы...

— Ну, што ж, разумныя словы рады заўсёды паслухаць.

— Папярэджваю, што гэта толькі накід. Вось узяць хаця б гэтыя радкі:

Сягоння Бяроза ўдаль плыве свабодна,
А думка ўсплывае аб царах між волі.
Няўжо ў іх жа царствах зямельскі прыгоднай
На іх жа магілы не было ніколі.

А калі так сказаць?

Сягоння Бяроза плыве ўдаль распетай,
А думка між волі ўсплывае ўсё тая:
Няўжо каралям і царам тым зямлі тэй
На іх жа магілы сябе не хапае.

Якія радкі, на вашу думку, лепшыя?

— Гэта мне цяжка сказаць. Здаецца, ўсё добра, калі вы напісалі. Захопнікам, няхай чужая зямля стане колам.

— Паслухайце яшчэ.

Крулі ж крулявалі, князі катавалі,
І цары царылі ў крывавай хвале,
Турмы будавалі, кавалі кайданы,
На народным целе сачыліся раны.
Яшчэ сёння глянеш — курганы, магілы —
Сведкі былых боек варожае сілы,
Людзі аб курганах да нашых прадвесняў
Шмат зложылі казак і легенд і песняў.

Над рэчкаю Бярозаю на Беларусі
Ізноў ідуць бітвы, крывавыя бітвы,
Народ паднявольны йшчэ болей сагнуўся.
І шэпча пакорна прамляцці і малітвы.

— Ну, як, чытаць далей?

— Чаго ж, можна і далей. Праўдзіва ўсё пішаце, як быццам бы вы самі тутака былі.

— Вы гаварыце, калі што не ўпадабаеце. Не саромейцеся, лепш цяпер выправіць, каб хібы не трапілі ў друк. Калі ласка, слухайце.

Тут з царом расійскім кароль Банапартэ
На карту паставілі гонар і славу;
Хай льецца салдацкая кроў не на жарты
За рускія справы, французскія справы.
І кроў палілася па нашых загонах,
Бярозы з крывёю змяшаліся воды,
І льецца за тыя ж кроў троны, кароны,
Якая ліласи праз векі і годы.
Зноў шоў год за годам, стагоддзе мінала,
А дабра краіна не чула, не знала.
Былі вёсны, леты, восені і зімы,
Гора песні пела на зямлі радзімай.

— Так, так яно было.

— А ці не здаецца, што ў мяне шмат смутку, жалобы?

— Дык часы былі цяжкія.

— Гэта праўда. У пацвярджэнне вашых слоў ёсць у мяне і такія радкі:

Некаму аб шчасці
Кукуе зязюля,
А сіроткі, удоўкі
Ніхто не прытуле.
Пабрыдуць па свеце,
Па лясах, па полі,
Каб долю сустрэць,
І не знойдуць долі.

— Што гэта будзе за твор, калі не сакрэт?

— Я сам яшчэ не ведаю.

— А ўсё ж?

— Па праўдзе кажучы, хацеў бы напісаць нешта накшталт «Кургана». Але вось мала шчэ падбіраецца такога матэрыялу, каб ён набыў характар легенды. Перамога рускіх салдатаў над чужаземцамі — гераічная справа, і яна лепш за ўсё ўкладаецца ў такую папулярную літаратурную форму, як песня-легенда. Аднак мала жадаць, трэба яшчэ напісаць. Я ніколі не люблю загадваць наперад. Лічу, што размова толькі між намі.

Пра гэту гаворку ведалі Дарафееў ды жонка паэта. Можа, і ўсё б засталося ў сакрэце. Але ў пяцідзесятых гадах неяк у газеце «Літаратура і мастацтва» быў надрукаваны артыкул Пятра Глебкі, які расказаў, што радкі пра раку Бярозу і нашэсце Напалеона былі напісаны для калектыўнай паэмы, некаторыя былі выкарыстаны, а некаторыя так і засталіся ў рукапісах.

Ад Уладзіславы Францаўны мне хацелася даведацца аб некаторых падрабязнасцях працы паэта над паэмай 1812 года на Беларусі. І ў пяцідзесятых гадах у мяне з ёй адбыўся такі дыялог.

— Уладзіслава Францаўна, давайце ўспомнім нашу гутарку адносна купалаўскай п'есы 1812 года на Беларусі.

— Гэта вам Галубок Уладзіслаў Язэпавіч увёў у вушы, што Купала збіраўся працаваць над п'есай?

— Як жа ў сапраўднасці было?

— Як, як... Вы ўсё дурыце галаву. Хіба дакладна сёння ўсё прыпомніш.

— Вы ж неяк мне расказвалі.

— Ну і досыць.

— Цяпер я гэтую гаворку хачу запатаваць. Мне здаецца, што яна спатрэбіцца.

— Трэба падумаць.

— У добрай гаспадарцы, як кажуць, нічога марна не траціцца.

— Вось і трэба было адразу запісаць.

Я быў запісаў нашу гаворку і думаў, што асобныя дэталі яшчэ ўдакладню. Кожны новы расказ раскрывае новыя факты, я ўсё ж настойваў, каб яна яго паўтарыла. У той дзень у яе нешта не было часу, ці была не ў гуморы. Яна папрасіла другім днём зайсці ўвечары, на Омскі завулак, да хаты, дзе жыла ў Мінску. Праз два дні я не прамінуў, каб не зайсці. І вось што пачуў тады:

— Ат, ён заўсёды некуды ехаў. Яму не сядзелася дома. Асабліва ўпадабаў Барысаў і Барысаўшчыну. Буду казаць яму: «Ну, што ты там знайшоў такое, што трэба ехаць абавязкова?» А ён адкажа: «Ты, Уладка, не перашкаджай творчай справе». Зноў я назалялася: «От, я табе дам тузін тэм, усё раскажу, толькі пішы. І ехаць нікуды не трэба, усё можна напісаць на месцы, седзячы ў Мінску». А ён і кіне, жартуючы: «Языком усё можна зрабіць, але для справы гэтага мала. Ты ж не ўдзельнічала ў 1812 годзе. Хоць адна справа абышлася без цябе». Але і я не саступала: «Так і без мяне. Трэба ж будзе збіраць матэрыял ды кнігі даставаць. Што ж ты там такое надумаўся?» Вось так і перагаворваліся то сур'ёзна, то шуткуючы.

Сказала вось такое і пакінула мяне аднаго ў пакоі. Мусіць, нешта рыхтавала падаць на стол, бо інакш у яе не клеілася гаворка.

— Выбачайце. Я забылася, што вы шчэ не абедалі, дык прашу.

Такі быў рытуал у гэтай хаце, што, калі хочаш пагутарыць, дык мусіш перакусіць і... — як у гасцінным доме.

— А на чым гэта я спынілася?

— На размове з Іванам Дамінікавічам.

...— Вось бачыш, Янка, людзі ўсё пытаюцца пра п'есу. Што гэта — Галубок хоча прымусіць цябе пісаць ці што?

— От, Уладка, ты не разумееш, гэтых тэатралаў. Яны думаюць, што калі будуць гаварыць аб п'есе, дык яна сама напішацца. Не, не...

— Дык у чым жа справа?

— А справа ў тым, што аб п'есе я не думаю. Мне хапіла аднаго нашага першага мінскага тэатра. Хаця я і люблю тэатр, але ахвоту ў мяне адбілі надоўга, калі не на ўсё жыццё.

— Тады трэба пільнавацца паэзіі.

— Каб напісаў гераічную паэму, дык я б больш нічога не хацеў.

— Разумею цябе.

— Паэма для паэта такая форма, як раман для празаіка. У ёй можна вырашаць самыя складаныя праблемы мінулага і сучаснага. У гэтым пераконваешся, калі чытаеш паэмы Пушкіна і Лермантава, Блока і Украінкі, Міцкевіча і Коласа, Шаўчэнкі і Байрана. Ды што гаварыць. Гэта — ёмістая форма, у ёй можна выказаць усё, што хочаш. Мне карціць напісаць эпічную паэму аб гераізме салдата 1812 года.

— Я гэта заўважыла яшчэ ў Вільні.

— А ты назіральная, Уладка. Тэма гэтая сапраўды нарадзілася ў мяне з кніг, прачытаных у бібліятэцы «Веды», у Б. Эпімах-Шыпілы, універсітэцкай, — дзе я іх не чытаў, а глытаў. Мяне заўсёды цікавіла гісторыя свайго народа. Матэрыял багаты, і я пераканаўся, што трэба ствараць гістарычную паэму. Чаго я яшчэ не рабіў. Мне бліжэй, канечне, паэма легендарная. Я думаю, што легендарную з гістарычнай можна спалучыць.

— Значыць, ты думаеш над гэтай паэмай яшчэ з даўніх часоў, як мы пазнаёміліся з табой.

— З таго часу, як святкавалі стагоддзе перамогі над напалеонаўскімі войскамі, я стаў думаць над паэмай. А вершы аб 1812 годзе на Беларусі мне даўно хочацца напісаць.

— Сюжэт трэба браць беларускі.

— Вось я і думаю пра беларускіх партызан напісаць, якія дапамагалі рускім і ўкраінскім салдатам выганяць са сваёй зямлі акупантаў. Ну, што я думаю, ці варта аб гэтым гаварыць.

— Варта.

— Не, Уладка. Аб паэме менш трэба гаварыць, а неабходна пісаць. Вось, каб ты мне дапамагла сюжэт скласці, гэта было б цікава. А так, што гаварыць дарэмна.

Так і закончылася мая гутарка з Уладзіславай Францаўнай. У гэты час нехта прыйшоў і гаворка наша была спынена.

Вершаваныя радкі Янкі Купалы, прыведзеныя намі вышэй, так і засталіся неразгаданымі.

Алесь ЕСАКОЎ.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

Уладзіміру МЕХАВУ—50

Заўтра пісьменніку Уладзіміру Мехаву спаўняецца 50 гадоў. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Паважаны Уладзімір Львовіч!

Прыміце нашы цёплыя, шчырыя віншаванні з нагоды Вашага 50-гадовага юбілею.

Сваё паўстагоддзе Вы сустракаеце з немалым літаратурным набыткам. Але перш чым стала ўзяцца за творчасць, Вы настойліва вывучалі жыццё, авалодвалі ведамі. Вас вельмі вабіла прафесія журналіста. Таму і не дзіўна, што адразу ж пасля вызвалення роднай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Вы падаліся на журфак Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння вучобы Вы шмат гадоў з поспехам працавалі ў рэдакцыях рэспубліканскіх газет. Зараз Вы — старшы рэдактар на Беларускім радыё.

Абудзілася ў Вас і цяга да літаратурнай творчасці. Сваё першае апавяданне Вы надрукавалі ў 1951 годзе. З тае пары Вамі напісаны і выдадзены кніжкі «Сцяг над рэўкомам», «Апошняя яўка», «Станцыя паблізу Тамбова», «Старадаўняя гравюра», «Помнік герою» і інш. Большасць з гэтых кніг адрасаваны юнаму чытачу. Яны ахопліваюць шырокае кола тэм і звяртаюць на сябе ўвагу Вашым уменнем бачыць цікавае ў самым звычайным, будзённым.

На Вашым пісьменніцкім рахунку п'есы «Чырвоны губернатар», «Палёт», якія з поспехам ішлі ў тэатры юнага гледача. Удала працуеце Вы і ў галіне дакументальнага кіно.

Жадаем Вам, дарагі наш сябра, моцнага здароўя, шчасця, новых творчых узлётаў».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру доўгіх гадоў жыцця, здзяйснення творчых задум.

ХОР — калектыў творчы

СЕННЯ ў выканаўчай практыцы народных харавых калектываў выразна акрэсліліся дзве манеры спеваў: адна заснавана на мясцовай народнай, другая ў асноўным ужывае характэрныя прыёмы з агульнапрынятай (акадэмічнай) манеры. Адпаведна абодва гэтыя віды народных калектываў арыентуюцца на розны рэпертуар. Першыя — на мясцовы фальклорны, другія — на аўтарскі і змешаны.

Каб класіфікаваць хоры з чыста народнай манерай выканання і змешанай, дзе народныя прыёмы аб'ядноўваюцца з агульнапрынятымі, мы ўмоўна назавём гэтыя два віды самадзейных калектываў так: народныя хоры — тыя калектывы спевакоў, якія пераважна выконваюць народныя песні (аснова рэпертуару) у манеры і традыцыях дадзенай мясцовасці; хоры народнай і масавай песні (хоры змешанага тыпу) — калектывы, якія па манеры выканання блізкія да народных, але па выпрацоўцы мастацкіх навыкаў і рэпертуару не маюць дакладнага размежавання паміж народнымі і акадэмічнымі.

Арганізацыя народнага хору, як і ўсякага калектыву, пачынаецца з прыцягнення ўдзельнікаў, якія любяць і ведаюць народную песню. Пры стварэнні калектыву можна абапірацца на сямейныя «гурты» і неўчыя групы аднавяскоўцаў.

Народны хор — калектыў творчы, таму эдольнасць спевака да імправізацыі— адзін з важных крытэрыяў пры падборы выканаўцаў. Мэтазгодна пры гэтым пранаваць спеваку прыдумаць варыянт да мелодыі, падабраць «утор» або падгалосак да вядомай песні, тэкст да напеву, прыпеўкі. Асабліва важна кіраўніку стварыць такую атмасферу, у якой выканаўца зможа праявіць свае творчыя задаткі, як мага паўней раскрыцца. Значыць, прымаючы жадаючых у народны хор, не трэба імкнуцца шукаць спевакоў з пэўнай музычнай падрыхтоўкай. Галоўнае тут — прыродны талент.

Адна з цэнтральных праблем у народным хоры — пастаноўка голасу. Існуюць «пастановачныя рэцэпты», якія можна аднесці ў вядомай ступені толькі да хораў народнай і масавай песні. З удзельнікамі рэгіянальных народных хораў, на маю думку, няма неабходнасці займацца пастаноўкай галасоў, бо сама прырода «паставіла» іх. Важна, каб аматары спявалі ў народнай манеры — гэта значыць, проста і натуральна, як спяваюць людзі, якія не праходзілі спецыяльнай вакальнай падрыхтоўкі.

Іншая справа, што народная манера спявання, хоць і перадаецца з пакалення ў пакаленне, з гадамі мяняецца. Многае ўплывае на манеру спеваў: змены ўмоў жыцця і працы, навыкі, атрыманыя ў школе, слыхавое ўспрыняцце твораў, што выконваюцца ў канцэртах, па радыё і тэлебачанню. Пэўныя змены, напрыклад, адбыліся ў самабытных у мінулым Азершчынскім, Тураўскім, Залескім і Юравіцкім народных хорах, якія ў 60-я гады, па сутнасці, пераўтварыліся ў хоры народнай і масавай песні, хоць у творчай дзейнасці першых трох і на сённяшні дзень у некаторай ступені захоўваюцца пэўныя прыкметы народнай манеры спеваў. Выкананне народнай песні, напрыклад, падкрэсліваецца тут характэрнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі і іншымі лакальнымі прыкметамі, што ўзмацняе своеасаблівасць песні, надае ёй больш яркую, самабытную, выразную форму.

У хорах народнай і масавай песні назіраецца працэс збліжэння дзвюх манер выканання: народнай і акадэмічнай. Гэта тлумачыцца пашырэннем дыяпазону народных хораў, выкарыстаннем розных рэгістраў пры выкананні песень, пераходам на паўадкрытае і закрытае гукаўтварэнне. Перад спевакамі з'яўляецца дырыжор, якога раней не было ў падобных хорах. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае рэпертуар, агульная і музычная адукаванасць удзельнікаў хору. Таму і назіраецца паступовае «згладжванне» мясцовых стыляў і зацвярджэнне адзіных неўчых тэндэнцый. Гэта адносіцца да спецыфікі шматгалосся, да структуры калектыву, да імправізацыйнага прынцыпу «распеву» і, у некаторай ступені, да формаў выступлення хору.

Пры выпрацоўцы адзінай манеры гукаўтварэння, каб дасягнуць добрай ансамблевасці і моцнага харавога гучання, кіраўнікі часам нівеліруюць тэмбры галасоў. Гэты прыём у хорах народнай і масавай песні апраўданы. У народных жа калектывах захаванне тэмбраў партый з'яўляецца істотнай асаблівасцю. Ансамбль народнага хору, па сутнасці,— гэта ўмелае спалучэнне некалькіх тэмбраў.

Возьмем, напрыклад, яскравы ўзор гульні тэмбравых колераў у песні «Скрыпка б не іграла» (харавы калектыў Ліплянскага СК Лельчыцкага раёна), дзе тэмбры галасоў выканаўцаў мяняюцца з развіццём зместу. Пачатак песні выконваецца ў верхнім рэгістры, выкарыстанне ж сярэдняга зрабіла гучанне пёгкім, роўным. Узмацненне драматызацыі зместу ажыццяўляецца падключэннем мікставага рэгістра. А дзякуючы далучэнню груднога рэзанатара гук робіцца яркім і сакавітым. Не мяняючы тэсітуры, хор стварыў драматычны музычны вобраз.

Значыць, тэмбры галасоў у народным хоры маюць вялікую ролю і не павінны нівеліравацца.

У хорах народнай і масавай песні ансамбль павінен складаць адзінае поле. Для выхавання такога ансамбля В. Мігай (Канатопскі СК Нараўлянскага раёна) займаецца з невялікімі групамі (дуэты, трыо, квартэты) з аднароднымі тэмбрамі. Работа з малымі групамі дазволіла кіраўніку ў кароткі тэрмін дасягнуць стройнага, зладжанага гучання хору.

Галоўным момантам у творчай дзейнасці народных хораў з'яўляецца стварэнне песень сіламі асобных таленавітых спевакоў з дапрацоўкай іх у калектыве.

Асобнае значэнне набывае «распяванне» песні — творчы ўдзел спевакоў у яе станаўленні. Пры калектыўнай дапрацоўцы павышаецца цікавасць і захапленне кожнага выканаўцы — гэта, у сваю чаргу, забяспечвае песні яркасць і самабытнасць. Адна і тая ж песня, у сілу мясцовых традыцый, можа набываць зусім розны, непаўторны каларыт, што павышае цікавасць да яе шырокага кола слухачоў.

У многіх хорах існуюць творчыя групы, якія «распяваюць» песню на галасы, ствараюць варыянты тэкстаў. Яны ўрэшце становяцца калектыўным аўтарам песні. Менавіта так парадзілася песня «Лён» у Юравіцкім, «Сабраліся хлебаробы» ў Тураўскім, «Кураняткі» і «Марфута» ў Азершчынскім народных хорах.

Творчая імправізацыя ляжыць у аснове народнага шматгалосся. Спевакі інтуітыўна кладуць «на галасы» песню. У сцэнічных гуртках яна больш прадуманая. Нешта падобнае на імправізацыю ў гурце — «распеў» у народным хоры. Па сутнасці, «распеў» — гэта навык падстройвання свайго голасу да голасу суседа (зліцця з ім ва ўнісон або ў нейкім сугуччы), уменне слухаць сябе і сваіх суседзяў адначасова. Падмацоўваць гэты навык патрэбна спяваннем знаёмых мелодый народнага характару. Выбраную мелодыю лягчэй, натуральна, распець на галасы першапачаткова ў творчай групе, а затым і з усімі харыстамі, як гэта рабіла Т. Лапаціна. Канцэртнае выкананне народнага хору, які такім чынам спеўся, захоўвае самабытны імправізацыйны характар.

Кіраўнік, які не валодае народнай манерай спеваў, павінен сур'ёзна і ўдумліва вывучаць мясцовае неўчае майстэрства: толькі зразумеўшы яго асаблівасці, хормайстар зможа кантраляваць і накіроўваць гучанне хору. У гэтым плане хочацца адзначыць кіраўніка А. Гарбабу (Навасёлкаўскі народны хор Петрыкаўскага раёна), Т. Сыч, П. Калесікава і Н. Галко — хормайстраў груп народнай і масавай песні ГДК і ВДА Рэчыцы, ВТА «Прапа» Гомеля, якія змаглі пераадолець цяжкасці арганізацыі народных хораў у гарадах і пасёлках са змешаным насельніцтвам (вядома, што адзіную манеру лягчэй выпрацаваць у сельскіх калектывах, выхаваных на мясцовых народных неўчых традыцыях). Тут кіраўнікі і спевакі добра вывучылі асаблівасці мясцовага спявання і не толькі прытрымліваюцца метаду перадачы майстэрства адзін аднаму, але і накіроўваюць гэты працэс: дапамагаюць, напрыклад, знайсці контрапункціруючы падгадосак, не пакідаюць па-за ўвагай нелагічны ход або інтэрвал і г. д.

Галоўная каштоўнасць песні — жыццёвая праўда. Ад спевакоў таксама патрабуецца захаваць гэтую праўду. У час канцэртнага выканання змест песні, яе настрой перадаюцца не толькі дынамічнымі і агагічнымі адценнямі, агульнай трактоўкай, але і мімікай, усімі сцэнічнымі паводзінамі спевакоў, ад чаго таксама залежыць вобразная выразнасць твора. Пры ўдумлівых адносінах спевакоў да выконваемай песні іх паводзіны на сцэне павінны быць простымі і натуральнымі. І характар гуку, і выразнасць слова, і фразіроўка—усё гэта звязана з вобразамі песні, якія неабходна данесці да слухача.

Сучасныя народныя хоры вылучаюцца большай разнастайнасцю нюансіроўкі. У прыклад можна паставіць Глушкавіцкі хор, дзе ўдзяляецца вялікая ўвага песні. Але тут работа над выразнасцю не падмацавана адпаведнымі навыкамі, а заняткі над нюансіроўкай ператварыліся ў самамэту, што адмоўна адбіваецца на агульным творчым узроўні калектыву.

Народная песня не любіць павярхоўнай знешняй трактоўкі, лёгкіх эстрадных прыёмаў. Народныя песеннікі спяваюць проста, але ад душы, перажываючы кожную фразу і кожнае слова. Кіраўнікам хораў патрэбна вучыцца ў народа разумнай, стрыманай эканоміі выразных сродкаў.

Праблема самабытнасці цесна звязана з мясцовай выканаўчай манерай. Гэта неабходная якасць сельскага народнага калектыву. Наяўнасць уласных самабытных рысаў, а не прыдуманых і навязаных кіраўніком, дапамагае стварыць свой выканаўчы почырк, свой стыль. Вялікую ролю ў гэтым адыгрываюць вопытныя сталыя спевакі, творчыя групы імправізацыі і распеваў, якія, на жаль, у апошні час паступова знікаюць з хораў. Першачарговая задача кіраўнікоў — захаваць іх, рыхтаваць маладую змену, якая б пераняла вопыт і майстэрства ў гэтых ветэранаў.

Далейшае развіццё творчых здольнасцей такіх маладых спевакоў з апорай на майстэрства вопытных імправізатараў і пастаянны кантроль за імі дазволілі, напрыклад, хормайстрам Н. Сакалову і М. Ліўшыцу дасягнуць плённага выніку пры распяванні традыцыйных і новых песень у лапацінскім хоры. Аднак і тут паступова знікае практыка выхавання «ўмельцаў народных спеваў», што адбіваецца на выканаўчай манеры пры змене кожнага пакалення аматараў і кіраўнікоў.

У практыцы работы хораў назіраецца і такая адмоўная дэталь: усё часцей кіраўнікі хораў адмаўляюцца ад спявання а капэла, а аддаюць перавагу спяванню з суправаджэннем, таму што быццам выканаўцы без інструмента «не чыста інтанніруюць». Нам здаецца, што гэта вынік неўсвядомленага адчування песень. Народныя артысты-аматары, не маючы спецыяльнай падрыхтоўкі, спяваюць надзвычай стройна і чыста, прывыкаючы «думаць песнямі», не надаючы асаблівай увагі голасу. У хорах народнай і масавай песні выхоўваюць голас, агульную музычнасць, прывучаюць выпяваць ноты. У прынцыпе гэта нядрэнна, але тут, відаць, хаваюцца прычыны недаверлівых адносін да народнай песні харавых калектываў змешанай манеры выканання, якія, па сутнасці, не могуць па-сапраўднаму яе спяваць, а значыць, губляюць перазмныя сувязі з ёю.

Народны хор — гэта школа традыцыйнага выканаўчага майстэрства. Каб кіраваць такім складаным працэсам, кіраўнік сам павінен валодаць пэўнымі навыкамі гэтага майстэрства і спалучаць сучасныя агульнапрынятыя прыёмы з «нюансамі» песеннай спецыфікі той мясцовасці, дзе ён працуе з хорам.

В. КУШНЯРЭНКА,
музыказнаўца.

Уладзімір Андрэевіч МАЛАНКІН

Беларускае тэатральнае мастацтва панесла цяжкую страту. 21 сакавіка 1978 года на 49-м годзе жыцця раптоўна памёр заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, загадчык кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, дацэнт, член КПСС Уладзімір Андрэевіч Маланкін.

У 1952 годзе У. А. Маланкін скончыў акцёрскі факультэт Беларускага тэатральнага інстытута, ў 1959 годзе— рэжысёрскі факультэт Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага. Працаваў акцёрам і рэжысёрам Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага, галоўным рэжысёрам Рыжскага тэатра юнага гледача і Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі. З 1962 года, разам з рэжысёрскай работай у тэатрах рэспублікі, ён шмат сіл і творчай энергіі аддае педагагічнай дзейнасці, падрыхтоўцы акцёрскіх і рэжысёрскіх кадраў. За 16 год работы ў тэатральна-мастацкім інстытуце ім выхавана вялікая група маладых майстроў мастацтваў, многія з якіх сёння займаюць вядучае месца ў тэатрах рэспублікі.

У. А. Маланкін паставіў больш трыццаці спектакляў, шэраг яго сцэнічных работ атрымаў высокую ацэнку і стаў значным дасягненнем тэатральнага мастацтва.

Жыццё У. А. Маланкіна абарвалася якраз у той час, калі ён заканчваў работу над пастаноўкай спектакля «Мальер» М. Булгакава на сцэне Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага, рыхтаваў да выпуску чарговы акцёрскі курс.

Светлая памяць аб Уладзіміру Андрэевічу Маланкіну назаўсёды захаваецца ў сэрцах тых, хто з ім працаваў, хто яго ведаў як чалавека, мастака, педагога.

Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР
Міністэрства культуры БССР
Беларускае тэатральнае аб'яднанне
Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут
Дзяржаўны рускі тэатр БССР імя М. Горкага

Калектыў тэатра юнага гледача глыбока смутнае з выпадку смерці былога галоўнага рэжысёра тэатра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, загадчыка кафедры акцёрскага майстэрства і рэжысуры БДТМІ дацэнта МАЛАНКІНА Уладзіміра Андрэевіча і выказвае шчырае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.

СЕЛЬСКІ ДОМ КУЛЬТУРЫ: ПРАКТЫКА, ПОШУК

КАМПАЗІТАРЫ — МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

МАСТАЦКАЯ самадзейнасць... Тысячы і тысячы людзей рознага ўзросту, розных прафесій назаўсёды заручыліся з песняй, з танцам, з музыкай. З кожным годам у рэспубліцы расце колькасць самадзейных мастацкіх калектываў, расце і іх выканаўчае майстэрства. Гэта пацвердзіў і першы Усесаюзны фестываль самадзейнай мастацкай творчасці працоўных, у якім прыняло ўдзел каля 600 тысяч працоўных рэспублікі.

Але, разам з тым, ёсць яшчэ і шэраг фактараў, якія замінаюць станаўленню і творчаму росту многіх самадзейных мастацкіх калектываў. Адна з праблем — абмежаванасць, беднасць рэпертуару хораў і аркестраў. У першую чаргу гэта тычыцца калектываў сельскіх, якія працуюць уводдалі ад буйных культурных цэнтраў.

Пытанне гэта не новае, яно не раз узнімалася на старонках «Літаратуры і мастацтва» ў час асвятлення ходу Усесаюзнага фестывалю. Але па-ранейшаму многія хормайстры і дырыжоры скардзяцца на адсутнасць добрай беларускай сучаснай харавой песні, нацыянальнай інструментальнай п'есы, апрацовак народных мелодый, напісаных спецыяльна для самадзейнасці.

Менавіта гэтым праблемам і было прысвечана пасяджанне «круглага стала» «ЛіМа», якое прайшло ў рамках дыскусійнай рубрыкі штотыднёвіка «Сельскі Дом культуры: практыка, пошук». У пасяджэнні прынялі ўдзел: першы намеснік старшыні праўлення Саюза кампазітараў БССР Ю. СЕМЯНЯКА, кампазітар І. КУЗНЯЦОЎ, народны артыст СССР Г. ЦІТОВІЧ, старшы інспектар упраўлення культуры Мінскага аблвыканкома Х. УНУК, дырэктар рэспубліканскага Дома народнай творчасці Г. ТАЛЧЫНСКАЯ, метадыст Мінскага абласнога Дома народнай творчасці В. БАБАЧКІН, выкладчык Мінскага інстытута культуры В. ТРАМБІЦКАЯ, мастацкі кіраўнік народнага хору Дома культуры Мінскага будаўнічага трэста № 5 С. ДРОБЫШ, кіраўнік аркестра народных інструментаў Боўніцкага сельскага Дома культуры Карэліцкага раёна І. УЛАН, кіраўнік хору Юніцчанскага сельскага клуба Столінскага раёна М. ВАЙЦЯХОЎСКІ, кіраўнік народнай харавой капэлы Лебедзеўскага сельскага Дома культуры Маладзечанскага раёна А. ПЫЖЫК, кіраўнік народнага хору Казловіцкага сельскага Дома культуры Слуцкага раёна А. ДАЎЖОНАК.

ДЛЯ КОЖНАГА КАЛЕКТЫВУ мастацкай самадзейнасці выступленне перад публікай — заўсёды хвалюючая падзея, нават калі гледачы — свае аднавяскоўцы, якія ахвотна даруюць, калі што і не атрымаецца. Удвайне даводзіцца хвалявацца самадзейным артыстам, калі выязджаюць яны з так званым абменным канцэртам за «мяжу» —у суседні сельскі Савет, а то і ў другі раён. Незнаёмая публіка раўніва параўноўвае выступленні гасцей з выступленнямі іх «уласных» артыстаў. Што ж, гэта добра. Здаровае спаборніцтва заўсёды прыносіць плён. Ды толькі здараюцца і казусы...

Пра адзін такі казус расказала ўдзельнікам пасяджэння В. Трамбіцкая. Самадзейныя артысты аднаго з раёнаў Мінскай вобласці выехалі да суседзяў з канцэртам. Рыхтаваліся яны да гэтага канцэрта старанна, і былі ўпэўнены ў поспеху, тым больш, што калектывы—хор, аркестр і танцавальны ансамбль — былі сталыя, добра, як кажуць, спетыя і сыграныя. А тут—дзіва дый годзе: большасць нумароў, асабліва хору і аркестра, слухачы сустракалі раўнадушна. Тлумачылася ж усё проста: госці амаль паўтарылі рэпертуар мясцовых самадзейных артыстаў. Гучалі тыя ж песні Семянякі, Кузняцова, Граса, той жа вальс Андрэева, якія ўжо шмат разоў чула мясцовая публіка.

— Няма выбару,—падтрымаў В. Трамбіцкую І. Улан.—Прыедзеш, бывае, на агляд і робіцца сорамна. Амаль кожны аркестр іграе вальс Андрэева. Журы за гэта крытыкуе нас справядліва, але — дзе выйсце? Мы б з радасцю падрыхтавалі некалькі апрацовак беларускіх песень, толькі дзе іх узяць. Сорамна, але прызнаюся: у нашым рэпертуары з дваццаці пяці твораў толькі тры ці чатыры беларускія.

Пра «рэпертуарны голад» гаварыў і С. Дробыш. Летась яго калектыў паказваў сваю канцэртную праграму на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве. Ацэнку хору далі высокую, але пыталі, чаму няма ў яго рэпертуары сучаснай беларускай песні, прысвечанай рабочаму класу. Калектыў жа прадстаўляе будаўнікоў!

— Сапраўды,—сказаў С. Дробыш, — большасць калектываў выконвае адны і тыя ж песні. Скажам, тую ж «Ты ў сэрцы маім, Беларусь» Граса. Песня неблагая, але ж колькі можна спяваць адно і тое ж?! Хутка пачнецца другі рэспубліканскі конкурс народных калектываў. Па ўмове на ім трэба будзе абавязкова выканаць дзве новыя сучасныя беларускія песні. А іх у нас няма.

— На тое ж самае скардзілася мне і кіраўнік народнай капэлы брэсцкіх настаўнікаў Вінаградава,— дадала В. Трамбіцкая.—Гэта таленавіты калектыў, якому многае пад сілу. Ён выконвае творы сучасных кампазітараў і Расійскай федэрацыі, і Украіны, і Грузіі. А вось сучаснай беларускай песні ў яго рэпертуары, здаецца, няма. А нашы цымбальныя аркестры? Для іх таксама амаль нічога не напісана...

Так, сучасных масавых беларускіх песень, нацыянальных інструментальных твораў сапраўды мала, каб задаволіць патрэбу ў іх соцень самадзейных калектываў. І гэта не можа не выклікаць трывогі. Бо важна не толькі як, але што выконваць, бо тая ж песня ці інструментальная п'еса нясуць не толькі эстэтычную, але і выхаваўчую нагрузку. У дадзеным выпадку маецца на ўвазе прапаганда лепшых здабыткаў нацыянальнай музычнай культуры, выхаванне павагі да яе.

Натуральна, позіркі прысутных былі скіраваны да Юрыя Уладзіміравіча Семянякі і Івана Іванавіча Кузняцова. Папершае, таму, што першы з іх з'яўляецца адным з кіраўнікоў Саюза кампазітараў рэспублікі, і, па-другое, таму, што І Ю. Семяняка, і І. Кузняцоў асабіста нямала зрабілі і робяць у жанры сучаснай харавой і сольнай песні. Адным словам, людзі ў гэтай справе кампетэнтныя.

Абодва яны пагадзіліся, што крытыка ў адрас кампазітараў, якая прагучала за «круглым сталом», мае пад сабой глебу.

— Я з'яўляюся членам рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры рэспублікі, членам мастацкага савета рэспубліканскага Дома народнай творчасці, — сказаў Ю. Семяняка, — і магу засведчыць: нашы кампазітары амаль не звяртаюцца да жанру харавой масавай песні. Ды і не толькі песні. Вельмі нямногія ў нас пішуць інструментальную музыку, якую б маглі выконваць самадзейныя аркестры.

Красамоўныя лічбы прывёў у сваім выступленні І. Кузняцоў. Ён падлічыў, што за апошнія пяць гадоў прафесійнымі кампазітарамі рэспублікі было напісана для хору 12 акапэльных твораў і 30 песень. За той жа час «выдадзена на-гара» 170 сольных песень для эстраднага выканання.

— Я быў на адным з апошніх пасяджэнняў рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры,—расказаў ён. —Былі паказаны дзесяткі песень—і ўсе сольныя, для эстрады.

Чаму ж кампазітары аддаюць перавагу эстраднай песні? Пра некаторыя прычыны гэтага гаварылі за «круглым сталом» А. Пыжык і А. Даўжонак.

— Чаму кампазітары з ахвотай бяруцца за эстрадную песню?—спытаў А. Пыжык.—На маю думку, таму, што эстрадныя песні па многу разоў гучаць і па радыё, і па тэлебачанню, і з эстрады, што прыносіць іх аўтару не толькі маральнае задавальненне...

Нібы працягваючы яго думку А. Даўжонак гаварыў аб тым, што наогул прапаганда самадзейнай творчасці па радыё, тэлебачанню і ў друку пастаўлена не лепшым чынам. Калі-нікалі па радыё яшчэ можна пачуць паасобныя творы ў выкананні самадзейных артыстаў, а вось разгорнуты расказ аб творчасці якога-небудзь самадзейнага калектыву — ужо зусім вялікая рэдкасць.

— Я хачу тут падкрэсліць і яшчэ адно,—дадаў І. Кузняцоў.—Песню, напісаную для самадзейнага хору, прабіць праз «інстанцыі» куды цяжэй, чым, скажам, эстрадны твор, і па тэхнічных прычынах. Бывае, што і добрая харавая песня, калі яе выканаць на раялі, губляе многія свае фарбы.А хор жа не прывядзеш на камісію...

На думку некаторых удзельнікаў пасяджэння (Г. Цітовіч, Х. Унук, І. Улан), Саюз кампазітараў, рэспубліканскі і абласны дамы народнай творчасці пакуль што мала робяць для творчага стымулявання кампазітараў у гэтым напрамку. Пэўны плён, напрыклад, маглі б даць конкурсы на лепшую масавую песню, але яны праводзіліся даўным-даўно. Не практыкуецца ў апошнія гады і замацаванне кампазітараў за самадзейнымі калектывамі ў парадку шэфства.

— Некалі многія кампазітары,— гаварыў Х. Унук,—мелі «сваё» калектывы, дапамагалі ім фарміраваць рэпертуар, пісалі для іх песні, музыку. Цяпер такіх прыкладаў, бадай што, няма. А, між тым, ад такой сувязі творча ўзбагачаецца не толькі хор ці аркестр: непасрэдны кантакт з «глыбінкай» узбагачае і самога кампазітара.

— Іван Іванавіч Кузняцоў, — дадаў В. Бабачкін,—у садружнасці з Казловіцкім хорам стварыў чатырнаццаць песень. Сярод іх такія вядомыя, як «Весела ў Казловічах», «Край Случанскі», якія трывала ўвайшлі ў рэпертуар казлавічан.

І. Кузняцоў заўважыў на гэта, што яму там сапраўды плённа працавалася, бо пісаў ён, ведаючы магчымасці калектыву, яго манеру выканання.

Творчая садружнасць кампазітара з пэўным калектывам мае для самадзейных артыстаў вялікае значэнне. Пра гэта гаварылі многія ўдзельнікі пасяджэння.

— Мне давялося сустракацца з такімі фактамі,— сказаў Г. Цітовіч.—Вы, мабыць, ведаеце, што ў Баранавіцкім, Пінскім, Івацэвіцкім раёнах ёсць неблагія фальклорныя гурты. Але некаторыя з іх выконваюць, бывае, песні, характэрныя не для дадзенай мясцовасці, а, скажам, для Гомельшчыны. Вось тут і патрэбна была б кансультацыя, дапамога кампазітара — знаўцы мясцовага песеннага фальклору. Нельга забывацца і на тое, што кожнаму калектыву хочацца мець твор, напісаны спецыяльна для яго. Таму так раўніва аберагаюць харысты, музыканты «сваю» песню, «сваю» музычную п'есу ці апрацоўку.

— Яшчэ як!—не стрымаўся С. Дробыш.—Неяк я папрасіў кіраўніка вядомай у Мінску народнай харавой капэлы Дрынеўскага падзяліцца новай песняй «Добры дзень». Дык ён адмовіў. Сказаў: «Мы праспяваем, тады бярыце». Спачатку я пакрыўдзіўся, а потым падумаў, што, відаць, мой калега меў рацыю. Кожнаму ж калектыву хочацца мець сваю песню—прэм'еру.

Зайшла за «круглым сталом» гаворка і аб рабоце самадзейных кампазітараў, якіх нямала ў рэспубліцы. У свой час Ю. Семяняка выступіў у «Літаратуры і мастацтве» з артыкулам, у якім прасачыў сучасныя тэндэнцыі ў творчасці сваіх самадзейных калег, выказаў шэраг заўваг і прапаноў, якія, канечне, прынясуць карысць. Але, як паказала гаворка на пасяджэнні, тэма гэта далёка не вычарпана. Многія нашы самадзейныя кампазітары адчуваюць вострую патрэбу ў кваліфікаванай дапамозе.

Пра гэта, у прыватнасці, гаварыў М. Вайцяхоўскі (чалавек ён здольны — кіруе народным хорам сельскага клуба, сачыняе песні, адна з якіх уключана ў рэпертуар Дзяржаўнага народнага хору БССР):

— Некалі праводзіліся семінары самадзейных кампазітараў. Цяпер жа, чамусьці, нас не збіраюць. А як хочацца, бывае, пагутарыць і са сваім братам-самадзейнікам, і павучыцца, як распісаць, скажам, песню для хору, бо сам я баяніст, а не харавік...

Г. Талчынская зрабіла спробу «паправіць» яго, даказваючы, што дамы народнай творчасці некалькі разоў збіралі трохдзённыя семінары самадзейных кампазітараў. Але М. Вайцяхоўскага справядліва падтрымалі Г. Цітовіч і С. Дробыш, якія заўважылі, што памагаць самадзейным кампазітарам трэба больш грунтоўна, з прыцягненнем вядучых спецыялістаў.

БЫЛА ЗАКРАНУТА за «круглым сталом» яшчэ адна немалаважная праблема: выданне музычнай літаратуры, «давядзенне» яе да калектываў. Многія ўдзельнікі пасяджэння адзначалі, што нават тыя песні, інструментальныя творы і апрацоўкі, якія ўжо напісаны, набыць вельмі цяжка.

Праўда, згодна з паведамленнем Г. Талчынскай, рэспубліканскі Дом народнай творчасці робіць у гэтым напрамку нямала. Тут працуюць творчыя секцыі па жанрах. Толькі летась Дом набыў 20 харавых твораў, якія будуць рассылацца ў выглядзе лістовак. Рыхтуецца зборнік пералажэнняў для духавога аркестра, аркестра народных інструментаў, інструментальных ансамбляў.

— Калі гаварыць пра нашы планы, — паведаміла Ганна Мікітаўна, — дык адзначу, што да 1980 года мы рыхтуем тэматычныя рэпертуарныя зборнікі, прысвечаныя святам маладзёжнай песні, песні аб працы і дружбе народаў, святам музыкі...

Аднак Ю. Семянка, В. Трамбіцкая, І. Улан, Х. Унук, І. Кузняцоў, С. Дробыш выказалі меркаванне, што Г. Талчынская настроена празмерна аптымістычна. Вельмі цяжка знайсці, напрыклад, добры рэпертуарны зборнік з творамі для аркестраў, асабліва цымбальных. Між тым, цымбальныя партытуры ляжаць у Доме народнай творчасці без руху ўжо тры гады. Такі ж лёс напаткаў тут і дваццаць твораў для аркестраў народных інструментаў.

— Нас павінен курыраваць Гродзенскі абласны Дом народнай творчасці, — гаварыў І. Улан. — Але дапамагае ён мала. Нават тое, што там ёсць, даходзіць да нас з вялікім спазненнем. Скажам, толькі ў верасні мінулага года мы атрымалі з АДНТ некалькі твораў, якія павінны былі выканаць да 60-годдзя Кастрычніка. Не ведаю, як у прафесіяналаў, а ў самадзейных музыкантаў так хутка ўсё не робіцца. Калі пачынаеш гаварыць пра гэта з работнікамі Дома народнай творчасці, дык яны спасылаюцца на розныя аб'ектыўныя прычыны. А вось аднойчы мы звярнуліся ў Кіеў — у іх рэспубліканскі Дом народнай творчасці — з просьбай даслаць нам некалькі інструментальных твораў. І што вы думаеце? Праз тыдзень-другі наш заказ быў задаволены: мы атрымалі некалькі апрацовак народных украінскіх мелодый. Прычым, апрацоўкі былі зроблены спецыяльна для самадзейнага аркестра.

А вось што расказаў І. Кузняцоў:

— Да шасцідзесяцігоддзя Кастрычніка рэспубліканскі Дом народнай творчасці заказаў мне скласці зборнік з шасцідзесяці песень. Патраціў на гэта шмат часу, перагарнуў горы матэрыялу. Зрабіў. І што ж? Лёс зборніка дагэтуль невядомы...

Шмат скаргаў выказалі ўдзельнікі пасяджэння ў адрас музычнай рэдакцыі выдавецтва «Беларусь», якая «трымае манаполію» на выданне музычнай літаратуры ў рэспубліцы.

— Помню, некалі яна выпускала падпісныя выданні, — гаварыў той жа І. Кузняцоў. — Гэта былі песні розных жанраў, інструментальныя п'есы — тыражом да 20 тысяч экземпляраў. Цяпер чамусьці гэтую практыку скасавалі. Тут практыкуюць выданне асобных аўтарскіх зборнікаў. Аўтарам, вядома, гэта падабаецца, але ж ёсць інтарэсы больш значныя.

...Як бачым, асноўнай тэмай гаворкі за «круглым сталом» было пытанне: кампазітар — мастацкай самадзейнасці. Тэма ёмістая, шматзначная. Гэта падкрэсліў, у прыватнасці, Генадзь Іванавіч Цітовіч.

— Бясспрэчна, — сказаў ён, — сучасных песень у нас мала, і вінаваты ў гэтым, вядома, кампазітары. Але ж нельга закрываць вочы і на тое, што нашы беларускія паэты вельмі мала пішуць вершаў для песень.

Можна пагадзіцца, што выбар добрых «песенных» вершаў сапраўды абмежаваны, але што іх амаль няма — гэта перабольшанне. Варта пагартаць зборнікі многіх беларускіх паэтаў, сталых і маладых. Мы не кажам ужо аб россыпах песенных паэтычных жамчужын Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, многія з якіх даўно «просяцца» ў песню.

Так, гаворка за «круглым сталом» «ЛіМа» адбылася шчырая, зацікаўленая. Будзем спадзявацца, што яна прынясе практычны плён. Гэта, урэшце, самае галоўнае.

М. ЗАМСКІ.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

ГЕНІЙ СКАНДЫНАЎСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Да 150-годдзя з дня нараджэння Г. ІБСЕНА

У гісторыі не толькі скандынаўскай, але і сусветнай літаратуры і тэатра імя Генрыка Ібсена займае адно з самых пачэсных месцаў. Народжаны ў краіне, якая ў той час амаль не цікавіла еўрапейскае грамадства, ён, застаўшыся нарвежцам, здолеў пераадолець нацыянальную абмежаванасць, пакарыў еўрапейскага гледача, стварыў цэлы напрамак на еўрапейскай сцэне — рэалістычную сацыяльна-псіхалагічную драму.

Светаадчуванне Ібсена было прасякнута трагізмам і ваяўнічым настроем. Жыццё ўяўлялася яму ў выглядзе суровай і безупыннай барацьбы цёмных і злавесных сіл супраць усяго гераічнага і ўзвышанага, што ёсць у чалавеку. Адсюль пэўны песімізм Ібсена, але гэты песімізм не безнадзейны. Менавіта ў барацьбе са злом і пошласцю бачыў драматург прыгажосць і сэнс жыцця. У нягодах і барацьбе выкрышталізоўваюцца магутныя, не здольныя на кампраміс характары Ібсена, выяўляецца індывідуальнасць чалавека.

«Я заўсёды люблю буру», — гаварыў Ібсен. Кожны з твораў драматурга пацвярджае гэтую ісціну. Няхай барацьба цяжкая і нават бесперспектыўная, а мэта неакрэсленая і аддаленая, але шлях да ідэалу толькі ў барацьбе, і Ібсен настойліва шукаў герояў, якія імкнуцца да светлай будучыні.

Ібсен нарадзіўся 20 сакавіка 1828 года ў невялікім гарадку Шыене ў сям'і камерсанта. У 15-гадовым узросце, пасля банкруцтва бацькі, ён вымушаны быў пачаць самастойнае працоўнае жыццё. Рэвалюцыйныя падзеі 1848—1849 гадоў у Заходняй Еўропе ўзрушылі юнака Ібсена, і ён адгукнуўся на іх шэрагам рамантычна-бунтарскіх вершаў («Да венграў», «Абуджайцеся, скандынавы!»). У 1850 годзе Ібсен піша вершаваную гістарычную драму «Катыліна», прасякнутую пафасам барацьбы супраць тыраніі.

Пасля пераезду ў Хрысціянію (цяпер г. Осла) Ібсен актыўна ўдзельнічае ў палітычным жыцці краіны, зближаецца з рабочым рухам, выдае апазіцыйную газету «Таварыш», за што ледзьве не быў арыштаваны.

З 1851 года Ібсен — мастацкі кіраўнік і рэжысёр першага ў гісторыі Нарвегіі нацыянальнага тэатра ў Бергене, а з 1857 года — тэатра ў Хрысціяніі. З гэтым перыядам яго жыцця звязана стварэнне цыкла гісторыка-рамантычных драм, сюжэты якіх запазычаны з нацыянальнай гісторыі старажытнаскандынаўскіх сагаў і легендаў («Фру Інгер з Эстрата», «Баль у Сульхаўгу», «Улаф Лільекранс», «Барацьба за трон»).

З 1864 па 1891 год Ібсен жыў за мяжой (Італія, Германія). Тут былі створаны яго лепшыя п'есы, і сярод іх — славутыя сацыяльна-філасофскія драматычныя паэмы «Бранд» і «Пер Гюнт».

Герой драмы «Бранд» — чалавек выключнай волі і характару. Яго ваяўнічы, актыўны дух народжаны суровай прыродай Скандынавіі. «Усё альбо нічога» — гэты дэвіз Фаўста, Манфрэда і Каіна — зноў паўтараецца ў вуснах пастара Бранда. Герой Ібсена ахоплены неадольным імкненнем дапамагчы людзям знайсці дарогу да светлага будучага. Але ідэал Бранда, як і ідэалы ўсіх летуценнікаў Ібсена, ілюзорны, а шлях яго дасягнення невядомы герою. П'еса заканчваецца трагічнай гібеллю Бранда, які перад смерцю ўсведамляе бясплённасць свайго індывідуалістычнага бунту.

Пер Гюнт — герой аднайменнай драмы Ібсена — адначасова і казачны персанаж, і нарвежац другой паловы XIX стагоддзя, сучаснік драматурга. Гэта поўная процілегласць Бранда. У Перу Гюнце ўвасоблены тыя найгоршыя рысы нарвежскага і ўвогуле еўрапейскага мешчаніна, супраць якіх так бязлітасна паўставаў Ібсен. Пер Гюнт не змог застацца «самім сабой», у блуканнях па свету ён растраціў усё добрае, што ў яго было, і толькі каханая, Сольвейг — увасабленне вечна юнай бацькаўшчыны Нарвегіі — выратоўвае яго ад жудаснай кары, якую ён заслужыў за ганебныя ўчынкі.

У класічным сваім выглядзе рэалістычная сацыяльна-псіхалагічная драма Ібсена афармляецца ў канцы 70-х — пачатку 80-х гадоў. Лепшым п'есам гэтага перыяду характэрны палымяны пратэст супраць з'яў, якія былі распаўсюджаны ў буржуазна-ліберальным асяроддзі таго часу. Большасць герояў Ібсена — гэта сумленныя ідэалісты, якія ўступаюць у канфлікт з драпежніцкім грамадствам, з яго мараллю, нормамі паводзін і інтарэсамі. Але яны так і застаюцца ў трагічнай адзіноце.

Пафасам сатырычнага выкрыцця крывадушных буржуа прасякнута драма «Стаўпы грамадства». У п'есе «Лялечны дом», надзвычай смелай для свайго часу, Ібсен узняў пытанне аб раўнапраўі жанчын, праўда, толькі ў межах сям'і. Праблеме буржуазнага шлюбу прысвечана драма «Здані». Страсная пропаведзь свабоды асобы спалучаецца ў камедыі «Вораг народа» з гнеўным выкрыццём карупцыі, прадажнасці буржуазнай прэсы, эгаізму ўласнікаў.

Глыбіня пастаноўкі вострых сацыяльна-псіхалагічных праблем, перакананы дэмакратызм, палымяная абарона правоў чалавека, тонкасць і трапнасць псіхалагічных характарыстык прынеслі гэтым п'есам Ібсена сусветную вядомасць.

Познія псіхалагічныя драмы Ібсена «Дзікая качка», «Росмерсхальм», «Жанчына з мора» вызначаюцца абстрактна-філасофскімі абагульненнямі, рэалістычная фантастыка і сімволіка спалучаюцца з містычнымі дэкадэнцкімі матывамі. Драма «Калі мы, мёртвыя, абуджаемся», якую Ібсен назваў драматычным эпілогам, падвяла вынік вялікай духоўнай рабоце ўсяго яго жыцця.

Памёр Ібсен 23 мая 1906 года.

П'есы вялікага нарвежскага драматурга трывала ўвайшлі ў рэпертуар буйнейшых тэатраў свету. Выдатныя сцэнічныя вобразы герояў Ібсена стварылі Г. Фядотава, М. Ярмолава, В. Камісаржэўская, В. Кніпер-Чэхава, К. Станіслаўскі, В. Качалаў. На сцэне Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Купалы была ажыццёўлена пастаноўка п'есы Ібсена «Нора» («Лялечны дом», 1954). Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Я. Коласа ў 1940 годзе ставіў спектакль па п'есе «Здані».

Варыс МІЦКЕВІЧ.

ФАНТАСТЫКА, ПРЫГОДЫ

Павел Вежынаў

ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ!

НАВУКОВА-ФАНТАСТЫЧНАЯ АПОВЕСЦЬ

Людзі розных, вельмі і вельмі аддаленых часоў, Іна і Баян з цяжкасцю разумелі адно аднаго, што аднак не перашкодзіла Іне прыняць запрашэнне Баяна пасяліцца ў яго хаціне.

(Працяг. Пачатак у №№ 10, 11).

— Хочаш, я злаўлю яго?

— Злаві! — узрадавалася яна спачатку.

Баян асцярожна паставіў на зямлю сакваяж. Легкадумны матылёк увесь, здавалася, аддаўся мроям, і яго, бадай, можна будзе спаймаць у прыгаршчы.

— Не! — усклікнула раптам дзяўчына. — Не трэба! Прашу цябе, не чапай! Ты яго загубіш...

Яго хаціна была скідана з грубых, неачэсаных бёрнаў і накрыта кулявой саломай — простая, несамавітая на выгляд хатка, але Іна разглядала яе з пачуццём вялікай пашаны. Яна спынілася за некалькі крокаў ад парога і, уражаная, моўчкі дзівілася на незвычайную будыніну. Баян пачаў ужо занепакоена азірацца — ці не напалохаў яе свойскі вуж, які часта прыпаўзаў да парога пагрэцца на сонейку. Не, цяпер яго не відаць было, і з хацінай нічога не сталася, толькі сёння яна выглядала вельмі ўжо няўтульнай і беднай. Ужо даўно трэба было акарыць сцены, у акно ўставіць раму, ды ўсё няма калі. Дзверы таксама зроблены на скорую руку — з камлёў маладых бярозак, падагнаных і звязаных пяньковай вяроўчынай. Усе паляўнічыя свае хаціны будавалі так — на скорую руку, без лішніх аздобаў. Ды і не думаў ён тады, што надоўга застанецца жыць тут, на самоце, у лесе.

— Значыць, ты тут і жывеш? — нарэшце парушыла маўчанне Іна.

— Тут і жыву, — адказаў ён, з трывогай думаючы, што зараз яна павернецца і пойдзе.

— Гэта ж сапраўды, як у старых казках, проста не верыцца, — разважала яна, не заўважаючы яго трывогі. — Толькі курыных лапак не хапае... Няўжо сам будаваў?

— Ну, не зусім сам, хлопцы памагалі...

Ён усунуў руку ў адтуліну з боку дзвярэй, адшчапіў з сярэдзіны. Іна першай увайшла ў паўзмрок хаціны, агледзелася. Перш за ўсё кінулася ў вочы месца, дзе гаспадар адпачываў, — шырокае ложа, засланае мядзведжымі шкурамі, з вялікай барвовай падушкай у галовах — відаць, з грубага даматканага палатна. У куце грувасцілася печ — вялікая і прысадзістая, бы няўклюдная жывёліна на задніх лапах. Была ў хаце і сякая-такая мэбля: нешта, падобнае на шафу, цяжкі, акаваны меднымі палосамі куфар. У другім кутку да самай столі былі навалены нявыробленыя шкуры. Іна хутка агледзела ўбранства хаціны, дзе мусіла жыць, і яе ўвагу прыцягнуў выстраены на паліцы гліняны посуд. Яна доўга круціла ў руках глыбокую місу — паніцу, якую аздабляў тонкі ўзор.

Баян выйшаў, а вяркуўшыся неўзабаве з абярэмкам дроў, застаў госцю ўжо не ў такім узвышаным настроі, як пакінуў. Яна стаяла, прыкрыўшы твар далонямі, і з вінаватым тонам паскардзілася:

— Баян, тут нечым вельмі.... пахне.

— Гэта шкуры сохнуць... Добра, я вынесу іх, толькі ў печы запалю.

— А навошта паліць? Цяплынь жа такая!

— Дзіўная ты, Іна... А есці згатаваць трэба?

— Баян, ты хочаш засмажыць тую прыгожую птушку? — устрывожылася адразу Іна.

— Прыгожую ці непрыгожую — есці нешта трэба.

— Не, не! — заявіла рашуча дзяўчына. — Я не хачу...

— Лепш галодная будзеш?

— Не буду галодная, у мяне ёсць таблеткі.

— Што значыць таблеткі? Якія таблеткі? — здзівіўся Баян.

Іна адкрыла сакваяж і дастала прыгожую бляшанку, асцярожна высыпала на далонь некалькі ружовых кружочкаў....

— Выкінь гэтую брыду! Смеху варта, ці ж такімі бубачкамі пражывеш — богу душу аддасі! Паспытай, які смажаны фазан смачны. Мы яго спачатку абварым, потым засмажым у масле. Пальчыкі аблізеш!

— Яшчэ што скажаш! Я ніколі не аблізвала пальцы...

— На гэты раз давядзецца, як пакаштуеш....

Баян пачаў заліхацца каля печы і хутка развёў агонь. Праўда, на першым часе з печы пацягнула дымам, Іна з непрывычкі некалькі разоў чхнула, але гаспадар, захоплены печчу, пра госцю нібыта забыўся і не звярнуў на тое ўвагі. Дзяўчына пастаяла ў нерашучасці, потым стомлена прысела на драўлянную лаўку, чакаючы, што ж будзе далей. Усё, што з ёй адбывалася, нагадвала сцэны і сюжэты старых раманаў, якія даводзілася чытаць. Юнак тым часам нагрэў вады, пераліў у вядро і без ніякага жалю плюхнуў у кіпень забітую птушку. Іну аж перасмыкнула, але яна неяк сцяпела, нічога не сказала. Толькі калі ён пачаў заўзята аскубаць пер'е, не вытрымала:

— Баян, што ты робіш? Жорстка і негуманна абыходзіцца так з няшчаснай птушкай. І скажу шчыра, табе гэта зусім не да твару...

— Ды яна ж нежывая! Ёй ужо ўсё роўна, яна нічога не адчувае.

— Якая розніца? Як бы там ні было, гэта жорстка і непрыгожа. Бачу я — варвары ўсё ж ёсць варвары...

Пачуўшы такое, Баян змяніўся з твару і ўпершыню глянуў на Іну непрыязна:

— Прашу цябе не гаварыць так, — азваўся ён глуха. — Так кажуць пра нас візантыйцы. А самі яны больш за нас жорсткія і неміласэрныя. Мы, славяне, жывём па-брацку і ваюем толькі тады, калі нас да гэтага прымушаюць....

Іна зразумела, што, не падумаўшы, кранула яго за жывое. Ён, бясспрэчна, мае па-свойму рацыю — канечне ж, візантыйцы, якія знаходзіліся на больш высокай ступені цывілізацыі, павінны былі быць і больш жорсткімі ў тых умовах. Гэта ж заканамерна...

— Даруй, Баяне....

Баян аднак нібы прапусціў міма вушэй яе гэтыя словы і спытаў пра тое, што яго больш за ўсё дзівіла:

— Чаму ты так птушак шкадуеш? Хіба ў вас і птушак няма?..

Ён упарадкаваў нарэшце дзічыну і паставіў у печ. Іна не магла больш трываць усяго гэтага і выйшла, прымасцілася на краёчку лаўкі ля сцяны.

(Працяг у наступным нумары).

Вясновая паводка.

Фота А. ГЛІНСКАГА.

ТУДЭМА — СЮДЭМА...

РЫХТАВАЦЦА да таго, аб чым тут пойдзе гаворка, мы пачалі яшчэ месяцы за два. Мы — гэта мужчыны нашага аддзела. А паколькі ў аддзеле няма ніводнай жанчыны, то атрымліваецца — увесь калектыў у поўным складзе.

А пачалося ўсё а таго, што недзе неўзабаве пасля Новага года наш шэф, наогул чалавек не гаваркі, сказаў перад намі цэлую прамову:

— Не сакрэт — калектыў наш працавіты, дысцыплінаваны, згуртаваны. Гэта добра. Але ўсё гэта — службовы бок справы. Толькі ў наш век гэтага мала. Трэба, каб станоўчыя якасці чалавека ў поўнай меры праяўляліся і ў асабістым, так сказаць, інакш — ніякай гармоніі. Аднабаковасць нейкая атрымліваецца...

Мы слухалі свайго шэфа, моўчкі пераглядваліся і не разумелі, да чаго ён хіліць. А ён, тым часам, пытаецца:

— Скажыце, таварышы, якая сусветнавядомая знамянальная дата наперадзе?

Мы задумаліся. Непрыемная паўза пагражала зацягнуцца. Але Іван Іванавіч, наш эканаміст з астранамічным хобі, нарушыў цішыню:

— 17 лістапада споўніцца 378 гадоў з дня пакарання смерцю Джардана Бруна...

Шэф адмоўна пакруціў галавой і кінуў пагардліва-знішчальны позірк у бок няўдалага паклонніка зорак і планет.

СЮРПРЫЗ

Тут мяне як чорт за язык тузануў, і я выпаліў:

— 18 сакавіка спаўняецца 56 гадоў з часу заснавання ў Маскве абутковай фабрыкі «Парыжская камуна».

Мае словы патанулі ў дружным пяцігалосым рогаце. Я не пакрыўдзіўся на калег. І сапраўды, якое дачыненне маюць чаравікі, няхай сабе самыя моцныя і нават са Знакам якасці, да нашага завода металавырабаў?

Выручыў нас статыстык Качан, які ўвесь гэты час употай гартаў лістка настольнага календара і патрапіў на чырвоную лічбу 8 у сакавіку месяцы. Ён і абнародаваў гэту дату.

Шэф спярджальна кіўнуў галавой. Для прыліку паўшчуваў нас за такую няўважлівасць да прыгожага полу і ўнёс прапанову адзначыць урачыстасць у сямейных абставінах і, само сабой зразумела, уручыць нашым шаноўным жонкам падарункі.

Згода была аднадушнай, і мы неадкладна прыступілі да вырашэння практычных пытанняў. Пасля некаторых дэбатаў было вырашана: сродкі на падарункі і ўсё іншае павінны быць адшуканы з нашых унутраных рэзерваў і ні ў якім разе не закранаць сямейнага бюджэту. Патрэбную суму кожны з нас павінен сэканоміць на індывідуальным спажыванні. На думку шэфа, гэта павінна спрыяць сакрэту нашай задумы і тым самым павялічыць значнасць эфекту самога сюрпрыза.

Праўда, не абышлося без некаторых эксцэсаў: узбунтаваўся Іван Іванавіч. Яму, маўляў, няма на чым сэканоміць. Але калектыўнай думкай мы падказалі яму выйсце: параілі замест двух куфляў піва ў дзень спажываць толькі адзін. Гэта дасць яму толькі за адзін месяц 6 рублёў і 60 капеек. А калі адмовіцца і ад другога, то зможа пакласці ў падарункавы фонд у два разы больш.

За тыдзень да свята мы сабраліся зноў. На гэты раз, каб канчаткова высветліць нашы грашовыя рэсурсы і скласці аптымальны каштарыс іх расходавання. Касавы збор аказаўся досыць значны.

Прыступілі да абмеркавання галоўнага — якія падарункі набыць? Тое, што рэчы павінны быць аднолькавыя, як па наменклатуры, так і па кошту, разумелася само сабой. Але гэта якраз і ўскладняла задачу. Высветлілася, што набыць шэсць падарункаў-блізнят, якія б адпавядалі ўсім патрабаванням, прытым набыць у час, які застаўся да свята, практычна немагчыма. Тое ж, што можна купіць у любы час, каштавала столькі, што ад нашага бюджэту заставаліся толькі рожкі ды ножкі.

Мы апынуліся ў тупіку. Было ўнесена і адхілена многа прапаноў. Мне карцела прапанаваць звярнуцца за дапамогай да камп'ютэра, але, успомніўшы сваё фіяска з абутковай фабрыкай, прамаўчаў.

Выручыў нас усё той жа Качан. Ён унёс прапанову: купіць шэсць самых дарагіх святочных паштовак. На іх напісаць тушшу прыгожым почыркам прачулы віншавальны тэкст. Рэшту грошай пусціць на святочнае застолле.

На тым і парашылі.

Антон РАЯНТОВІЧ.

ФРАЗЫ

Талент — гэта агульнаграмадская ўласнасць, якой карыстаюцца ў адзіночку.

●

Цікава, што ў развіцці літаратуры больш за ўсіх птушак павінны гусі. Гусакі пастаўлялі выдатнае гусінае пяро, а гускі натхнялі паэтаў на лебядзіныя песні.

●

Люстэрка. Гэта інструмент самакрытыкі, а таксама сродак да самалюбавання.

●

Будзільнік. Яму ўдзячны за тое, што не спазніліся, але бурчым за тое, што разбудзіў.

В. ЛІПНЕВІЧ.

●

Я гатоў дакапацца да ісціны. Але дзе капаць?

●

Калі чалавек думае ўсё жыццё, чым бы заняцца, значыць, ён мысліць.

●

Пункт погляду добры, калі трымаецца на пункце апоры.

Д. НАХАМКЕС.

Паўло ГЛАЗАВЫ

СУЧАСНЫ ВОРАН

Воран сала дзесь дастаў
Грам, напэўна, з дзвесце,
На асіне прымасціўся
І сабраўся есці.
Раптам выбегла з кустоў
Рыжая лісіца—
Захацелася і ёй
Салам пажывіцца.
Кажа ворану яна:
— Прад табой—аж млею!
А без голасу твайго—
Опера збяднее.
Заспявай жа, дарагі,
Я цябе ўмаляю.
Твой магутны барытон
Я люблю і знаю.
Воран сала палажыў,
Быццам на паліцу,
Моцна лапаю прыціснуў
І сказаў лісіцы:
— Бачу, бачу, што табе
Закарцела сала.
Хопіць з цябе і таго,
Што мой сыр украла.
І не думай, што ў адной
Цяпер розум хітры:
Хочаш, каб табе спяваў,—
Прынясі паўлітра!

Пераклаў з украінскай М. БАЗАРЭВІЧ.

Барыс ЧАМЛАЙ

ПАГАНЫ ЧЫТАЧ

— Паганы зараз стаў чытач!—
Паэт паскардзіўся другому.—
Мой новы зборнік, хоць ты плач,
Ляжыць ў кнігарнях нерухома.

Пераклаў з украінскай М. МІРАНОВІЧ.

Віктар ШАЎЧЭНКА

СУПЕРВЕК, АБО АКНО З КРАТАМІ

Мы спяшаемся. Раніцай — на працу. З працы — да экрана паліраванай скрыні, дзе сёння, заўтра і заўжды або суперматч: канадскія профі — нашы хлопцы, або паядынак суперменаў: Штырліц — Мюлер, або...

Мы рэдка ходзім у госці, у тэатр, у кіно. Мы наогул не ходзім. Хаду замяніў супербег да чарговай тэлеперадачы.

Я імчуся, пазіраючы на супергадзіннік «Электроніка». Насустрач мне, робячы тое ж самае, імкліва рухаецца незнаёмая Яна. Мы кідаем позіркі адзін на аднаго. Мой камп'ютэр-галава выдае мне інфармацыю, што Яна — прыгожая, супермодная, яшчэ маладая, відаць, незамужняя, што Яна, можа, — мой лёс, але праз долі секунды мы пралятаем міма адзін аднаго і ўжо ніколі больш не сустрэнемся ў гэтым людскім суперпатоку.

Праз некалькі мінут мы падымаемся ў суперліфтах у свае пустыя кватэры і робім, прыкладна, адно і тое ж: не распранаючыся, уключаем тэлевізары, сілкуемся суперканцэнтратамі, чытаем газетныя загалоўкі, бяром у рукі кнігі, якія сёння купілі ў кнігарнях, разглядаем супервокладкі, а на большае нас не хапае. Пачынаецца!

Святлана Маргунова, пан Гімалайскі, Ірына Радніна, Леў Лешчанка, Пал Палыч Знаменскі, Уладзімір Мулявін, Юрый Сянкевіч, Філ Эспазіта, Філя, цёця Валя і іншыя без спросу прыходзяць да нас у госці і мы ветліва прымаем іх, уступаем ім самае пачэснае месца — кут.

Тэлевізар — гэта акно ў свет!

— Хачу на прыроду! На лыжню! — крычу ў роспачы.

А ён, мой унутраны голас, спакойна заўважае:

— А па тэлевізару — мастацкі фільм.

— Але ж я ўжо глядзеў яго разы тры, — спрабую вяла спрачацца.

— Але ж і фільм добры, — настойвае ўнутраны голас.

— Ну, тады ў наступную суботу абавязкова на лыжы, — уздыхаю і саджуся перад гэтай аднавокай пачварай, перад гэтым цыклопам і гляджу фільм, які ведаю на памяць.

Мог бы і яшчэ напісаць, але, выбачайце, — пачынаецца цікавая тэлеперадача. Раю ўключыць тэлевізары.

Андрэй ЛЕШЧАНКА

НАРОДНЫЯ ЎСМЕШКІ

ЧАМУ СМЕЦЦЕ Ў ХАЦЕ

—Хачу, Аўдоля, я дазнацца,
Чаму ў цябе так брудна ў хаце?
— Бо мы, хоць сварымся з Антосем,
А смецця з хаты не выносім.

ХАЛАСЦЯЦКІЯ ПРЫЧЫНЫ

— Чаму дасюль ты нежанаты?
— Няма машыны яшчэ ў Наты.
Не ўмее Стася гатаваці,
У Ганны дужа злая маці,
Слабы заробак у Мальвіны,
Благі характар у Грыпіны.
Анэта знаецца з другімі,
Яшчэ не ездзіў я да Рымы,
Не дабяруся да Настусі,
А Магдалены я баюся...
. . . . . .
Ды часта клікае Параска...
Вось вам прычыны, калі ласка.

КАХАННЕ І ЧАС

У студэнткі Галі
Неяк запыталі:
— Трэба праспрагаць
Дзеяслоў «кахаць».
— Ён цяпер кахае,—
Разважае тая.
— Будучы час як жа?
— Выйду замуж,—кажа.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...



— Пачакай, не разбурай, добрая архітэктурная знаходка!

— Што новага пабачыла на выстаўцы?
— Шмат знаёмых.

Тэхніка бяспекі.

З камфортам.

Мал. А. ЧУРКІНА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 07029

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Телефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Рыгор ШЫРМА.